# *Пры немцах (1941-1944)*

**Аўярчук Афанасій, Дубяжын:**

У 1942 годзе пачалася вярбоўка на работу ў Нямеччыну. Я тады на чыгунцы працаваў. У час набору немцы залатыя горы абяцалі: высокія зарплаты, штодзённа кіно ў час адпачынку ды іншыя сацыяльныя забеспячэнні. Ніхто, праўда, не верыў у гэту балбатню, але і не мог адмовіцца ад выезду.

Са мною на чыгунцы яшчэ трое дубяжынцаў працавалі. Мяне са Сцяпанам Томчукам першымі ўзялі ўзборны пункт у Бельску-Падляшскім. Было гэта 6 красавіка 1942 г.

З Бельска перавезлі нас цягніком у Беласток. Абстрыглі і ў лазню загналі, але вопратку нам не замянілі. Памытых і абстрыжаных у вагоны пагрузілі і адправілі ва Усходнюю Прусію.

Ехаў з намі Сцёпка з Казлоў, хлапец з суседняй вёскі, але не даехаў на месца, з цягніка выскачыў. Пасля ўцёткі ў Граеве ад немцаў хаваўся.

**Адамчук Міхал, Мацьковічы:**

У нядзелю, калі пачалася вайна, я быў дома. Склад, у якім я працаваў, пабілі, а збожжа, якое асталося, немец раздаў людзям. Пасля немец застаўляў мяне чыгунку вартаваць, шашы карчаваць. Трэба было здаваць малако. Свінню можна было закалоць, але толькі пад нямецкім наглядам і здаўшы да таго кантынгент.

Па лясах засталіся бальшавікі, яны застаўлялі мяне праводзіць іх праз чыгунку.

**Альховік Галена, Сакалда:**

Быў тут ляснічы Дзікоўскі, ён даглядаў, як рабілі грэблю. Яго цесці паехалі ўкасцёл, а жонка з дачкой у хаце асталася. Пабачыла, што ўіх стадоле поўна людзей, перапякалася. Як ляснічы вярнуўся, яна яму расказала і ён на Копную Гару пабег, немцам далажыў. Ён вярнуўся дахаты, а немцы зрабілі засаду. Ляснічы па-

чуў, што хтось ходзіць і выбег з хаты за стадолу да немцаў. А яны думалі, што гэта партызан бяжыць і застрэлілі яго. А тых партызанаў ужо ў стадоле не было.

Было гэта вясною, калі сена касілі. Таго ляснічага забілі ўвечары, а ўжо на другі дзень немцы аблаву ў вёсцы зрабілі. Мой брат рана ў Крамяным лонку скасіў, прыйшоў да хаты і кажа:

— Ну, канец! Скасіў і можна адпачываць.

І сеў махорку кроіць. І яго так, у кашулі, забралі. Пазганялі людзей на Копную Гару, загналі ў хлеў і пабіць хацелі. То тыя, што тут асталіся, назбіралі чаго і ў Супрасль да начальства паехалі. І ён загадаў выпусціць. А дзеці чакалі бацькоў у канцы вёскі і як бацькі вярнуліся, дык яны ім на шыі кідаліся.

Адзін немец ці хто, што немцам дровы загатаўляў, хацеў пераначаваць у аднаго гаспадара. Той гаспадар пайшоў на панадворак і нёс куль саломы падаслаць яму. У гаспадара было дзве дачкі і яны сталі бацьку прасіць, каб таму пану паслаць на ложку, а яны будуць спаць на той саломе, на падлозе. А бацька адказаў ім:

— Таму сабацы і так добра!

Той госць даклаў пра здарэнне немцам у Копную Гару. З Беластока прыехала гестапа і забіралі цэлыя сем'і паводле спіска. Мой брат быў калісь на сходзе на Копнай Гары, там выступіў і гаварыў, што пры Польшчы солі белай нельга было купіць, толькі чорную ў шматках. А быў такі гаёвы, што ўсё ўдаваў, хто з кім і што рабіў. І майго брата, брваціху і абоіх іх сыноў забралі. А за што забіралі, таго ніхто і не даведаўся.

Адна сям'я са спіска была на хрысцінах у Вярхлесе. Жонка з дзецьмі вярнулася вечарам у Сакалду, каб вокны пазакрываць, а муж астаўся начаваць на хрысцінах. І яе з дочкамі забралі...

У іншай сям'і гаспадыня падаіла кароў і ўжо сыноў адпраўляла гнаць іх на пашу. Але немцы іх завярнулі. Каб чуць-чуць, то тыя хлопцы кароў пагналі б...

Спыталі солтыса, што з гэтымі людзьмі рабіць, а ён хіба адказаў:

— Што хочаце, тое і рабіце.

І сам солтыс баяўся.

Пагналі ўсіх у Лазні, загналі ў адну хату. Там на панадворку яма для бульбы была, загадалі тую яму раскапаць. А пасля выводзілі з хаты, кідалі ў тую яму і стралялі.

Мы думалі, што іх куды вывезуць. Але сядзімо за стадолай і чуем: Бах! Бах! Б'юць!

Тую яму завалілі, але зямля варушылася, дык яшчэ дзевятнаццаць фур пяску навазілі.

Таму, што ў Вярхлесе на хрысцінах быў астаўся, неяк нядобра было зрабілася і ён пайшоў дахаты. Затрымалі яго каля Сакалды і пытаюць:

— Што з табою зрабіць?

— Тое, што і з маімі дзецьмі, — адказаў ён.

І яго адвялі пад Копную Гару і там забілі; сёння там крыж стаіць.

Назбіралі людзі хабару — палатна на касцюмы, і падаліся ў Супрасль да нямецкага начальніка, каб дазволіў пахаваць нябожчыкаў. 19 кастрычніка дазволілі іх забраць. Ноччу, хто якую труну збіў з дошак, забіралі пабітых у стадолу і ў такую труну клалі. Нябожчыкаў пазнавалі па вопратках. Мой брат быў у зялёным, ён аб сценку ямы абаперты быў, быццам стаяў. Побач яго, таксама стаялі, яго сыны, а за імі жонка. Да досвітку патаемна на могілкі ў Супрасль павазілі і там пахавалі кожную сям'ю на сваім месцы. Толькі пахавалі і адразу вярнуліся дадому, не было ніякай малітвы.

Той, што меў на саломе начаваць, гаварыў пасля:

— Jak dochodzę do tego domu i spojrzę, i wspomnę te dziewczynki, to płaczę...

* * *

У Лазнях, на сённяшнім панадворку Зінаіды Віткоўскай, у тым месцы, дзе была яма, у якой гестапаўцы пабілі навакольных сялян, стаіць абгароджаны праваслаўны крыж. На абочыне вуліцы ў Лазнях стаіць таксама вялікі праваслаўны крыж з мемарыяльнай таблічай у гонар 55 забітых бацькоў і дзяцей. 11 кастрычніка 1943 года расстраляна там пяць сем'яў з Лазняў, пяць сем'яў з Сакалды і адну сям'ю з Варонічаў. А за што — іх суседзі не ведаюць...

**Анацік Ян, Аўгустова:**

У маі 1944 года мы з бацькам яшчэ сеялі ярыну. Вярнуліся вечарам дамоў, а маці паказала нам павестку ад солтыса, што трэба ехаць на работу ў Германію. Дзве ночы яшчэ пераначаваў дома, а 9 мая 1944 года пайшоў у бельскі арбайтсамт. Там дзве ночы пераначаваў у бараку, стоячы, бо было вельмі цесна. Раніцамі выходзілі і немец правяраў прысутнасць — ці хто не ўцёк. Пералічвалі нас і зноў заганялі ў барак.

Раніцай 11 мая жандары павялі нас на чыгуначную станцыю: адзін жандар ішоў спераду, другі збоку, а трэці ззаду калоны. Пагрузілі нас у таварныя вагоны і праз Беласток павезлі ў Элк, дзе пасля чатырохгадзіннага перастою адправілі ў Голдап. Адтуль, пасля ночы, завезлі нас у Ангербург (Вэнгажэва).

**Андраюк Ян, Трасцянка:**

Як настаў немец, дык каменне вазілі пад Пяшчанікі, бункер будаваць. У сорак другім, у сенакос, пачалі немцы браць на работы. Бралі ў Міхалова, у амтскамісарыят, пашпарты мяняць. І як узялі туды, дык назад ужо не вярталіся: забіралі за драты і пасля некалькіх дзён — за драты ў Беласток. Адразу забралі майго брата, які жанаты быў і чацвёра дзяцей было ў яго.

Я пашпарта яшчэ не меў, то далі мне толькі картачку, што Weissruss. На Галавасек прыехалі ў Бялкі жандары з Міхалова. Я акурат канём бульбу выараў і на панадворку быў разам з бацькам. Паклікалі мяне і забралі; многа нас маладых узялі ў Міхалова. Пабылі там пару дзён і ў Беласток. А там нас агледзелі, выбралі здаравейшых і пяшком у Супрасль пагналі. Там, у маёнтку, была школа швейцараў; вучылі м.інш. кароў даіць. Жылі мы ў аборах, на нарах. Я напісаў дадому ліст і праз тыдзень бацька з Лук'янюком, суседам, прыехалі — торбачкі з баранінай нам прывезлі, але жандары не дазволілі нам сустрэцца. Пра іх прыезд паведаміў нас паліцай-паляк. Пасля мы дваіх і яшчэ адзін з Кухмоў, што каля Юшкавага Груда, дагаварыліся з тым паліцаем, каб нам гарэлкі прынёс. Ноччу, калі ўсё супакоілася, мы пайшлі ў нашу школу выпіць. Паліцай прынёс літр самагонкі. Закусвалі цыбуляй. Мы пілі мала, а паліцай — упіўся. І мы траіх уцяклі. Я дарогу ведаў, бо пры саветах там працаваў. Мінулі мы Жэдню і ў Саколі кухмавец аддзяліўся ад нас, а мы пайшлі ў Фальваркі; там мая сястра на калёніі жыла. Праз пару дзён яшчэ адзін з Бялок уцёк. Хаваліся мы цэлы месяц, у клуні начавалі; пра партызанку ніхто не думаў. Але даведаліся пра нас; праўдападобна адна баба, бо яе сына мы не выцягнулі...

На Пакрову раненька прыехалі два самаходы немцаў, абставілі сяло і жандары зараз у нашу хату. Пытаюць бацьку, дзе сын, а я адзываюся:

— Я тут, у хаце.

Прыйшоў немец, Гіс называўся, ён па-руску гаварыў, бо з Кубані быў, і давай распытваць мяне. І я яму ўсю праўду сказаў, а ён мне:

— Не бойся, ніц табе не будзе, бо ты быў дома.

Тады яшчэ больш людзей набралі і на фурманках, а нас траіх на самаходах між немцаў, павезлі. Сабака абнюхаў нас, але нічога, бо яму ніхто ніц не казаў. І ў той самы дзень у Беласток нас завезлі, а на другі дзень напхалі нас у быдлячыя вагоны. Частку вагонаў адчапілі ў Аленштайн (Ольштын), а нас у Кёнігсберг завезлі.

**Асіпюк Анна, Крывая:**

Калі прыйшлі немцы, у Крывой асталося многа рускіх палонных. Але людзі баяліся браць іх да работы, бо прадчувалі, што немцы вайны не выйграюць і калі рускія вернуцца, могуць быць клопаты. Людзі прасілі нямецкага агранома, каб прызначаў ім на працу арлянскіх яўрэяў. Багацейшым гаспадарам прызначалі на працу тых вяскоўцаў, якіх не забралі на прымусовыя работы ў Германію. Апрача таго людзі адраблялі шарварак будуючы дарогу ў Орлю; разбівалі нагробныя пліты з яўрэйскіх могілак і масцілі імі дарогу.

Яшчэ да вайны я пасвіла кароў. Ужо ў 6-7 гадоў усё рабіла, напрыклад, ездзіла вярхом на кані. Пад нямецкай акупацыяй я разам з сястрой працавала пры адбудове моста на Арлянцы, які былі спалілі партызаны. Мы перасявалі жвір, нешта падавалі рабочым. Працавалі мо з год. Рыдлёўкі дадому насілі. Я сваю клала на гарышча, каб у хаце было чыста, і так аднойчы ўпала з драбіны і выбіла сабе руку. Ад лячэння ў мясцовага кастаправа не было паправы і тата завёз мяне ў Орлю да лекара Смульскага. А ў працы мяне любілі і згадзіліся на тыднёвую бальнічную адсутнасць.

У вайну тата выкапаў за клуняй сховішча; там былі пярыны, падушкі і найпатрэбнейшыя рэчы. Заўсёды мы туды хаваліся ў час бамбёжак.

**Багацэвіч Галіна, Орля:**

Немцы пасялілі арлянскіх жыдоў у гета, якое абгарадзілі ад паловы рынку да Кашалёўскай вуліцы. Вызначылі г.зв. „Judenrat”. Немцы ўмела падбіралі ад жыдоў іхняе багацце, напрыклад, на вызначаны тэрмін загадвалі назбіраць нейкую колькасць золата, абяцаючы, што тады іх не вывезуць. І яўрэі збіралі тое золата, бо багатыя былі. Пры санацыі ў Орлі быў нават жыдоўскі банк — па тадышняй вуліцы 3 Мая (сёння 1 Мая) — насупраць парку. Па-за тэрыторыю гета яўрэяў не выпускалі, але некаторыя паціху выходзілі. І на практыцы шмат часу ўсе (немцы з жыдамі) добра з сабою жылі.

Усё гэта трывала да часу, аж наехалі жандары і сталі вывозіць. Яўрэі ведалі, што іх чакае, маглі недзе хавацца, але гаварылі, што яны саграшылі. І калі немцы затрубілі, то жыды пакінулі сваіх дзяцей і пайшлі чацвёркамі ў калону. Дзяцей немцы кідалі на грузавікі, старэйшых везлі жалезнымі вазамі. Мелі з сабою клункі, але пакуль праехалі некалькі кіламетраў да Парцава, усё павыкідалі. Пасля тыя торбы немцы пазбіралі ў жыдоўскую школу і разам з мэбляй і іншым яўрэйскім дабром распрадалі жыхарам навакольных вёсак.

У сінагозе немцы зрабілі рамонт, паклалі драўляную падлогу, і паказвалі фільмы або ставілі спектаклі. Пасля людзі расцягнулі адтуль усе дошкі.

Наш дом быў побач сінагогі. На яе даху немцы зрабілі назіральны пункт. Назіральнікам быў Франц — малады нямецкі салдат, якога называлі „пілотам”. Заходзіў часам да нас і пытаў, ці я яго баюся. І я баялася, бо гэта ж немец. Але ён гаварыў, што не немец ён, толькі аўстрыец. Я шмат разумела па-нямецку, бо гэтая мова была падобная да яўрэйскай.

18 мая 1943 года павезлі мяне на прымусовыя работы ў Германію. Бацькі вельмі плакалі, што забіраюць мяне. А той Франц зрабіў мне здымак каля бярозак побач нашай хаты, але не даслаў мне пасля ў Германію. Ён стараўся пацешыць мяне, прынёс мне свой здымак. На прымусовыя работы трапіла я ў вёску Сардынен у павеце Дойч-Эйлаў (Ілава).

**Бадавец Ян, Кляшчэлі:**

Пры немцах працаваў рабочым у лесе, а пасля будаваў казармы ў Мілейчычах. З таго часу захавалася ў маёй памяці небывалае здарэнне. Аднойчы вяртаўся я дамоў з працы. У той час праводзілася аблава на партызан у ваколіцы Мілейчыч. На дарозе нямецкі патруль праверыў мае дакументы і прапусціў. Калі я прайшоў некалькі метраў далей, пачуў быццам бы бзыканне асы каля вуха. Другое такое „бзыканне” пачулася каля валасоў. Наперадзе, з-пад лесу стралялі немцы. Толькі тады я ўцяміў, што страляюць па мне. Я ўпаў на зямлю. Убачыўшы гэта правяраючы мяне раней нямецкі патруль пачаў махаць рукамі да сваіх жаўнераў і тады яны спынілі стральбу.

**Баравік Аляксандр, Стары Корнін:**

Новыя гаспадары пачалі наводзіць свае парадкі з першага дня — гаспадарылі як хацелі. І ніхто нічога супраць іх сказаць не мог, бо за супраціўленне адказ быў адзін — расстрэл. І людзі баяліся, бо ж каму не шкада свайго жыцця.

Сялян абкладалі кантынгентамі, а маладых людзей сталі вывозіць на прымусовыя работы ў Германію. І я ў шаснаццаць гадоў, хаця яшчэ хлапчуком лічыўся і на год замалады быў, трапіў у спісак для вывазу, бо так пастараліся вясковыя памагатыя новай улады.

Вайна мяне не шкадавала: у першы яе год амаль мяне не расстралялі, а на другі ў Нямеччыну забралі. Так мая доля склалася, што давялося пакінуць родную вёску, бацькоўскую хату, бацькоў, сяброў і ехаць

невядома куды. І думкі неспакойныя трывожылі: Навошта гэта? Ці вярнуся? Што мяне між чужымі чакае? Але што было рабіць — трэба было падпарадкоўвацца. Чалавек рабіўся як жывёліна: кіравалі ім, папіхалі яго, білі. А ён маўчаў, адно сэрца шчымела і здавалася, што злосць яго разарве.

9 мая 1942 года маладыя людзі развітваліся з сем'ямі, плакалі і ад'язджалі. Зусім ашаломлены апынуўся я ў Бельску. Са зборнага пункта пад канвоем пагналі нас на чыгуначную станцыю. Усім аб'явілі, што за ўцёкі з поезда — смерць. Пагрузілі ў таварныя вагоны і павезлі ў невядомае. А ў галаву назойлівыя думкі дабіваюцца: цягнік, цягнік, куды ты нас валачэш? А поезд штораз больш аддаляўся ў чужыну.

Смялейшыя хлопцы рашаліся ўцякаць з вагонаў. Вартаўнікі сядзелі за лакаматывам і калі цягнік браў паварот і перад поезда хаваўся, тады хлопцы выскаквалі з вагона і ў ногі. Чуваць было выстралы, але цягнік мчаўся далей. І ніхто ў вагоне не ведаў, ці ўцёкі ўдаваліся.

Як доўга мы ехалі — не ведаю. Апынуліся мы ў горадзе Ангербург.

**Барысюк Наталля, Андрыянкі:**

Калі немцы напалі на саветаў, рана паявіліся самалёты. Камандзіры адправіліся ў часць і войска некуды ад'ехала і баёў каля нашай вёскі не было. Але людзі сталі хавацца, спярша ў жыта, а пасля капалі акопы за загуменнем. І адзін немец з горкі стаў страляць па вёсцы і многія хаты загарэліся, у тым ліку і хата швагра Ануфрыя. Успеў ён вырваць толькі вокны, каб пасля ў зямлянку ўставіць.

У швагра быў калега Нікан, баптыст, і ён прыняў нас. Швагер стаў прадаваць кароў, каб за іх купіць драўніну на хату. Паставіў зруб і адно адна карова асталася, не было за што канчаць. Да таго ж яшчэ швагра забралі перавозіць нейкіх бежанцаў, ён хацеў іх прагнаць з фуры, то немцы ад яго фуру з канём забралі і ён адно з бічом вярнуўся дахаты. Пасля двух гадоў выйшлі мы ад Нікана, бо ў яго цесна было і па хатах жылі. А Ануфры расхварэўся, іншыя людзі пасля вайны адбудаваліся, а яго хата да 1958 года з забітымі вокнамі стаяла, адно тады яе перацягнулі на сённяшняе месца, адзін знаёмы памог аформіць крэдыт і так хату выканчылі.

**Белаказовіч Надзея, Бельск-Падляшскі:**

Нарадзілася я 3 студзеня 1930 года ў вёсцы Целушкі. Калі пачалася вайна мне было 9 гадоў, аднак добра памятаю той час. Бацьку майго прызвалі ў 1941 годзе ў рускую армію, брата расстралялі немцы, а я асталася разам з маці і трыма малодшымі сёстрамі і старэйшай на 5

гадоў Нінай. Асталося нас шэсць жанчын на гаспадарцы. Цяжка нам было самім. Нейкі час да нас прыходзіў сусед — 73-гадовы Іван. Памагаў нам крышку. Добры быў чалавек. Гаварылі мы да яго часта: „Дзядзька Іван, прыйдзі да нас на вэчуркі. Пагаворыш, пасняваеш весела, раскажаш нешта цікавае. Прыходзь!” І прыходзіў да нас дзядзька Іван, расказваў байкі, спяваў. Але гэта не трывала доўга, бо неўзабаве ён памёр. Стала нам яшчэ цяжэй. Маці не мела сілы справіцца з гаспадаркай, пачало бракаваць ежы. Добра, што яшчэ агарод быў у добрым стане. Блізка хаты расла старая вішня, некалькі яблынь і дзве грушы. Мы іх таксама ўмелі выкарыстаць. Малодшым то раз нават жываты папухлі ад зялёных яблыкаў. Дык што было рабіць, як чалавек галодны?

Вайна мела на нашае жыццё трагічны ўплыў. Спачатку забрала мужчын з нашай сям’і. Не стала нікога, хто мог бы нас абараніць. Адна ваенная ноч поўнасцю змяніла маё жыццё. У канцы чэрвеня 1942 года ў нашу вёску зайшоў атрад немцаў. Пачаткова паводзілі яны сябе нармальна, не чапляліся да нікога. Але на трэцюю ноч захацелася ім гуляць. Загадалі яны гаспадарам прынесці гарэлкі і закусі ды сагнаць усіх жанчын перад солтысаву хату. Што ж мелі рабіць мужчыны? Выконвалі нямецкі загад. У тым часе кожны думаў толькі, каб перажыць. У 9 гадзін вечара прыйшлі і па нас. Маці благала на каленях, каб аставіць малодшых у хаце. Мужчыны не згадзіліся: як усе то ўсе! І пагналі нас. Перад солтысавай хатай стаяла ўжо каля 30 жанчын у розным узросце — ад 5-гадовых дзяўчынак па 70-гадовыя бабулькі.

Жандар загадаў нам выстраіцца ў шарэнгу. Затым найвышэйшы рангам афіцэр, ужо добра падхмелены, стаў выбіраць найпрыгажэйшыя дзеўкі. На няшчасце, трапіў на нашу Нінку. Пацягнуў яе за руку і крыкнуў голасна: „Тая напэўна схоча пагуляць” і, схіліўшыся, пацалаваў яе моцна. Сястра крыкнула і адарвалася ад яго. Не памагло. Афіцэр ударыў яе па твары так моцна, што аж палілася кроў. Маці ў той момант не вытрымала, скочыла да немца і стала прасіць яго на каленях, каб замест дачкі ўзяў яе. Але і гэта не памагло. Жандар загадаў усім разысціся. Асталася толькі маці з намі. Плач маці толькі раз’юшыў афіцэра. Па яго загадзе двух маладых жандараў пацягнулі з сабой маму. Дык што нам было рабіць? Пабегла і я з сёстрамі за імі і гэта была памылка. Немцы звязалі матку і пачалася трагічная ноч. На маіх вачах згвалтавалі сястру. Да канца жыцця запамятала я яе вочы і крык у тую хвіліну.

У гэтую ноч немцы забілі маці і сястру. Асталіся мы самі на свеце — я разам з трыма малодшымі сястрамі. Ніхто не хацеў нам памагчы, прыняць да сябе дахаты.

Калі вестка аб смерці маці дайшла да сваяка з Бельска, прыехаў ён па нас у Целушкі. Было гэта тыдзень пасля выпадку.

Дзядзька Кузьма не хацеў і хіба не меў магчымасцей трымаць нас чатырох ў хаце. То ж, у яго былі і свае дзеці. І так параздаваў нас па людзях. Аня трапіла ў Гайнаўку, Каця — у Дубічы-Царкоўныя, а Вера — у Беласток. Не бачыла я іх да канца вайны. Доўга не маглі мы знайсці супольную мову. Не ведалі мы што рабіць. У Целушкі не было сэнсу вяртацца. Бацька згінуў у 1944 годзе, хату і гаспадарку занялі суседзі. Так і засталіся мы са сваімі новымі сем'ямі. Міналі гады, а мы спатыкаліся рэдка. А і пры спатканні мала было тэм для размоў. Успаміналі мы толькі пасляваенныя гады. Аб трагічнай ночы 1942 года мы не гаварылі — замоцна балелі ўспаміны.

**Белая Люба, Беласток:**

Немцы вывозілі дзяўчат у Германію, а хлопцы ўцякалі да партызанаў. Аднойчы тыя хлопцы, сярод якіх быў і мой брат, рашылі здацца немцам; мой брат пра здачу нічога не ведаў і стаў уцякаць. Немцы стралялі па ім, але жывым астаўся. Хлопцы, што здаліся, тлумачыліся, што партызаны іх прымусілі ісці ў лес. Пецярых іх забралі і вывезлі ў Германію; пасля вайны ўсе яны, апрача аднаго, вярнуліся. А мой брат да канца вайны партызаніў.

Мне, каб не вывезлі ў Германію, солтыс сказаў стаць на працу ў лес. Там нашым загадчыкам быў мужчына з Папоўкі. Аднойчы ён сумна сказаў нам, што можа ён ужо апошні раз з намі. І так было.

Зімою 1943 года партызаны ўзарвалі каля Дзернякова поезд, на якім ехала на ўсход каля паўтысячы нямецкіх сапёраў, з якіх каля двухсот тады загінула. Немцы хацелі паліквідаваць навакольныя вёскі, але прыехаў нейкі важны нямецкі спецыяліст і сказаў, што тут вяскоўцы ні пры чым, бо гэта работа высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Восенню 1943 года на станцыі ў Валілах стаяў нямецкі транспарт. Той транспарт меў збамбіць савецкі самалёт, а наводзіць яго мелі партызаны. І так атрымалася, што замістаго транспарту самалёт збамбіў балота каля Дзернякова, на якім тады жанчыны разаслалі лён; мабыць лётчык думаў, што гэта эшалон. Дзве бомбы ўпалі і на нашу стадолу, якая занялася гарэць, але тата хутка залез на яе з вядром вады і загасіў.

Калі рускія гналі немца, немцы ў нашай вёсцы на пяць дзён спыніліся. Загадалі нашым вяскоўцам сабрацца ў школу, але нехта бачыў, як

тую школу падмінавалі. І амаль усе ў лес паўцякалі; і я з канём, а мама з каровамі. У лесе прасядзелі амаль два тыдні; баёў у нас не было. Пасля рускія сапёры размінавалі школу.

**Берасцюк Антон, Шашылы:**

На прымусовыя работы ў Германію спачатку вывозілі назначаных людзей; калі хто не хацеў ехаць, забіралі цэлую сям'ю. Тры разы ехалі назначаныя, а ў чацвёрты раз, як на мабілізацыю, бралі народжаных у вызначаны год.

Маіх равеснікаў было чатырох. Усіх нас солтыс на фурманцы ў Бельск завёз. Было гэта 10 красавіка 1943 года, як пасадзілі бульбу. У Бельску патрымалі два дні і на трэці павезлі.

**Бішчук Марыя, Кузава:**

Дзевятнаццаты год паступіў мне, як у Нямеччыну мяне забралі. Па сваёй волі я паехала, бо бацьку пашкадавала, які пры немцах солтысам быў і з жандарамі хацеў справу ўладзіць. „Мсціць будуць, — кажу, — пальцамі тыкаць стануць. Лепш для вас будзе як паеду". Было гэта ў красавіку 1943 года.

Жылі мы ў Вакастаўцы. Зборны пункт назначылі ў Вярховічах. Выязджала мы з Вольгай Цыванюк, Вольгай Маеўскай, Марыяй Крот і Міхалам Казачуком. За намі прыслалі фуру, завезлі ў школу. Процьму народу сагналі. З Вярховічаў у Высокае да цягніка перавезлі. Памясцілі ў таварныя вагоны. Як праз Чаромху ехалі, дык сваякі нас праводзілі. Выгрузіліся ў Бельску-Падляшскім. У ратушы праз тры дні пад стражай трымалі. Мяне і Олю Цыванюк Шурка Баравой на начлег забіраў. Бацька яму работу ў немцаў аформіў. Адвячоркам за намі прыходзіў, а раніцай праводзіў назад. Шурка ажаніўся з Марусяй, дзяўчынай з Вакастаўца. Хведар Сідарук сватам быў на вяселлі.

Баравыя жылі ў драўляным доміку над рэчкай. Кватэра іхняя на паддашку знаходзілася. Як ратуш пакідалі, дык на вакзал праводзілі. У цягніку Марыю Вілюк, Янку Смолюка і Мікалая (прозвішча не запамятала) з Палічнай сустрэла. Завезлі ў Кёнігсберг.

**Васілеўская Стэфанія, Грабяні-Калёнія:**

Як прыйшоў немец, то ніякага закону не было. Банды, свае, хадзілі па пяць разоў у ноч; пабяруць кіі і ідуць. Нямецкі камісар у Новым Двары быў, але яго не чапалі, баяліся. Адзін немец у лесе падліну трымаў, на лісоў, а праходзілі тудою хлопцы і выстралілі, дык на другі дзень двух з іх у Германію забралі.

На выбаз у Германію солтыс вызначаў і з кім ён гарэлку піў, таго крыў, а мяне без гадоў вызначыў. Я была ў Сякерку да сястры пайшла, а на другі дзень бацька па мяне прыехаў, каб у Новы Двор ставіцца; было гэта ў красавіку 1942 года. У Новым Двары цэлы тыдзень была — цэглы ад жыдоўскага храма падбірала. Мама мне есці прыносіла, а адной сіраце дык і сарочку пашыла. Калі назбіралі транспарт, тады нас на самаходзе ў Гродна завезлі. У Гродне пабылі два дні, выкупалі нас у лазні, загрузілі ў быдлячы эшалон і адправілі ў Германію.

Мяне завезлі за Элк, у Ангерап, на вясковую гаспадарку; там прабыла я два гады.

**Война Ніна, Орля:**

Было гэта ў ліпені 1941 года. Наша спакойная і ціхая вёска Масева была распаложана ў сярэдзіне Белавежскай пушчы. Раптам у летні ранак вёску акружылі немцы. Было гэта на золаку і ўзняўся страшны крык пераляканых дзяцей і мацярэй; гэты плач я чую праз усё сваё жыццё. Немцы загадалі ўмомант пакінуць свае сядзібы. Былі падстаўлены грузавікі і фуры з навакольных вёсак і ўсе мусілі на працягу дзвюх гадзін пакінуць свае хаты. Мацярэй з дзецьмі грузілі на самаходы, а мужчын на фуры. Узяць з сабою дазвалялася адно нямнога вопраткі і крыху харчоў. Нельга было забіраць ніякуткіх прыладаў — за гэта пагражала смерць.

Усіх павезлі ў мястэчка Поразава; наш абоз цягнуўся мо з тры дні. А ўвесь пакінуты намі дабытак немцы праўдападобна вывезлі ў Рэйх. У Поразаве нашу сям'ю Цясноўскіх: бацькоў Рыгора і Вольгу і чацвёра дзяцей: Любу — яна была найстарэйшай, ёй было дванаццаць гадоў — Марусю, Ніну і Веру (і яшчэ якіхсьці людзей) пасялілі да нейкіх старэчаў і якісь час мы так жылі. Нельга было пад смяротнай пагрозай вяртацца на сваю радзіму; тады немцы Масева падпалілі і зраўналі з зямлёй. З Поразава было відаць, як гарыць наша вёска, бо зарыва таго пажару займала, здавалася, цэлае неба.

Пасля сталі нас вывозіць з Поразава ў Рэйх. Мне было тады сем гадоў, і заміж пайсці ў школу, нашу сям'ю павезлі ва Усходнюю Прусію, у Лэндэнгіз. Сем'і развозілі па розных мясцовасцях, каб не мелі з сабой сувязі.

**Грыгарук Якуб, Дубічы-Царкоўныя:**

Калі настала нямецкая акупацыя, многія нашы людзі балюча гэта перажывалі, бо ад сэрца верылі ў камунізм і бачылі, што рабілася на-

вокал. Я палітыкай не вельмі цікавіўся, аднак заўважыў, што саветы многім нашым людзям далі працу ў лесе або на чыгунцы, а дзецям адкрыліся бясплатныя школы.

У пачатку сакавіка 1942 года мяне і яшчэ аднаго жыхара Дубіч-Царкоўных Міцьку Хіліманюка прызвалі ў Бельск-Падляшскі, а там такіх ужо была процьма, і загналі ўсіх у нейкі хлеўчык недалёка чыгуначнай станцыі і замкнулі на замок. Паставілі вартаўніка з вінтоўкай, якога праз дзве гадзіны мяняў наступны, пералічваючы, ці ўсе палонныя прысутныя. У хлеўчыку было каля сарака асоб, усе беларусы з непадалёкіх вёсак: Карышчіскі, Старога Корніна, Крывятыч, Мора... Быў між імі і стары мой знаёмы Барыс Варона, які пры саветах падвучыўся нямецкай мове. Ён карыстаўся даверам у нямецкіх вартаўнікоў, якія давалі яму маркі, каб купіў ім у горадзе папяросы, запалкі ці што іншае. З гэтай прычыны іншыя палонныя глядзелі на яго падазрона, быццам на шпіка.

Сярод палонных быў Піліп Раеўскі з Крывой, чалавек жанаты, у якога было трое маленькіх дзяцей; усе апошнія палонныя былі халасцякамі. І вось ён як заразы баяўся вывазкі ў Нямеччыну і меркаваў, як уцячы дамоў; я яму дапамог. Усе згаварыліся, што ноччу Барыс Варона пастукае ў дзверы, каб патруль выпусціў у нужнік патрабуючых; за нужнікам быў плот з металічнай сеткі, а за плотам агарод... Вартаўнік выпускаў па адной асобе, але тады, калі Барыс пастукаў у дзверы і вартаўнік прыадкрыў іх, убачыў, што мо з дваццаць асоб трымаюцца за кліны, а Варона сказаў яму, каб іх пусціў больш, бо відаць пахварэлі. Вартаўнік выпусціў людзей, тыя рабілі што трэба, а ў той час я адхіліў знізу сетку і Піліп Раеўскі шмыгнуў і цераз агарод уцёк. Вартаўнік нічога не заўважыў, хаця меў электрычны ліхтарык, бо стаяла цёмная, хоць вока выкалі, ноч. Усе апошнія вярнуліся ў хлеўчык і вартаўнік зноў замкнуў яго. Але неўзабаве мела быць змена вартаўніка з пералікам палонных, а аднаго ж не хапае. І тут я прыдумаў, як выйсці з гэтых абставін. Сярод палонных быў адзін малады і невысокі хлопец і я сказаў яму:

— Калі немец будзе пералічваць нас, дык ты, калі пяройдзеш ад аднай сцяны да другой, зараз незаўважна вярніся назад і калі немец прачытае прозвішча таго, што ўцёк, дык адклікніся і зноў перайдзі і будзе выглядаць, што ніхто не ўцёк.

Так і сталася. А раніцай, што гэта было 12 сакавіка 1942 года, усіх заключаных выгналі на двор, выстраілі ў шарэнгі і пагналі на станцыю. Там выйшаў да іх сам камісар у суправаджэнні двух жандараў і сам стаў пералічваць групу; ну і выявілася, што аднаго не стае. Пад-

няўся шум, сталі пры ўсіх дапытваць вартаўнікоў і таму, каторы найбольш баяўся і дрыжаў, жандар выхапіў вінтоўку, зняў пояс і пад канвоем недзе яго пагналі.

А на станцыі з рэпрадуктараў кіраваліся да зняволеных павучэнні на рускай мове:

— Не бойтесь ехать на работу в Германию, там вы увидите другой свет, какой вам даже не снился. Это не то, что на востоке, где люди голодные и нагие... Только не думайте бежать, бо наши автоматы метко стреляют...

Групу ўжо чакаў поезд з пасажырскімі вагонамі; рушыў ён на поўнач, у невядомае. У маім вагоне сядзелі яшчэ Міцька Хіліманюк і Васька Марчук з Дубіч-Царкоўных, Кірылка з Карыціск ды іншыя знаёмыя хлопцы з навакольных вёсак. Не даязджаючы да моста на Нарве некаторыя пасажыры выскачылі з вагона ўцякаць, але я рашыў зрабіць гэта не спяшаючы, за Беластокам. І добра падумаў, бо тых ранніх уцекачоў хутка злавілі. У Беластоку немцы падлічылі, што не хапае некалькіх чалавек, патэлефанавалі ва ўсе камісарыяты, з каторых былі ўцекачы, іх палавілі і адправілі ў такія месцы, адкуль ніхто ўжо не вярнуўся.

За Беластокам, не даязджаючы да Кнышына, у тым месцы, дзе пуць паднімаўся пад горку і поезд збавіў скорасць, я развітаўся з Мішкам і Васькам, якія сталі плакаць і ўгаворваць мяне каб не ўцякаў, даў ім свой хлеб ды выскачыў у адкос. Апынуўся ў поўнум снегу рове і калі ўстаў на ногі, убачыў побач сябе Кірылку. Абтрасліся мы, узаемна сабе дапамагаючы, са снегу. Чыгункай нельга было ісці, бо такі быў нямецкі загад. Сталі мы дабірацца да недалёкай шашы. Калі былі блізка дарогі, убачылі на ёй двух немцаў з аўтаматамі і біноклямі, якія вялі ровары, бо ехаць на іх было там зацяжка. Я шапнуў Кірылку, каб той рабіў тое, што і я, і мы сталі ўзаемна качацца і абкідацца снегам. Толькі тады немцы заўважылі нас, паглядзелі як на дзівакоў, а мінаваўшы ўзгорак селі на веласіпеды і паехалі. Я сказаў таварышу, каб ісці следам за імі і паглядзець, што далей будзе. Немцы пасля 300-400 метраў спыніліся, паглядзелі ў біноклі назад і пабачыўшы, што дзівакі ідуць за імі, паехалі на веласіпедах далей. Калі яны зніклі за лініяй гарызонта, мы з таварышам завярнуліся і накіраваліся ў бок Беластока.

Сонца ўжо хілілася да заходу, нідзе не было відаць ні жывой душы, ні хаты, але мы ішлі наперад. Аж бачым, насупраць ідзе немец са здаравенным сабакам; мы яму нізка пакланіліся і бяда асталася ззаду. Неўзабаве ўбачылі невялікую вёску і направіліся туды. Спыніліся каля крайняй хаткі і нясмела пастукалі ў дзверы; калі пачулі дазвол, увайш-

лі. У кухні маладая жанчына калыхала дзіця ў падвешанай на вяроўцы калысцы; мы спыталі яе, ці можна прысесці і адпачыць і яна ветліва дазволіла. Неўзабаве ў хату зайшоў гаспадар і пацікавіўся, адкуль мы і куды ідзем. Мы не ведалі што адказаць і гаспадар здагадаўся ў чым справа. Сказаў жонцы накарміць нас і прыгатовіць чыстую пасцель. Скора на стале з’явіўся хлеб і вялікі кавалак саланіны, але мы адмовіліся есці ў хаце і начаваць без дазволу солтыса, каб не наводзіць небяспекі на гаспадароў. Аднак зараз, як па заказе, з’явіўся ў хату солтыс, прыводзячы на начлег яшчэ некалькіх уцекачоў з таго самага поезда; госці прыкінуліся, што не знаюцца. Солтыс паклікаў гаспадара на нейкі вясковы сход, а я ў той час голасна сказаў:

— Jak by tam nie byio, ale Polska powstanie nawet z popioiu!

Гэтыя словы вельмі спадабаліся і гаспадару, і солтысу і яны нават пачалі дзякаваць.

Раніцай, пераначаваўшы і добра паеўшы, мы з Кірылкам шчыра падзякавалі польскай сям’і за гасціннасць і добрае сэрца ды пайшлі сваёй дарогай. Праз Беласток ішлі асобна, каб не кідацца ў вочы патрулям. За Беластокам, пад сам вечар на гарызонце паказалася вёска і мы зайшлі ў крайнюю мураваную хату, аднак нас адтуль пагналі. Солтыс таксама варожа паставіўся да нас і завёў у тую ж мураванку. Гаспадар тады сказаў нам:

— Вось дзверы і парог, гэта ваша пасцель і яда.

І злосны пайшоў у свой пакой. Мы галодныя праседзелі там ноч, раніцай забралі ад солтыса свае дакументы (бо ён іх узяў нанач) і пайшлі далей. Без прыгод мінулі Бельск і 17 сакавіка апынуліся каля вёскі Карыціскі, дзе развіталіся. Я асцярог Кірылку, каб той не начаваў дома, толькі хаваўся ў чужых людзей або далейшых сваякоў. Кірылка не паслухаў добрай рады і скора ў роднай хаце насцігілі яго жандары і пагналі кудысь з сабою, адкуль Кірыла Мясяюк ніколі ўжо не вярнуўся...

Вечарам 17 сакавіка я не пайшоў у Дубічы, дзе на нашым панадворку засталіся адно папялішчы пасля пажару вёскі, але накіраваўся ў Грабавец, да дзядзькі Івана Леанюка, куды перабралася мая сям’я. Пастукаў у дзверы, адчыніла мама і ўбачыўшы сына амаль не абамлела:

— Гэта ты, сыночак? Навошта ты вярнуўся, а мо ўцёк? Тут табе месца няма, бо заўтра або паслязаўтра будуць цябе шукаць немцы і калі знойдуць, заб’юць. А сёння ўдзень пахавалі мы твайго бацьку Івана... І ты адзін у мяне астаўся, і яшчэ дзве сястры твае, Палашка і Верка.

— Дарагая мама, — адказаў я. — Я тут, у дзядзькі Івана жыць, на сваю пагібель, не думаю. Зараз іду да сваіх сваякоў у Саках, дваюрадных братоў Ваські і Піліпа; яны дадуць мне прыстанішча.

Развітаўся я з маці і пайшоў у Сакі. Калі ўвайшоў у хваіну, пачуў, і пабачыў у святле месяца, як у снезе каля дарогі забаўляюцца два велізарныя ваўкі. Я чым хутчэй залез на бліжэйшую хвойку. Але ваўкі не цікавіліся чалавекам, толькі пабрыкаўшы яшчэ ў снезе пабеглі на грабавецкія палеткі ў бок вёскі Рутка. Я злез з дрэва і ўжо без большых прыгод завітаў да сваіх сваякоў, а яны ахвотна згадзіліся мяне прыхаваць. Пасля маіх уцёкаў нямецкія жандары начыста абшукалі Дубічы, а пасля і ў Грабаўцы шукалі. Пыталі і маці, дзе сын, а яна адказвала:

— Вы яго забралі, дык і шукайце, бо я нічога не ведаю.

Неўзабаве ў Прусію, узамен за мяне, пагналі маю сястру Палашку, там яна была да канца вайны і вярнулася дадому. Праз нейкі час усё прыціхла і я мог ужо жыць у Грабаўцы, бо жыхары вёскі любілі мяне.

Ранняй вясною 1943 года я рашыў наведаць родныя Дубічы-Царкоўныя. У канцы Грабаўца, каля Млыноў, убачыў я чалавека, які быццам нёс дзіця на руках. Зраўняўшыся з ім пазнаў, што гэта Барыс Варона з вялікай перавязкай на руцэ. Завязалася гутарка. Калі я ўцёк з поезда, Барыс паехаў далей, у Прусію. Там служыў аднаму баўэру і падчас абмалоту ўпускаў ён снапы ў барабан шырокамалоткі. І здарылася няшчасце, бо ягоную руку ўцягнула ў барабан і адарвала далоню. Гаспадар даў яму два тыдні водпуску, каб наведаў сям’ю. Пасля Варона паехаў да гаспадара і зноў неўзабаве прыехаў у водпуск. І больш не паехаў у Прусію. Скора немцы яго арыштавалі і ў полі каля Крывятыч расстралялі.

Пасля вайны я з сям’ёю вярнуўся ў Дубічы.

**Грыгарук Ян, Трасцянка:**

А як немец прыйшоў, то ўсіх жыдоў у Беласток, у гета пагналі. Я аднойчы паехаў з кумам у Беласток і там аднаго яго знаёмага жыда, доктара спаткалі. І ён кажа: — Вазьмі маю дачку да сябе, не пашкадуеш, усё жыццё будзеш помніць. Вярнуліся мы з тым кумам і яго ў Нарву чагосьці пазвалі. Ён паехаў з маім сынам да млына, сын у млыне астаўся, а ён у гміну пайшоў, а там яго і іншых, дваццаць ці сорак — добра ўжо не помню — немцы на падворку акружылі, загналі ў самаходы, завезлі ў дзевятнаццаты квартал у Лядскую пушчу і пабілі, бо ён кімся пры саветах быў. І з нашай вёскі адну жанчыну забілі, швагерку маю; жыла ў тым будынку, што цяпер пошта, прадсядацелем у Агародніках была. Многа іх папісалі, што дэпутатамі былі. На Ілью

гэта, помню, было. Пабілі іх і засыпалі. То ездзілі мы два разы ў Бельск, каб пазволілі забраць іх адтуль і пахаваць. Але дазволу не давалі. То людзі кажуць: „Давайце самі”. То мы там іх раскопвалі рукамі, забралі і пахавалі. А таго войта, што гэтых людзей выдаў, прызнаў, значыць, камуністамі, то самыя немцы расстралялі, нетутэйшы ён быў. А адзін быў з Паўлаў, то ён уцёк — кінуўся ў лес і ўдалося. Жонка яго таксама з намі адкопваць нябожчыкаў паехала, і ў крык: „Ой, майго няма!” То мы ёй кажам: „Не плачце, заедзеце дадому і скажаце, што так пабіты, што і касцей не знайшла”. А ён ужо дома! То мы тады сталі свае: яны нас клікалі на Пакрову, а мы іх на Прачысту, пасваяліся. Да яго ўжо потым не чапляліся — хапіла тую гадзіну перажыць, каб яны ад’ехалі.

**Грэсь Вера, Пяшчанікі:**

Знаеце, як гэта было пры немцах — што бачыў, то і не бачыў. Мы з партызанамі не былі звязаны, хаця ў партызанку хадзілі нашы вяскоўцы — яны найбольш там дзялоў рабілі. А так то людзі баяліся. Знаеце, там быў правакатар, і некалькі пяшчаніцкіх хат згарэла — тых, што каля Папоўкі кароў пасвілі. Тады, як вывозілі Папоўку, усім пяшчаніцкім, што мелі коней, раніцай загадалі ехаць. Майго мужа дзядзькі там жылі. Дзядзькава дачка просіць, каб коц даць, дзяцей прыкрыць, бо рана холадна было. Але хто там той плед да яе дапусціў... Бо людзі ўжо былі пагружаны на фуры, а нашы паехалі толькі рэчы забіраць — везці да амтскамісара ў Гарадок, які пасля ўсё распрадаваў. Мой муж свае авечкі, што каля Папоўкі пасвіліся, хацеў адкупіць, але на яго выскачыў: Ага, то ты дабытак аддаў бандытам на мяса! А вёску спалілі ўдзень на нашага Яна.

**Дамброўская Вольга, Ціванюкі:**

Калі немцы на Маскву ішлі, то людзі беглі глядзець, якія немцы. І дзевер пайшоў паглядзець. Абстрыжаны быў і яго немцы забралі і за Адрынкі завялі. Каля Марынкі паставілі і хацелі расстраляць; яго і яшчэ аднаго. Рашылі ўцякаць. То таго другога, Назарку, адразу забілі, а дзевер, хаця паранілі, уцёк. Пасля ён дзень і ноч у кустах хаваўся. Дзеці кароў пасвілі, ён іх папрасіў і бацькі прыйшлі і дапамаглі. Але яго пасля немец зноў забраў і ўжо не вярнуўся. У вайну, у 1942 годзе нас на работу ў Германію вызначылі; муж паехаў, а я цяжарная асталася. Тата казаў мне: „Оля, не едзь, бо дзіця згубіш і будзе скітацца”. І муж гаварыў: „Я адзін паеду, то можа ўцяку”. Але ён у Гданьск, у карны лагер трапіў і загінуў.

**Дымянюк Ігар, Бельск-Падляшскі:**

Калі пачалася вайна мне было 9 гадоў. Пачаткова жылі мы нармальна, але прыйшоў час, калі мусілі з Плёсак уцякаць. Пагрузілі найважнейшыя рэчы на воз, зачынілі хату і паехалі. Апрача нас было яшчэ 5 сем'яў, якія таксама пастанавілі ўцячы. Ехалі мы з вёскі ў вёску, далей і далей, аж апынуліся ў сям'і ў Агародніках.

Прынялі яны нас ласкава. Дзядзька Іван нават радаваўся нашаму прыезду.

Пабылі мы ў іх паўгода. Бацька з дзядзькам ездзілі ў поле, а мы, маладыя, памагалі пры хаце. Я то свіней пасвіў, памагаў крыху ў агародзе. Прыйшлося, аднак, нам зноў уцякаць. Куды? У наступную вёску — у Галады. Нядобры быў гэты выбар. Пасля двух тыдняў пачалася бамбардзіроўка. Усе сталі ўцякаць, кіруючыся на Белавежу.

Памятаю добра як гэта ўсё выглядала. Нібы было гэта ўчора. Выразна бачу, як падаюць людзі на дарозе, чую іх крык, плач. Асколак трапіў у бацьку. Згінуў ён на месцы. На той успамін слёзы зноў мне плывуць. Не спамятаю, колькі разоў сніўся мне ён, калі паміраў. Асталіся мы круглымі сіротамі. Аднак мачыха не пакінула нас. Каця, бо так яна называлася, апекавалася намі далей. Разам з жыхарамі Галадоў капалі мы сховішчы. Нават і я памагаў. Былі яны ў зямлі, накшталт воўчай або лісінай норы. Не было ў іх многа месца. Капалі мы іх недалёка лесу, а некаторыя людзі гаварылі, што напэўна не будзем імі карыстацца. Памыліліся! Пасля месяца, а можа і трох тыдняў — не памятаю добра — зноў пачаліся налёты.

Каця схапіла нас на рукі і разам з гаспадаром, у якога мы затрымаліся, пабеглі мы ў акопы. Каця хавала нас. Калі бомбы пачалі падаць недалёка ад нас, прыкрыла Любу і Міхала сваім целам.

Потым прыйшлі рускія. Раз крычалі на нас, іншым разам размаўлялі нармальна і сухары ў руку давалі. Але карову забралі. Настаў цяжкі для нас час. Часта не было і чаго ў рот пакласці. Але і тое мы перамаглі.

**Ефімюк Яўген, Кляшчэлі:**

Не было мне яшчэ чатырнаццаці гадоў, калі атрымаў скіраванне ў арбайтсамт. Я ўцёк з дому. Некалькі дзён хаваўся ў дзядзькі ў Чаромсе, у яго многа дзяцей было. Маці не ведала, дзе мяне шукаць, але ў камісара залатвіла, што я ўжо свабодны, бо да чатырнаццаці гадоў не бралі.

Ідзе аднойчы да дзядзькі аграном... Я думаў, што па мяне. І ў акно, і ходу ў лес! У лесе спаткаў Мікалая Каравая, якога Колькам называлі. Ён загадаў мне ісці ў Кляшчэлі да Аляксея Вінаходава, савецкага грамадзяніна, які тут астаўся, і вучыцца ў яго на шаўца. Ён прыняў мяне; зімою чобаты рабіў, а летам кароў пасвіў. У лесе спатыкаў савецкіх уцекачоў з палону — часам адзін быў, часам траіх, — і паведамляў пра іх Вінаходаву, а той Мішку Пракапчуку з Паграбоў. Гаварыў уцекачам: „Ідзі ў лес, на Пухава”. Там балота было і паляна, а на паляне „Модзянкова загарадзь” — выспа з пяском, а кругом балота. Але ў палове 1943 года атрымаў я загад, каб ні з кім не гаварыць, толькі дакладваць, дзе хто знаходзіцца, бо была бойка ўкраінцаў і ўласаўцаў, якія пераапраналіся партызанамі.

У тым часе пазнаёміўся я з Дзмітрыем Макаравым, загадчыкам партызанскага руху ў Камянецкім, Кляшчэлеўскім і Сямятыцкім раёнах. Ён быў энкавэдзістам, але ў вайну пра гэта ніхто не ведаў. Пасля вызвалення ён 3-4 тыдні быў камендантам горада Кляшчэлі і ўсіх партызан высылаў на фронт, а мяне, маладога, паставіў у млын наглядаць, каб салдаты не кралі і не прадавалі мукі; пасля Макараў выехаў у Маскву. Аднак мяне менш цікавіла вага, а больш лакамабіль, які прыводзіў у рух і млын, і тартак. Некалькі месяцаў працаваў я там памочнікам механіка, а потым механікам, без курсаў. Працавалі мы па 24 гадзіны ў суткі: у нядзелю ставалі і ў нядзелю сходзілі. Драмаў і чуў, як машына ходзіць. А тады „свабода” была і людзі дрэва з лесу везлі, каб прапілаваць. Прывозілі гарэлку, закуску — абы рабіць. І сто працэнтаў плацілі, калі „па гадзінах”, вечарам...

**Жак Ян, Каўпакі:**

А тут узяў і прылучыўся да савецкай партызанкі, памагаў ім; нават з баранавіцкай шашы зброю ім давозіў у Гарымоўскі лес. Дзесяць аўтаматаў вёз праз Міхалова, прыкінуўся, што драмлю. Немцы на вуліцы стаяць, трох драбаў. Пабачылі мяне, гумай па плечах „разбудзілі”, але ў воз не заглядалі. Знайшліся, аднак, такія людзі, што далажылі немцам, што наша фамілія мае дачыненне з партызанкаю, то як немцы прыехалі 22 верасня 1942 года, то мяне і швагроў маіх чатырох забралі ў Міхалова на пастарунак. Там нас дапытвалі: паставілі табурэтку пасярэдзіне пакоя і нас б’юць гумамі, каб штось расказалі: дзе партызаны, дзе што. Білі да непрытомнасці, пасля выкідалі на калідор і бралі наступнага. Калі наканец дайшла мая чарга, паступіла паведамленне, што каля Майдана партызаны заатакавалі немцаў, удзень. І тыя нашы каты сядаюць на маторы і едуць з дапамогай сваім. Астаўся толькі

адзін немец, тлумач, што пратаколы пісаў. Паклікаў мяне і кажа: „Я біць не бэндэ, муў праўдэ". А ён быў такі, што падказваў нават, што гаварыць, каб на карысць было, добры нямчура быў. І пытаецца, ці я з партызанкаю знаўся. Я адказваю, што я рольнік і нікога з партызан не ведаю. Усё гэта помста суседзяў: пасварыліся са мною і заўдалі мяне. І той немец добры, лёгкі пратакол мне напісаў. Ну і з тым пратаколам вывезлі нас у беластоцкую турму. Па дарозе яшчэ дапытвалі ў гестапа на Сянкевіча. Паставіў пад плотам і аўтамат да плячэй прылажыў. А я кажу: „То бі". — „Веле маш кіндэр?"— „Драй".— „А я маю цвай". І апусціў дула. У турму забралі таксама жонку з малымі дзецьмі; дома асталіся толькі бацька і маці. У турме прабыў я сем месяцаў, да красавіка сорак трэцяга. За той час многіх выклікалі на расстрэл, у тым ліку і маіх чатырох швагроў — 16 сакавіка. 24 красавіка нас, каля 500 чалавек, вывозяць поездам у канцлагер Штутгаф каля Гданьска. На браме быў надпіс „Лагер смерці". Нашы папярэднікі, якіх прывезлі раней, выглядалі як трупы, чорныя, худыя. Я праз год так аслаб, што ўжо ў шпіталь трапіў, дзеля выканчэння. Мне і тут паспрыяла шчасце — лекарам быў таксама вязень, знаёмы майго бацькі. І ён скіраваў мяне на кухню, на якой працаваў я цэлую зіму. Пасля назганялі столькі вязняў, што замала месца было і трэба было лагер разбудоўваць, выразаць сасновы лес, што рос побач. Як доўгая, дваццаціметровая хвойка, зганялі людзей, каб выцягнуць яе на дарогу, бо коньмі нельга было ўехаць. Пакуль адну хвойку выцягнуць, то немец заб'е двух-трох, бо людзі не могуць падняць, калі кожнага чалавека самога трэба падтрымоўваць. Дасць калком па галаве раз-другі і хопіць. Я прарабіў так амаль год; са мною на нарах у тым бараку быў адзін паляк, з Гдыні, Мэдан Антоні называўся, магістр. Бацька яго быў немцам, а маці полькай. Немцы запатрабавалі ад яго, каб нямецкае падданства прыняў. А ён не, бо паляк; за тое яго і ў лагер забралі. Ён размяркоўваў на працу і скіраваў мяне ў абутковую майстэрню, у будынак, дзе я прабыў аж да эвакуацыі. Яму жонка два разы ў тыдзень прысылала з Гдыні ежу, лагернай ён не еў, а аддаваў мне, так мяне падтрымоўваў. 24 студзеня немцы загадалі эвакуацыю — хто можа, а хто не можа, можа астацца. Мы ўсе здаравейшыя пайшлі. Немец ганяў нас па дарогах, нанач замыкаў у стадолах. Здымаем адзенне і часць кладзем пад сябе на снег, а другою часцю накрываемся; усе голыя так спалі. 10 сакавіка занялі нас саветы, каля Лембарка. Саветы загадалі нам вяртацца галоўнай дарогай, бо, казалі, як сыдзем убок, то могуць нас расстраляць. Сталін тады даў салдатам два тыдні свабоды: што хочаце, тое рабіце. То саветы, за здзекі, забівалі тых немцаў, што

асталіся; да якога дому не зойдзеш, то ўжо трупы ляжаць. Удалося мне дастацца на поезд, і з перасадкамі дабраўся я гэтым транспартам у Беласток.

Вярнуўся я ў Каўпакі ў канцы красавіка, а тут немец усё спаліў; няма ні вопраткі, ні ежы; палова вёскі жыла ў маёнтку ў Малынцы. Жонку з дзяцьмі немец выпусціў толькі ў 1944 годзе.

**Зданоўскі Янка, Варшава:**

Бацька мой, Даніла, з вёскі Альхоўка 1895 года нараджэння, як толькі закончыў вучыцца ў Свіслацкай настаўніцкай семінарыі, то ў той жа год пачалася І сусветная вайна. У час вайны не мог ён працаваць настаўнікам, а ў міжваенны перыяд санацыйныя ўлады не кеміліся трымаць беларусаў на ўрадавых пасадах.

Як у верасні 1939 года на землях Беласточчыны ўсталявалася савецкая ўлада і заіснавала магчымасць працаўладкавацца, стаў ён працаваць настаўнікам у сваёй вёсцы, а таксама дадаткова яшчэ ў адной з суседніх вёсак. Навука праводзілася па праграме тагачаснай няпоўнай сярэдняй школы, якая мела многа вышэйшы ўзровень, чым у тагачасных санацыйных пачатковых школах, асабліва па так званых сціслых прадметах.

У чэрвені 1941 года гітлераўцы пачалі вайну з Савецкім Саюзам. Бацька так мне расказваў пра сваю першую сустрэчу з нямецкімі акупантамі. Якраз гэта быў канец школьнага года і першы дзень канікулаў і працаваў ён басанож у агародзе каля школы. Ад Нараўкі над'ехала аўтамашына з нямецкімі салдатамі і затрымалася каля школы. Камандзір штосьці спытаўся па-нямецку ў бацькі, а ён адказаў яму на іхняй мове. Камандзір адразу змяніў голас на больш ветлівы. Пачалася размова. Немцы пыталіся адкуль ён ведае іх мову і пра многа другіх спраў. Пасля кароткай пагаворкі пахвалілі яны бацьку за нямецкую мову і паехалі далей у вёску. Мінула некалькі гадзін і вярнуліся ўжо ў зусім іншым настроі. З крыкамі „Камуніст, камуніст!" арыштавалі бацьку і павезлі з сабою ў суседнюю вёску. Аказалася, што прыродныя дваюрадныя браты бацькі, з якімі ён судзіўся каб вярнуць сваю бацькаўшчыну, угасцілі немцаў, добра напаілі і сказалі ім, што ён камуніст (бацька сапраўды даўней быў членам Грамады і КПЗБ).

Аднак многа людзей з Альхоўкі як толькі даведаліся, што бацьку арыштавалі, прыбеглі яго ратаваць. Яны пераконвалі камандзіра (ён меў перакладчыка), што бацька толькі вучыў іх дзяцей і не з'яўляецца ён ніякім камуністам. Бацька тады на нямецкай мове папрасіў, каб яму прачыталі тэкст прыгавору і дазволілі пайсці абуцца і змяніць вопрат-

ку, каб з годнасцю прыняць смерць. Невядома што памагло: ці абарона аднавяскоўцаў, ці пазіцыя бацькі, ці можа нямецкі камандзір рашыў не пазбывацца адукаванага чалавека ў падкантрольнай яму гміне, які валодае нямецкай мовай. Сказаў ён: „Ідзі”, а цішэй дадаў: „Ніхт цурык”. Такім спосабам бацька астаўся ў жывых.

Цераз некалькі дзён акупанты, праводзячы ў вёсцы кантроль, заўважылі ў хаце радыё і зноў паставілі бацьку пад сценкай. Чарговы раз выратавалі аднавяскоўцы з перакладчыкам, пераконваючы жандараў у тым , што настаўнік не ведаў аб загадзе канфіскаты радыёпрыёмнікаў, а солтыс не ўсім пераказаў гэты загад.

У ліпені прыйшоў загад высяліць прыпушчанскія вёскі. Як і ўсе сяляне, так і бацька з мамай, забраўшы дазволеную акупантамі маёмасць, выехалі з вёскі. Пасяліліся ў Боўтрыках, якія не былі пацыфікаваны, дзе жыў бацькаў брат, а таксама маміны бацькі з братамі і сястрою.

Людзям, якія пакінулі сваю мясцовасць, нельга было пад ніякай прычынай прыехаць назад. Таму бацька выслаў свайго цесця, каб той паехаў у Альхоўку і забраў кніжкі са школьнай бібліятэкі, якія былі ўпакаваныя ў мяшкі. Мой дзед, прыехаўшы ў школу, вырашыў, што мяшкі важнейшыя ад кніжак, кніжкі павысыпаў і з пустымі мяшкамі вярнуўся ў Боўтрыкі.

Аднойчы зімовым марозным ранкам нямецкія карнікі акружылі вёску, разбудзілі і павыганялі ўсіх мужчын і хлопцаў-падросткаў на двор. Затым пачалі строіць усіх у паўкруг. Няўжо будуць страляць нас з настаўленых у воддалі кулямётаў, падумаў бацька і энергічна падняў руку. Заўважыў гэта іх камандзір і спытаў чаго ён хоча.

— Мы хочам ведаць у чым мы абвінавачаны і за што хочаце нас расстраляць, прачыгайце нам судовы прыгавор.

— Вы абвінавачаны ў тым, што памагаеце мясцовай шайцы бандытаў (партызанам), корміце іх і хаваеце.

— Ніякіх бандытаў мы не ўкрываем, — рашуча адказаў бацька.

У той жа момант з вёскі прыбегла яшчэ некалькі карнікаў і адзін з іх штосці далажыў камандзіру. „Запытай усіх ці будуць нам памагаць у ачыстцы мясцовых абшараў ад бандаў” (партызанаў), — загадаў ён бацьку. Усе ў адзін голас закрычалі: „будзем!, будзем!” „Што яны крычаць?” „Прысягнулі што будуць”, — адказаў бацька. Тады камандзір даў знаць рукою і карнікі знялі кулямёты. „Мне лепей сто нявінных людзей апраўдаць, чым аднаго вінаватага расстраляць”, — сказаў ён бацьку і дабавіў: „Вы ўсе вольныя”.

Аказалася, што карнікі не знайшлі нікога са зброяй у руках у час вобыску ў вёсцы (яны нават прапаролі штыкамі гной у стайні, але пар-

тызаны схаваліся пад жолабам, дзе гной падходзіў аж пад сам жолаб, а туды ім штыкоў не ўдалося ўвапхнуць). У такіх абставінах бацьку ў трэці раз удалося пазбегчы смерці. Цяжкія тры гады выгнання без уласнай зямлі і ўласнага даху над галавою маёй маме і бацьку ўдалося перажыць дзякуючы таму, што мой бацька апрача настаўнічання ўмеў будаваць хаты і гаспадарчыя будынкі, зрабіць вокны і дзверы, стол і ложак, паладзіць печы, а перад усім пашыць і наладзіць мужчынскія і жаночыя боты. Калі ад усходу набліжаўся фронт у чэрвені 1944 года і гітлераўцы ўцякалі, то бацькі рашылі вяртацца ў Альхоўку. Часць сваёй скромнай маёмасці пагрузілі яны на фурманку і адправілі з дзядзькам дарогай цераз лес, а самі з клункамі на плячах пайшлі адкрытымі дарогамі. Пераходзячы каля вёскі Лука сустрэлі немцаў, якія капалі абарончыя равы, але яны ўжо былі моцна заняты сваімі клопатамі і не звярталі на перасяленцаў увагі ды дазволілі спакойна перайсці цераз мост і далей ісці сваёй дарогай. Як бацькі прыйшлі ў родную вёску, то на былых панадворках угледзелі крапіву вышэй платоў. Жыццё трэба было пачынаць ад нуля. Бацька скалаціў з жэрдак рыштаванне, накасіў травы і пабудаваў цалкам выгадны шалаш. Затым з дапамогай мамінага брата, а майго дзядзькі Івана, які тады меў 18 гадоў, пачаў будаваць невялікую хатку (размерам цяперашняй аднапакаёвай кватэры). Толькі ўдваіх секлі сосны, звозілі драўніну на панадворак, трачавалі і мантавалі зруб, пасля дах. За рабочую цяглавую сілу замест каня служыў вол. Мама за цэлы гэты час клапацілася аб прадуктах харчавання, каб пракарміць сваіх работнікаў ды яшчэ прызапасіць харчоў на зімовыя дні. Наскольні лета і восень 1944 года былі пагодлівыя і цёплыя і доўга не было прымаразкаў, то па раказе мамы, на праваслаўныя Каляды перабраліся з шалаша ў новую ўласную хату. Так начыналася новае жыццё ў першыя пасляваенныя гады. Хаця жылося вельмі скромна, а працавалася вельмі, вельмі цяжка, то мама ўспамінала гэты перыяд як вельмі шчаслівы. Ніхто і ніколі пазней не быў такім шчырым, ветлівым, ахвотным памагаць і вясёлым як аднавяскоўцы ў гады пасляваеннай адбудовы .

Не ўсе вярнуліся з вайны ў родную вёску. Многія сталі ахвярамі гітлераўцаў, якім памагалі аднавяскоўцы — здраднікі, даносчыкі. Тром маладым хлопцам, сярод якіх быў бацька двух маленькіх хлопчыкаў, жыццё абарвалася ў няроўным баі з немцамі ў гаёўцы ў 26 квартале Белавежскай пушчы. Заманіў іх туды ляснік аднавясковец Пеця, які выслужваўся акупантам. Запрасіў ён іх да сябе з нагоды нараджэння дачкі. Майго бацьку ён таксама запрашаў, але бацька адмовіў, паколькі не былі яны ніколі ў сяброўскіх адносінах і яму гэта здалося вельмі

падазроным. Бацька забараніў таксама хлопцам ісці на хрысціны ў гаёўку ўглыб пушчы гаворачы, што могуць адтуль ужо не вярнуцца, але яны яго не паслухалі. Яўгена Галабурду, 18-гадовага адважнага партызана, выдаў немцам аднавясковец, які служыў паліцаем. Мой бацька ва ўсіх гэтых справах стараўся даходзіць справядлівасці пры народнай уладзе, але народная ўлада не кемілася яе даходзіць. Быць можа таму, што многія хітруны, якія раней выслугоўваліся акупантам, запісаліся на службу новай уладзе, а сярод іх быў блізкі кроўны Пеці лесніка, які служыў у міліцыі ў Беластоку. З цягам часу многа такіх нягоднікаў адышло на пенсіі з ветэранскімі дадаткамі, адзін другому пасведчваючы аб тым, як гэта яны „памагалі" партызанам. Ім верылі, а не сялянам, якія ведалі праўду, бо былі яны бліжэй новага карыта.

**Зінчук Аляксандр, Бацюты:**

Трапіў да нас адзін немец, які тут у першую сусветную вайну ваяваў; тады да іх добра адносіліся і ён гаварыў нам:

— Бацюты гут!

Немцы гміну ў Турасні-Касцельнай зрабілі. Некалькі чалавек у Прусію выслалі; адзін уцёк, то ўсю сям'ю забралі.

Адзін рускі салдат астаўся і ў нас сядзеў. Не хацеў нічога рабіць, то мы яго адправілі. Адыходзячы ён сказаў брату:

— Сукін сын, я табе пакажу!

Пайшоў ён у банду і яго ў Касцюках людзі злавілі і аддалі немцам. Немцы прывялі яго да нас на ланцугу і пытаюць:

— Хто цябе карміў?

Ён паказаў на нас. Тады маму і старэйшага брата забралі ў Беласток у турму. І я ўжо быў апрануты, але ў дзверах пакінулі. Маму з братам трымалі ў турме некалькі месяцаў, а я ім пачкі фурманкай вазіў — у браме падам і ўсё. Мелі выпусціць: тых, якія ў Лапах сядзелі — выпусцілі, а тых што ў Беластоку — у Грабаўцы расстралялі.

Я астаўся з меншым братам. Пасля яго стрыйка ў Канцавізну забраў; тата быў з Канцавізны, а ў Бацютах у прымах быў. Брат гадаваўся ў бабулі, пакуль тая жыла. Пасля вайны, калі банда спаліла Канцавізну, брат вярнуўся ў Бацюты.

Астаўся я сам, трымаў трое коней, пяць кароў і пятнаццаць свіней. Памагаў мне дваюрадны брат.

Аднойчы па вёсцы хадзіў ляснічы, пабачыў у мяне сырую драўніну і ўдаў; апрача мяне папалася яшчэ шэсць чалавек — кожнаму з нас далі па тры месяцы карнага лагера. Як мяне забралі, то суседзі парасцягалі ўсё наша дабро.

Абоз у Старасельцах быў, у бараках, абгароджаных двума радамі дроту. Працавалі па 10-12 гадзін у суткі. Зрывалі старыя пуці і паднімалі насып на паўтара метра. Кармілі супам з гнілой бульбы і мусіў есці. Некаторым з хаты прысылалі ежу і мне дваюрадныя браты раз у тыдзень прывозілі. На вартоўні правяралі пасылку і калі замнога было, тады адбіралі і давалі тым, што не даставалі пасылак.

Калі канчаліся тры месяцы майго тэрміну, падышоў фронт і нас адправілі ў Прусію: завезлі ў Біскупец, а там гаспадары паразбіралі нас.

**Зялінскі Ян, Беласток:**

Яшчэ перад вайной з Чаромхі перасяліліся мы ў Бельск, да матчыных сваякоў. Там мы з сястрой вучыліся і з гэтага часу маю найлепшыя ўспаміны. У цёткі Надзі было нам добра. Заўсёды было што з'есці, маці мела для нас цёплае адзенне на зіму. Год да выбуху вайны атрымаў я начную работу — быў памочнікам стоража. На цукеркі хапала, бо ж мне тады 13 гадоў было.

Пачаткова ўсё было добра, аднак, калі немцы пачалі займаць Бельск, маці вырашыла пераехаць у Кленікі да сваёй сяброўкі. Тая прыняла нас холадна.

Вайна — не час на спатканні, на неспадзяваныя і доўгія візіты. Каці таксама было цяжка. Жыла разам са старымі бацькамі, а на яе плечы зваліліся яшчэ тры асобы. Аднак людзі ў той час былі зычлівымі, патрапілі памагчы, не так як цяпер.

Немцы загадалі, што з кожнай сям'і мусіць ісці на работу адзін чалавек. Патрэбна ім была жанчына да работы на пастарунку. Выпала на маці.

Не бачылі мы яе каля месяца. Што ж, жанчына была прыгожая і немцы выкарысталі сваю перавагу. Калі аказалася, што зацяжарыла, не вытрымала. Павесілася. Каця знайшла яе ў стадоле. Сталі мы з Марфай сіротамі. Каця прыгарнула нас.

Калі пачало бракаваць ежы, стала невыносна. Дайшло да таго, што елі мы варанае лупінне, а нават суп з крапівы.

Сітуацыя змянілася, калі надышла Чырвоная Армія. Людзі сталі крышку спакайнейшыя.

**Іванюк Уладзімір, Канюкі:**

Другая сусветная вайна — час гора і страху, час нянавісці. Жыццё людзей — дзіўнае, напоўненае працай, страхам за наступны дзень і надзеяй на лепшы лёс. Нямецкая акупацыя Беласточчыны запісалася трагічнымі падзеямі. Адна з іх датычыла маладых хлопцаў, якія не ха-

целі пайсці на прымусовыя работы ў Германію. Дзеля таго яны прыдумалі стаць плытагонамі. Сплыў драўніны з Белавежы, пры якім яны мелі памагаць, меў быць шырмай для нармальнага жыцця. Будучы ў сябе, на сваёй зямлі, яны мелі працаваць для немцаў. 20-гадовыя хлопцы добра выпаўнялі свае абавязкі. Цяжкая праца ад світанку да змяркання не забіла ў іх радасці жыцця. Яны часта гаварылі і смяяліся, прыгаворваючы: „Хочаш жыць, мусіш рабіць!” За работай хлопцаў два разы ў тыдзень назіралі нямецкія жандары. Аднойчы прыйшлі яны раней чым заўсёды. Дрэва і хлопцаў яшчэ не было.

— Дзе яны? Як доўга трэба на іх яшчэ чакаць? — спыталі немцы солтыса.

Той у „жартах” адказаў, што можа ў банду пайшлі. Гэтага хапіла. Ніхто не спытаў потым хлопцаў, чаму прыплылі пазней, ніхто не даведаўся, што вінаватыя нямецкія жандары з Белавежы, якія прытрымалі дрэва... Ніхто...

У две гадзіны ночы немцы шчыльна акружылі вёску. Хлопцаў арыштавалі і адправілі ў камендатуру ў Рыбалах, укінулі ў склеп у будынку праваслаўнай плябаніі. Не давалі ім ні есці, ні піць. Хацелі голадам замарыць? Можа гэта ім удалося б, каб не чалавек, які працаваў у немцаў. Ён некалькі разоў у дзень хадзіў каля хлопцаў і кідаў ім яблыкі.

Мінула некалькі дзён. Прыйшоў дакумент з беластоцкага „бэцырку”, які загадваў неадкладна перавезці „партызан” у турму на Святаянскай вуліцы ў Беластоку. Адтуль ніколі ніхто не выходзіў. Пекла на зямлі.

Ніхто не злічыць колькі разоў бацькі хлопцаў хадзілі пехатою ў Белавежу і Беласток, колькі разоў ім адмаўлялі дапамогі. Аднак яны не здаваліся і абаранілі сваіх хлопцаў. Смяротны прыгавор немцы замянілі на два гады лагера ў Кентшыне.

Два цяжкія гады прайшлі і хлопцы выйшлі на свабоду, але не ўсе — адзін не вярнуўся.

**Казбярук Мікалай, Старыя Кухмы:**

19 ліпеня 1942 года я ажаніўся. А 21 ліпеня, зараз пасля вяселля, па мяне прыехалі і арыштавалі. І цэлы тыдзень каталі, каб прызнаўся, што партызанам гарэлку і мяса даваў.

Пайшоў у лес сталым рабочым працаваць, каб у Германію не вывезлі. Доўга не разжыўся. У кастрычніку 1942 года хтось падаў, што я з партызанамі справы маю. Рана снедаю, а тут мо з дзесяць шуцманаў нашу хату ачапілі. Вобыск зрабілі, абтраслі ўсё, нават мышыныя норы. У суседаву фуру мяне пасадзілі, кругом шуцманы абселі і ў Па-

дазяраны павезлі, дзе шуцманы стаялі. І допыты: у адну морду, у другую — Прызнавайся!

— Я нічога з імі не маю, — кажу, — у лесе працую.

Далі ў шкуру, узялі ў Падазяранах фуру і ў Гарадок павезлі. Завезлі ў гета, яно абгароджана ўжо дротам было, і ў жыды кінулі. Адну ноч пераначаваў і жонка з бацькамі за мною прыехалі. Пайшлі да нямецкага шуцмана, што на кватэры ў сваякоў жыў, ляснічы мяне падтрымаў, і мяне звольнілі.

Астаўся я ўжо ў Гарадку, цырульнікам стаў, у жыдоўскай хаце, калі іх вывезлі, стрыг. А ў той хаце, як і пачысцілі, то поўна пацукоў і клапоў было.

8 студзеня 1943 года арыштавалі майго бацьку, яго брата Васіля з дачкой Лідай і зяцем Федзем Вярбіцкім, родам з Масева, другога бацькавага брата Яна і суседа Уладыслава Казберука з дваццацігадовым сынам Сяргеем. Пасадзілі ўсіх у Міхалова, там арышт быў.

І мяне ў Гарадку арыштавалі, трэці ўжо раз. Сама на абед ішоў, паклікалі на паліцыю, усё забралі і кажуць, што арыштаваны. Пытаю за што.

— Там штось з партызанкай, — адказалі. — Твае свае сядзяць ужо.

Ноч у Гарадку праседзеў, прыехаў паліцай з Міхалова і мяне да маіх санкамі павезлі.

Першага Федзю ўзялі — збілі данішчэнту. Пасля Васіля — таксама дашчэнту зламаткавалі. Мяне трэцяга бяруць. Дапытваюць — як трэці раз, то не лічымся. А я віны ніякай не адчуваю. Уратавала мяне тое, што вахмайстар і два паліцаі стрыгліся ў мяне ў той час, калі было ўдана, што я з партызанамі гарэлку піў. І не білі мяне, пальцам не кранулі. Вахман сказаў:

— Маеш шчасце, што добрых сведкаў маеш.

А іх усіх 28 красавіка ў Гданьск вывезлі. Там сядзеў мой швагер Ян Трахімчык з Гарадка і два браты Карпюкі са Страшава; мы ім пачкі пасылалі. Адзін Карпюк адтуль уцёк — ножык у хлеб яму запеклі і даслалі. А другога брата катавалі, але выжыў.

Бацька і дзядзькі не выжылі. Ліда загінула на мосце ад бомбы, калі ўжо з Германіі дадому вярталася. Выжыў толькі Федзя, які пасля ў Сяміноўцы жыў. І як нашых вывезлі, то ўсё тут, у Кухмах, зліквідавалі. Хаты разабралі. Кабылу жаробную забралі, дзве каровы, чацвёра свіней, тры тоны збожжа, куры, косы — усё! І жыві з чаго хочаш...

У 1943 годзе, як згарэў Гарадок, нас выкурылі з кватэры і мы ў Зарэчаны перабраліся. Цешча сказала, каб з немцамі не жылі, бо пазабіваюць нас. Больш немцы да мяне не чапляліся.

**Казлоўскі Антон, Калодна:**

Бадай у нядзелю, у канцы ліпеня, у Каралёвы Мост заехалі два грузавікі „BMW”. Як выйшлі з іх немцы, то аж дух забіла! Бо не такія яны, як саветы: мундзіры feldgrau, пагоны іншыя, фуражкі з нямецкім арлом, боты з шырокімі халявамі і паясы са спражкамі з надпісам „Gott mit uns”.

Двух байцоў рашыла ў палон здацца; выйшлі з рукамі ўверх. Немцы іх абмацалі і пасадзілі на балотнікі — пазней мо дзе іх іскінулі — і паехалі.

Пасля з’явіўся намеснік каменданта, ён па-руску гаварыў. Паклікалі даваеннага солтыса Калодна, Дзянісіка. Спыталі, калі быў солтысам.

— У 1936-39 гадах, — адказаў ён.

— Гэта пры Польшчы, а нам савецкі солтыс патрэбны.

Выступіў мой бацька, хаця пры саветах солтысам не быў, толькі дэпутатам.

— Хотите служить нам? — спытаў немец.

— Калі трэба, то так.

— Лошадь имеете?

— Нет, забрали.

— А велосипедом владеете?

— Владею, но не имею.

— Хорошо, мы вам дадим.

Загадаў бацьку прыйсці раніцай. Далі яму веласіпед з прывязанай да рамы сумкай і загадалі ў воласць у Гарадок завезці. Далі пропуск; важны быў яшчэ савецкі пашпарт. Шашою гналі калону палонных, бацька злез з веласіпеда і прапусціў. Ехалі таксама адзінокія самаходы. „Віліс” абагнаў бацьку і спыніўся:

— Halt!

Бацька стаў. Праверылі сумку — Geheim, сакрэтная справа. Агледзелі дакладна пропуск і пашпарт.

— Езжайте! — сказалі.

Назад бацьку далі зноў сумку, і зноў правяралі пакуль прывёз.

Праз нейкі час склікалі сход солтыса выбіраць. Паставілі дзве кандыдатуры: Дзянісіка, які быў солтысам пры санацыі, і майго бацькі, які лічыўся савецкім солтысам. Бацька атрымаў крыху больш галасоў, але ён адмаўляўся і прасіў, каб солтысам згадзіўся быць Дзянісік. Дзянісік згадзіўся і так бацька пазбыўся таго акупацыйнага цяжару.

Яшчэ ў жніўні палонных гналі. Жанчыны, што ў царкву ішлі, хлеб ім кідалі; немцы не баранілі даваць хлеб, толькі забаранялі падыхо-

дзіць да палонных. Многія з іх у лес за Плоскай уцякалі і пасля ў Калодна траплялі. Прасілі есці, пераапрануцца, але адкуль столькі адзення ўзяць. Некалькіх трымалася да зімы, а зімою ўсіх палавілі. Пыталі, хто іх карміў, а яны паказалі тыя дзве сям'і, што ім адмаўлялі пачастунку. Аднае сям'і не было, а тую другую недзе забралі і яна прапала. Бо калі б палонныя паказалі, што карміла амаль уся вёска, дык мо вёску спалілі б ці што.

У снежні 1941 года людзі даведаліся, што немцаў ад Масквы адкінулі. І стала вядома, што вайна зацягнецца.

Выходзілі нямецкія газеты на польскай, рускай і беларускай мовах: „Новая дарога", „Новое слово", „Nowe czasy"; можна было купляць і чытаць.

У некаторых вёсках людзі ўдавалі, былі расстрэлы; у Радуліне, Пяшчаніках, Дзерняковe. Але ў Калодне такога не было. Толькі ў 1942 годзе восенню арыштавалі двух і ў Міхалова завезлі. Але выпусцілі, бо мог чалавек служыць у саветаў, абы толькі не быў членам кампартыі. Ды і людзі разумелі, што не толькі немцы, але і партызаны могуць пастраляць.

Пасля сталі вяскоўцаў браць на вартаванне чыгункі. Тыя, на якіх адрэзку поезд ўзарваўся, уцякалі ў лес, бо за такую правіну лічы, што не жывеш.

З 1942 года заходзілі ў вёску партызаны. Мусова было адчыніць, але і яны ведалі, што па добрай волі не дамо.

У 1942 годзе памянялі нам дакументы, у Гарадку — савецкія забіралі, а давалі нямецкія аўсвайсы і Kennkarte. Апошнюю, мабыць, давалі тым, што ў фабрыках працавалі.

У 1943 годзе па хатах у нашай вёсцы размясціўся атрад Schutzpolizei. Адзін летам удаў траіх уцекачоў — іх немцы зараз палажылі ў Разаліне і загадалі закапаць і мохам прыкрыць. Аднойчы людзі стаялі на вуліцы, убачылі пецярых уцекачоў. Падсолтыс немцам удаў. Уцекачы ў каноплі схаваліся і мо асталіся б у жывых, але зарана выйшлі. Іх злавілі, ноч патрымалі ў падвале і на досвітку расстралялі.

Пасля стаў вермахт, але ніхто не ўдаваў, нікога не злавілі і на зіму яны ад'ехалі.

У 1944 годзе знялі цывільную варту з чыгункі і паставілі войска. Нешта вісела ў паветры. У маі пачулі мы гул самалётаў — гэта быў першы савецкі налёт на Беласток. Па наваколлі скідалі парашутыстаў; прадчуваліся новыя падзеі ды і людзі нешта між радкамі ў газетах вычытвалі. Шашою сталі ехаць на захад нямецкія калоны. 18 ліпеня фронт на Свіслачы спыніўся. Пад вечар у Калодна наехала поўна

„BMW”. Немцы далі нам сякеры, каб замаскіраваць іх ад рускіх самалётаў; мы лазы нарубалі і накрылі самаходы.

У нас, у вялікай хаце немцы расклалі карту, а ў кухні кухар пёк яечню. Мама яму ўслугоўвала, а мы сядзелі. Кухар заспяваў „Кацюшу”, з’явіўся лейтэнант.

— Kinder, Kinder! — сказаў кухару.

І кухар нам напёк яечні. Мы паелі і паснулі пры стале. А немцы ноччу ад’ехалі.

**Кананчук Вера, Трасцянка:**

Як прыйшоў немец, то кепска да людзей адносіўся. Пастарунак нямецкі ў нашай вёсцы быў. Аднаго разу загадалі немцы, каб усе людзі пад царквой сабраліся. Ну то ўсе ідуць. А немцы акружылі сяло, каб знішчыць, бо прыходзілі сюды партызаны. Па начах прыходзілі, а дзеці баяліся, бо бацька памёр. То адзін з іх кажа: „Не бойтесь девушки, мы вас трогать не будем”. І хадзілі яны па хаце, штось з сундука ўзялі. Сын у мяне быў, дванаццаць гадоў меў, як бацька памёр, яго чобаты ў кухні стаялі. То адзін з іх за тыя чобаты. А сын просіць-просіць: „Я — сірата, у мяне атца нет” — каб не бралі. І ўжо адзін узяў. А другі кажа: „Ах, брось”. І не ўзялі. А тады, як немцы ўсіх акружылі, то солтыс за нас паручыўся сваёю галавою. І так нас аставілі. А як немцы толькі прыйшлі, то тут адну бабу расстралялі, што прадсядацелем пры саветах была, чацвёра дзяцей асталося. У ваською̆скім барку — тады многа расстралялі: з Сацоў два. А пасля агледзеліся, што, значыць, няслушна; то тады таго войта расстралялі. А колькі людзей там загінула — казалі, зямля варушылася як пазакідалі. А адзін там быў, і думае: усё роўна смерць, ці так, ці так. І як даў у лес! І ўцёк. Пасля то яшчэ ў нас аднаго партызана забілі. На Даліне, зайшоў да аднаго да клуні. А той гаспадар зайшоў па сена ці чаго, і злякаўся таго партызана. І зайшоў да суседкі і кажа, што партызан у клуні. А тая суседка зналася з немцамі, бо яе брат быў нямецкім паліцыянтам. І яна пабегла на пастарунак, і тады тыя немцы прыехалі і акружылі тую клуню, але ніяк не далі рады яго забіць. І тады адзін паліцыянт, наш, свой чалавек, толькі быў нямецкім паліцыянтам, падлез пад тую клуню і падпаліў. Клуня пачала гарэць і той партызан выбег з клуні, і страляючы, пабег у шопачку. І тады яго забілі. А мой сын ехаў акурат з поля і яму ў воз яго ўкінулі і завезлі ў ямкі ў лясок і там закапалі. Нетутэйшы быў.

Вывозілі таксама нашых людзей у Германію, многа вывезлі. Адну то з двойкай дзяцей і з трэцім у калысцы забралі. Ранілі яе там у нагу, а муж на вайне загінуў. Як яна была ў шпіталі, адна свая кабета забра-

ла яе дзяцей і прывезла дадому. А потым і сама маці прыехала, вярнулася.

І немцы розныя былі. Адзін тут быў такі высокі, файны мужчына; трыццаць ран меў, але яны пазажываліся. То, бывала, Насця, дачка мая, зойдзе на пастарунак, то ён яе за ручку браў, папраўляў хустку, каб прыгажэй выглядала, і вёў пачаставаць; даваў мяса, суп, такую добрую фасалёўку, і пагладзіў — відаць і ў яго такія дзеці былі.

**Кандратовіч Сяргей, Вялікія Азяраны:**

Як немцы наступалі, то перастрэлка была, але вялікіх баёў не было. Траіх рускіх салдатаў выскачылі з карабінамі з жыта, то іх немцы пабілі.

Пры немцах былі партызаны, тутэйшыя, з суседніх вёсак — яны ўсё забіралі ад нас, бо наша вёска багатая была. Нямецкі камісар быў у Бераставіцы, а жандары ў Галынцы. Немцы накладалі налогі, забіралі гусей. Калолі тайком. І малоць немец абмяжоўваў, але млынары добрыя былі і больш малолі. У Галынцы быў вадзяны млын. Быў паравы млын у Крынках, але туды мы не вазілі. І каля Белагорцаў жыд млын меў, які пасля Карпінскі купіў і калі апошні памёр, тады ўсё раскідалася і млын прапаў.

Немцы вярэдныя былі. Шапку трэба было перад імі знімаць, а і то здзекаваліся. Адзін чалавек у млын у Галынку ехаў, шапку перад немцамі зняў, прывітаўся. А калі вяртаўся, то нічога. То яны яго запынілі і на гару два разы зганялі. Ён дадумаўся ў чым справа, зняў шапку і пакланіўся, а то ўжо думаў, што застрэляць. У Крынках немец двух чалавек забіў; біў ён крыху такіх няпоўнаразумных.

Як хто ў Бераставіцу канём заехаў, то калі конь чысты быў, то немец цукар даваў, а калі брудны, то дубасіў.

Я малако ў Бераставіцу завёз і не хацеў круціць цэнтрыфугі. То на нас сабак кінулі і два разы мусілі круціць.

Чалавек дубочка зламаў; акурат ехаў камісар:

— Хадзі! Навошта зламаў?

— Бо конь не хоча бегчы.

І немец стаў яго ганяць. Перакладчык сказаў скарыцца, бо заб’е. І той на калені ўпаў і немец яго мо з пяць разоў кульбакай ударыў, але не застрэліў.

Нас яшчэ ганялі ў Вайцехаўшчыну і Айцова абору будаваць. Насілі, пілавалі і цясалі драўніну. А зімою каменне на санях пад Гарадок вазілі.

У Германію з нашай вёскі забралі сямёра чалавек — адна дзяўчына не вярнулася, загінула ў час налёту. Чатырох хлопцаў у 1939 годзе з польскага войска трапіла ў нямецкі палон, яны вярнуліся ўсе. А ў 1941 годзе рускія ўзялі ў армію двух хлопцаў і яны прапалі. З Галынкі траіх хлопцаў не хацелі ехаць на работу ў Германію і сталі ў нямецкую паліцыю. Пасля саветы іх у Сібір пагналі; яны там адседзелі, але на радзіму не вярнуліся — пажаніліся ў цёплыя рэгіёны.

Пры саветах нельга было ні ў царкву, ні ў касцёл хадзіць, ні вянчацца, ні хрысціць. А калі хто памёр, то ні ксяндза, ні бацюшкі не было. Калі хто багацейшы быў, той мог узяць аркестр, а калі бедны, то і без нічога хавалі. Дзядзька бацюшкам быў, то ў архангельскія лясы яго вывезлі і дзецям дазволілі вучыцца толькі да сямі класаў. Не было там чаго есці: ні хлеба, нічога, толькі крыху рыбы соленае.

**餵餵**

**餵Каролька Канстанцін, Старое Ляўкова:**

Як пайшоў немец, то ў нас баёў не было, толькі станцыю ў Плянце самалёты збамбілі. Білі некалькі гадзін і ў нас было чуваць — пазрывалі рэйкі і пакруцілі.

Немец праследаваў тых, што пры саветах дзейнічалі, але ў нас ніхто немцам не даносіў, напрыклад Уладзіміра Харкевіча з Міхнаўкі таілі.

Хадзілі савецкія партызаны. Аднойчы адвячоркам прыйшлі ў Касьяны — сем чалавек. Наша хата ад лесу стаяла, яны прыйшлі на ганак. Мы ўгасцілі іх самагонкай, яны выпілі, павесялелі. Мы сталі гаварыць ім, каб ішлі, бо немцы ў Ляўкове, а яны сталі спяваць — п’янаму мора па калені. Яшчэ не палягалі спаць, калі ад Капітаншчыны пачуліся стрэлы. Двух партызан тады забілі, апошнія паўцякалі, некалькіх пасля злавілі.

Дзень-два пасля ўсім жыхарам Капітаншчыны і Касьяноў загадалі дабытак выгнаць і забраць або здаць за грошы. І з хат павыносіць неабходнае. І зараз усё спалілі, разам з платамі. А ўсіх людзей вывелі на канец Капітаншчыны, што ад Ляўкова, і ў рады выстраілі ў полі. І немцы сталі галасаваць ці пастраляць нас, ці пакінуць. І толькі адзін голас быў больш супраць расстрэлу...

І мяне адразу расстралялі б немцы. Бо калі згаданыя партызаны былі ў нашай хаце, адзін з іх прыхапіў са століка дакумент з маім подпісам. Той дакумент немцы знайшлі ў кішэні таго партызана і зараз спыталі пра мяне ў солтыса — Канстанціна Паўлоўскага з Ахрымоў. А ён ім сказаў, што такога няма, бо хіба немцы ў Германію вывезлі. І так я астаўся ў жывых, бо Паўлоўскі за людзей стаяў — ой, добры чалавек быў...

Пасля пагарэльцам загадалі сяліцца, хто дзе можа і многія ў Беласток выехалі. Мы пры санацыі клуню на хутары паставілі, і калодзежы выкапалі, але бацька з бацюшкамі добра жыў і нас забралі на ляўкоўскую плябанію. У бацюшкоў было дзве стадолы, то мы ў адной дабытак трымалі. І так пражылі мы ў Ляўкове пяць гадоў. Многа людзей у Ляўкове жыло — сюды былі выселены жыхары Скупава, Гушчэвіны, Міклашэва і іншых вёсак.

Пры немцы я ў лесе не рабіў, хіба што загадвалі на станцыі клёцы грузіць. Аднойчы прыйшлі каб я да нагрузкі ішоў, а я не пайшоў. Прыйшлі немцы з Бабякам, які быў іх перакладчыкам, і пытаюць, чаму я не пайшоў на працу.

— Бо не мая чарга, — адказаў я.

Немец мяне ўдарыў, але не надта моцна і загадаў ісці грузіць. А я зноў не пайшоў, толькі схаваўся ў Адамюковай клуні. Падняў куль і бачу, што немец шукае мяне і ругаецца. Яму кажуць, што я на станцыі.

— Няма яго там; калі злаўлю, то расстраляю!

Калі б злавіў, то забіў бы. І думаю я, што зрабіць. Была ў мяне рошчына, трэба было ўжо пераганяць яе. Сонца зайшло, я праз ноч нагнаў разам з бацюшкам самагонкі...

Было ў Ляўкове двух бацюшкоў: бацька Ян Новік і яго сын Аляксандр — я гнаў з маладым; стары гэтым не займаўся. Як забавы ладзілі, то мы з немцамі пілі. У Ляўкове шмат немцаў было, мо з дваццаць чалавек і з іх толькі два тэлеграфісты не пілі. Усе кватараваліся ў школе, сачылі за партызанамі, цікавіліся меркаваннямі насельніцтва. І да дзяўчат нашых хадзілі — былі такія як трэба. Мне адзін немец памагаў жыта касіць — цэлы дзень ён і я касілі, а тры ці чатыры дзяўчыны адбіралі. З адным немцам паехаў у Капітаншчыну па жыта.

— Калі пакажуцца партызаны, то я цябе ў жыта схаваю, — гавару яму.

— О, добра, — узрадаваўся.

Было двух такіх нямецкіх хлопцаў, што выпівалі з намі. На закуску давалі мы капусту квашаную і змарожаную зімою саланіну; немцы пастаўлялі нам дрожджы.

Жыў у Ляўкове Максім Кабаць са Скупава. Я нагнаў самагонкі, а ён павёз яе прадаваць і яго немцы злавілі. Спыталі, чыім апаратам ён гнаў, а ён сказаў, што маім. Прыехалі да мяне, забіраюць у Белавежу. Бацька ўзяў гуску і літр гарэлкі і таксама ў Белавежу падаўся. Заехаў, а там украінцы — даў ім тую гуску і гарэлку. На другі дзень дапытваюць мяне. Я сказаў, што апарат брат у лесе знайшоў, я ўзяў яго, але не

гнаў, бо спецыялістам з’яўляецца Кабаць, якога ўжо немцы забралі недзе пад Гайнаўку коней даглядаць. Немец ударыў мяне па плячы:

— Gut!

І адвезлі мяне самаходам аж у Ляўкова, але загадалі аддаць апарат. Я паказаў ім старую апаратуру, немец паглядзеў і сказаў, што нічога не трэба, але запатрабаваў халадзільнік. А праз мой халадзільнік Даніловіч у Лешуках гарэлку пераганяе, то я да Мікалая Саевіча:

— Дзядзьку, ці ў вас старых трубак ад халадзільніка няма?

— Ёсць.

— Дайце!

Немец кінуў трубкі ў самаход, спісалі пратакол. Я стаўляю літр самагонкі на стол, селі бацюшка і два немцы.

— За такую гарэлку караць нельга! — хваляць немцы. — Толькі з дурнем не займайся!

Пасля нейкага часу прыслалі мне заплаціць некалькі марак штрафу. А я далей што тыдзень-два гнаў. Намелеш у Гавеньчыка на Плянце жыта, запарыш кіпятком муку, памяшаеш, дадасі халоднай вады, пасля дрожджы. Пяць дзён пастаіць і рошчына гатова!

**Карпюк Мікалай, Страшава:**

Калі насталі немцы, зноў адну зіму давучваўся ў столяра, а летам пагналі з канём шашу будаваць. Калі шашу праклалі далей на ўсход, то нас адтуль звольнілі, але загадалі два дні ў лес хадзіць. Аднойчы спаткаў я ў Гарадку хрышчонага, а ён мне кажа, што набіраюць столяраў вокны ў камісара рабіць. То я ўзяў гарэлку і мяне прынялі; было нас 5 старых і 3 маладых.

4 мая 1944 года камісар вызначыў мяне ў Прусію ехаць; забралі мяне, мабыць, таму, што палічылі мяне сваяком Аляксея Карпюка, вядомага пісьменніка родам са Страшава, які быў тады партызанам; ён не быў нашым сваяком. Аляксей Карпюк раней служыў на чыгунцы і на службу трэба было яму апранаць нямецкі мундзір. Калі вяртаўся ён дадому, то той мундзір, заміж акуратна павесіць, кідаў на ложак. Прыкмеціў гэта нейкі немец і за тое кіданне мундзіра адправіў Аляксея Карпюка разам з братам у канцлагер у Штутгаф. Аляксей Карпюк уцёк падчас транспарту і, вярнуўшыся, вымушаны быў хадзіць разам з партызанамі.

Забралі нас тады 60 чалавек: 30 дзяўчат 1926 года нараджэння і 30 хлопцаў 1924 года нараджэння. Завезлі ў Элк. Шукалі там столяра, аднак я не прызнаўся, бо майму брату, які працаваў у дэпо, трэба было пачкі з дому пасылаць. Адзін гаспадар спытаў мяне, ці ўмею касіць

і забраў да сябе, у Байткова, 18 кіламетраў ад Элку ў бок Іаганнісбурга (Піша).

**Касцюк Уладзімір, Козлікі:**

Немцы гміну ў Заблудаве зрабілі і жандары там былі. І ў Рыбалах была гміна і жандары. У Заблудаве жандарамі былі немцы, а ў паліцыю набіралі тых, што ў войску адслужылі і ўмелі абыходзіцца з ружжом. Бралі мусам, не зважаючы на нацыянальнасць.

Мяне зразу хацелі ў Германію на работу забраць, але бацька ўзяў кошык яек і да камісара пайшоў. Бацька ўмеў па-нямецку, бо два гады пры цары быў у нямецкім палоне. І неяк выпрасіў, што я астаўся. Але і тут давялося папрацаваць пры пабудове дарог. Спачатку ганялі на той аэрадром каменне біць і той гравій на навакольныя дарогі вазіць. Пасля адправілі некалькіх нас у Пераходы, працаваць на баранавіцкай шашы. Раз там даў дождж, нашы ватоўкі прамоклі, і немец стаў нас моцна біць дубінкай. Дык мы ўцяклі. Некалькі дзён па кустах сядзелі, а калі ўпэўніліся, што нас не шукаюць, тады папрыходзілі дадому. І так асталося.

Пасля многіх маіх калегаў на працу ў Германію забралі, але мне ўдалося пазбегнуць гэтага. Ужо нарыхтаваў вопратку і харчы на дарогу...

Везлі ў Германію поездам палонных савецкіх салдат. Адзін з іх уцёк з вагона, падышоў пад нашу вёску і засеў у кустах. Я акурат там пасвіў дабытак, ён папрасіў есці. Я яму занёс і так гэта доўжылася нейкі час. Але ён баяўся, каб яго не выдалі немцам, бо расстралялі б. І ён папрасіўся на працу ў Германію. Наш солтыс добры быў, вырабіў яму аўсвайс, што ён тутэйшы і ён паехаў заміж мяне. Мы яму харчы пасылалі. Мама ў буханку хлеба бутэльку самагонкі ўсадзілі і паслалі. Я камашы яму паслаў, бо ён у лесе працаваў. А ён, Іван Шаўчэнка з Украіны, адпісваў нам:

— Не та мать, что родила, а та, что от смерти спасла.

Пасля, калі занялі яго рускія, загналі ў турму. Адтуль ён напісаў нам, каб прыслаць даведку, што ён не па сваёй волі ў Германіі апынуўся. Мы яму такую даведку паслалі, але больш ужо ніякіх вестак ад яго не атрымалі.

Траіх хлопцаў уцякло ад вывазкі ў Прусію, зайшлі ў Ляшкі — акурат да солтыса трапілі — і папрасілі есці, схаваліся ў стадолу. А солтыс замкнуў іх і ў Рыбалы жандарам данёс. Прыехалі, бах-бах; і той солтыс сам закопваў іх. Пасля вайны яго выслалі на белыя мядзведзі, але выжыў і вярнуўся і людзі яму дапякалі. А на месцы расстрэлу па-

ставілі крыж і напісалі, што загінулі з рук гітлераўцаў; але гэта было з рук нашых сабак.

Каля нашай вёскі везлі цэлы самаход людзей. Яны сталі ўцякаць: пецярых іх вартаўнікі застрэлілі, а двух было скаваных. Немцы ўзялі дваіх нашых вяскоўцаў, каб выкапалі яму. Застрэлілі яшчэ і тых скаваных. І ўсіх семярых там пахавалі і невядома, кім яны былі.

Партызаны ў нас не хадзілі, бо тут лясоў не было. Аднойчы я пад Жэдняй у цёткі начаваў, была зіма. Ноччу прыйшло мо з дваццаць чалавек. На другі дзень мела быць паніхіда па бабулі і для пачастунку былі нарыхтаваны харчы. Партызаны падзялілі ўсё напалову і палову ўсяго забралі. Папрасілі яшчэ самагонкі і адразу па бітончыку выпілі.

— Сегодня не докладывайте германцам, — сказалі, — только завтра.

Распыталі пра дарогу ў Белавежу і пайшлі.

Немцы ганялі нас у Жэдню чыгунку пільнаваць. Вызначалі адрэзак, вешалі на грудзі шыльдачку, называлі пароль. А самі хадзілі і правяралі. Калі б на чыім адрэзку ўзарвала чыгунку, тады таго вартаўніка пад расстрэл. Немцы ў Жэдні бункер мелі і ў тым бункеры сядзелі. Нас ганялі на суткі, а праз нейкі час зноў. Ездзілі мы туды фурманкамі.

**Кацэйка Кацярына, Бельск-Падляшскі:**

Першыя вывазкі з Орлі былі ўжо восенню 1941 года — забіралі капаць бульбу. У чэрвені 1942 года на спісак, які склаў солтыс Міхал Федаровіч, трапіла і я; мне ішоў васемнаццаты год. У арбайтсамт у Бельск везлі нас фурманкамі, вызначанымі з суседніх вёсак. Пачалі ўцякаць з тых фурманак, бо мала было ахоўнікаў, дык і я выскачыла і ў збожжа схавалася. Калі я выйшла на дарогу, запынілі мяне шуцманы і пасадзілі ў турму; і ўсіх палавілі. У час другога транспарту я ўжо не ўцякала — баялася за сваё жыццё.

Зборны пункт у Бельску быў там, дзе пасля вайны была камендатура паліцыі. Там трымалі нас тыдзень, штораз давозячы новых. Пасля, у акружэнні жандараў і шуцманаў, адвялі нас на чыгунку; праводзілі нас бацькі і знаёмыя — мяне адводзіла мама Галена. На станцыі пагрузілі нас у быдлячыя вагоны, закрылі дзверы, пакідаючы толькі расхілены верх дзвярэй. Праз той праём у час транспарту сталі ўцякаць хлопцы дык пасля і яго закрылі, пакідаючы толькі малую шчыліну. І так ехалі.

Спыніліся ў Беластоку, а пасля аж у Кёнігсбергу; помню, што сонца хілілася да захаду. Далі нам крыху харчоў, дазволілі ўзяць душ, а пасля агледаў нас лекар. Неўзабаве сталі нас разбіраць нямецкія гаспадары ў свае маёнткі. Неяк так выйшла, што ўсіх узялі, толькі асталася

я з Зосяй Шыманскай з Орлі, якая пасля вайны апынулася ў Амерыцы і там памерла. Я ўжо падумала, што мо нас дадому адправяць, што можа замнога работнікаў набралі. Але ўзялі і нас і завезлі ў аддаленую 30 кіламетраў ад Кёнігсберга мясцовасць Гейлігенбейль; там ужо нас чакалі.

У Орлю вярнулася я 1 снежня 1945 года.

**Кірылюк Аляксандр, Дубічы-Царкоўныя:**

Калі настала нямецкая акупацыя, 10 верасня 1941 года мяне і яшчэ пятнаццаць маладых людзей з Дубіч-Царкоўных прызвалі на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Васілёк, мясцовы падсолтыс, узяў на сваю фуру шасцярых „навабранцаў" (апошнія дзесяць паехалі на іншай фуры) і павёз іх у Бельск-Падляшскі. Адтуль, таксама фурамі, бо чыгунка была яшчэ парваная, але ўжо іншымі, завезлі нас у Беласток. Там на працягу чатырох дзён немцы сваіх дармовых работнікаў дэзінфіцыравалі, абстрыглі, абмылі, зрабілі медыцынскі агляд. Пасля пагрузілі нас на поезд і за суткі завезлі ў горад Нойдэнбург (сёння Нідзіца) ва Усходняй Прусіі. З поезда завялі нас у арбайтсамт, а адтуль маладых работнікаў разбіралі багатыя гаспадары. Я разам з іншымі сарака работнікамі трапіў у вялікі маёнтак Скотава.

**Клімук Дзмітры, Старына:**

У вайну дзейнічала тут партызанка. Мой старэйшы брат Канстанцін Клімук звязаўся з ёю. Са Старыны — ён і Мацвей Новахрымук. Іх двух было. Мой брат быў у партызанаў сувязным. Ён даносіў партызанам, што дзе робіцца.

У Войнаўцы за савета быў калгас. І двух рускіх было трактарыстамі. Як ужо пачалася вайна, яны таксама сталі сувязнымі і даносілі партызанам. Шпіёны даведаліся пра тое, прыехалі і забралі іх з сяла. Тых з вёскі пусцілі, а іх павесілі ў Белавежы. Нямецкі солтыс называўся Хвадзей Леўчук. Ён служыў на два бакі: і да партызанаў належаў і са шпіёнамі нямецкімі рабіў. Партызаны былі адсюль і з Расіі. Тыя другія, як немцы былі ўвайшлі, не мелі куды ўцякаць. Пераапрануліся ў цывільную вопратку і жылі з людзьмі. Немцы хацелі іх забраць у лагеры. У лясах былі і АКаўцы. Яны да нас прыязджалі. У адну ноч яны прыехалі і 18 вепрукоў забралі. Забралі фуры і завезлі кудысьці ў Гайнаўку. Гэта было вечарам, а раніцай коні самі прыйшлі; хіба падагналі іх і пусцілі. У гэтых партызанаў паявіліся шпіёны. Яны былі з Украіны. Яны ўвайшлі ў гэтае асяроддзе і запісвалі, хто і што рабіў. Аднаго разу шпіёны прыйшлі ў вёску з немцамі. Паставалі насупраць людзей

і нямецкі жаўнер пытаўся, ці мой брат быў з партызанамі. Ён прызнаўся, што быў сувязным. Яго забілі. Яму было 29 гадоў.

**Кондэль Аляксандр, Нурэц:**

У нашай вёсцы пасяліліся нямецкія жандары, мо з дваццаць іх было. Спачатку жылі ў адной хаце, а пасля зямлянку сабе пабудавалі. Выганялі людзей на варту, пуці пільнаваць. На тую варту мой бацька з братам хадзілі; разам з імі чэшскі лекар хадзіў.

У чэрвені 1942 года мяне забралі на прымусовыя работы ў Нямеччыну, але я каля Лявіцкіх, перад Беластокам, уцёк з поезда. 15 мая 1943 года забралі мяне другі раз. Пазвалі ў Мілейчычы, а адтуль фурамі завезлі ў Бельск. У Бельску пагрузілі нас у поезд і павезлі ва Усходнюю Прусію. Тым жа транспартам, што і я, толькі ў іншым вагоне, ехала і Ольга, якая пасля вайны стала маёй жонкай.

**Кузьма Аляксандр, Піражкі:**

У 1941 годзе немцы пагналі рускіх на ўсход. Я аднойчы ў тое лета зелле рваў у мяшочак. А з лесу выйшлі два стройныя рускія афіцэры і спыталі мяне, ці немцаў у вёсцы няма. А ў той час нікога і не было і я адказаў, што няма. Праз некалькі дзён з'явіліся немцы і яны адзін пры адным на той лес пайшлі. Нехта з тых рускіх стрэліў да немцаў, яны крыху заляглі ў збожжа, а пасля ўсталі і тых рускіх у лесе перабілі. Засыпалі іх, толькі ногі наверсе былі; цяпер на тым месцы таполі растуць.

У 1942 годзе немцы забралі брата ў сталярню за Беласток, а бацькі пра гэта не ведалі. Пасля, калі даведаліся, то бацька павёз на фурманцы харчы і адзенне яму. Калі бацька вяртаўся, даведаўся ад швагра, што наша хата згарэла.

— А сям'і нічога не сталася? — занепакоіўся ён.

— Сям'я ў парадку, — пачуў у адказ.

У суседа быў радыёпрыёмнік, пярун ударыў у яго хату, а адтуль і нашы збудаванні заняліся. Сталі думаць адбудоўвацца, расцягнулі тое, што згарэла і хату пры хляве прыбудавалі; жылі так шэсць гадоў.

Немцы клікалі маладых людзей у Крынкі, на работу ў Германію высылаць. І мне далі павестку з'явіцца; разам са мною яшчэ дзве дзяўчыны было і адзін хлопец. Адна з дзяўчат была пляменніцай солтыса і ёй падказалі, каб нас, хлопцаў, адно падаслаць. Але мы пільнаваліся тых дзяўчат і да немца не пайшлі; такім чынам я астаўся дома.

Калі немцы адступалі, дык за нашымі стадоламі танкі паставілі, дуламі на Крынкі. Але рускія абышлі немцаў ад поўдня, і калі яны пра гэта даведаліся, кінуліся ўцякаць, але многа іх рускія палажылі.

**Купрыяновіч Мікалай, Бельск-Падляшскі:**

У Кленіках, распаложаных недалёка Бельска-Падляшскага, у час вайны працаваў у аднаго з гаспадароў калекі расійскі салдат. Гісторыя яго жыцця моцна звязана з Падляшскай зямлёй. Яго маці паходзіла з Гарадка, аднак у I вайну яна разам з сям'ёй выехала ў Расію і там выйшла замуж. Аднак працы ўсім не хапала і яе сын прыехаў на Беласточчыну. Працаваў ён на чыгунцы пры разгрузцы вагонаў. Два гады пазней прыйшла вайна. Мабілізавалі яго ў армію. Аднак доўга ён не служыў, бо быў ранены. Лёс кінуў маладога чалавека ў Клені́кі, дзе за дах над галавой і страву памагаў аднаму гаспадару. Аднойчы, летам, калі ён працаваў у полі з навакольнага лесу выйшла трох мужчын. Гэта былі яўрэі, якія ўцякалі з Бельска ад немцаў.

— Чалавеча, памажы нам, — папрасілі.

— А ў чым? Чаго хочаце?

— Партызанаў шукаем, хочам далучыцца да іх. Лепшая з імі будзе смерць, чым у нямецкім лагеры.

— Добра вы трапілі, — адказаў мужчына. — Я і мой гаспадар памагаем такім як вы, можа восенню таксама да партызанаў пойдзем. Давайце, пойдзем у вёску. Паясце, праспіцеся, а заўтра раніцай адвяду вас. Пакажу дарогу.

Пайшлі, аднак не да гаспадара. Мужчына завёў іх да солтыса і пагразіў яму: калі не аддасі іх немцам, выдам цэлую вёску. Усіх вас пазабіваюць.

— Што ты, з розуму сышоў?! Нявінных людзей на смерць аддасі? Што табе сталася?

— Не людзей, а яўрэяў, — адказаў зняважліва мужчына.

— Цяпер не адвязу іх на пастарунак. Людзі яшчэ ў полі, нікога яшчэ ў вёсцы няма, а сам не павязу. У Орлю далёкая дарога і ноччу ніхто не захоча ехаць. Заўтра адвязу, — сказаў за злосцю солтыс. — А іх у маім свірне замкнем, дык раней есці дам.

— Не! Ні есці, ні піць не дастануць. Хай з голаду ўміраюць, — адказаў з нянавісцю ў вачах мужчына, — а ключ ад свірна я забяру.

— Чаму ж ты іх так ненавідзіш, што яны табе зрабілі? — спытаў солтыс.

— Што?! Перад вайной я працаваў на чыгунцы ў аднаго яўрэя. Такога чалавека забіў бы я адразу ў адной хвіліне. Кроў плыла нам з рук,

а ён смяяўся і нагайкай біў па галаве, плячах і нагах. Цэлы дзень чалавек нават не еў і не піў. Ён нам нават вады шкадаваў. А закурыць ці за патрэбай адысці? Смяяўся нам у твар і іранічна гаварыў: пад сябе рабі. Аднойчы за лусту хлеба пабіў мяне да непрытомнасці. За кавалачак хлеба... Ад таго моманту зненавідзеў я ўсіх яўрэяў і падтрымоўваю немцаў. Яўрэі не павінны жыць.

— Апамятайся, чалавеча, яны Богу духа вінны. Пусці іх спакойна перад сябе, — прасіў солтыс.

— Не! — сказаў, — я свайго слова не змяню. Або заўтра іх завязем, або вёска згіне.

Што было рабіць? Замкнулі яўрэяў у свірне. Мужчына забраў ключы і пайшоў дадому. Аднак солтыс не мог так пакінуць нявінных людзей. Калі пачало змяркацца, прайшоўся ён па вёсцы, сабраў людзей і паінфармаваў у чым справа. Жыхары Кленік доўга не думалі: людское жыццё — бясцэннае. Цераз невялікае акно свірна падалі яўрэям ваду, ежу а на канец драўляныя стаўбы, якімі зняволеныя мелі разбіць дах. Удалося. Каля 1 гадзіны ночы яўрэі былі асвабоджаны. Адзін з гаспадароў падвёз іх возам амаль да Гайнаўкі. Адтуль было ўжо недалёка да партызанаў у Белавежскай пушчы.

Раніцай здарылася „няшчасце”.

— Дзе яўрэі, пытаю? Дзе? Выпусціў ты іх? — крычаў мужчына на солтыса.

— Не, нават не ведаю аб чым ты гаворыш, — адказаў солтыс.

— Не ведаеш? То сам глянь — няма іх.

— Сапраўды няма. Божа, а мой свіран знішчаны. То праз цябе! — крычаў солтыс. — Два тыдні таму паставіў яго, а цяпер што? То былі „твае” яўрэі, ты хацеў адплаціць, помсціцца на іх. То цяпер заплаціш мне за мой знішчаны свіран.

Збянтэжаны мужчына паціснуў плячыма, у злосці яшчэ вылаяўся і адышоў. Солтыс глыбока ўздыхнуў, перахрысціўся і падзякаваў Богу за тое, што план выратавання ўдаўся.

**Кучка Андрэй, Гацькі:**

У Плютычах войска нямецкае стаяла. Партызанка была таксама — саветы там хадзілі, нашых не было. Аднойчы тыя немцы злапалі каля Гацькоў двух партызан і хацелі нашу вёску спаліць. Павыганялі нас усіх з хатаў, але ехала таксоўка, а ў ёй якісь вышэйшы афіцэр, затрымаўся, штось там яны гаварылі-гаварылі і сказалі, каб расходзіліся па хатах. Было гэта яшчэ перад Райскам. Пасля, як фронт надходзіў, то мы ў лес паўцякалі, там двое ці трое сутак сядзелі, а пасля выехалі

ў Стацэвічы і там прабывалі пакуль фронт прайшоў і толькі тады вярнуліся дадому.

**Лапінскі, Полька:**

Партызаны заходзілі ў нашу вёску часта. Найчасцей бывалі ў Казберукоў, бо была ў іх вялікая хата. Гаспадарам на адыходнае гаварылі, каб дакладваць немцам, што яны былі, толькі каб не гаварыць, колькі іх было і ў якім напрамку адышлі. Гаварылі, што немцы ведаюць пра іх тут прысутнасць і будуць нас выпытваць і што трэба пра іх гаварыць, каб немцы не падазравалі, што памагаем партызанам канспіравацца. Ну і раз солтыс Палех, якому нехта далажыў пра прабыванне партызан, паехаў у Міхалова і далажыў пра тое немцам, а Палеха дачка паведаміла партызан, каб уцякалі, бо на іх пайшоў данос. То тыя партызаны тады да таго дзіцяці: хто далажыў? А яна сказала, што падсолтыс з Круглага Ляска. Ну і яны забілі Кужалеўскага, падсолтыса, хаця той ні ў чым не быў вінаваты. Людзі гаварылі, што зрабіў гэта Васько Мікалай, але пасля вайны разглядаў гэту справу суд і не прызнаў яго віноўным. А гаварылі так таму, што Васько даносіў на тых, што дрэвы з лесу падкрадалі, каб будавацца. А партызаны тыя розныя былі: адны гаварылі так, а другія рабілі інача й; былі сярод іх і звычайныя зладзеі.

І неўзабаве, 22 студзеня з раніцы абставілі Полька немцы і забралі ўсіх — і мужчын, і жанчын, і дзяцей — у Міхалова. Жандармерыя была з Міхалова, Гарадка і хіба Нараўкі. Нічога нельга было з сабой забраць — паехалі так, як стаялі. Мужчын адразу паставілі пад дрэвамі і пад вінтоўкамі, а пасля ўсіх грузілі на сані, якімі яны прыехалі. Адзін мужчына быў стройны і немец кажа яму: „Куры ў лес пайшлі, ідзі лапай”. Быццам падказваў, каб уцякаць. Але ён не пакарыстаўся такою нагодай: пабаяўся, што гэта правакацыя, праз якую можа загінуць цэлая вёска. У дарозе жанчыны пачалі галасіць, то адзін з немцаў крыкнуў: „Ціха быць, а не, то зараз у рове можам закончыць!” Ну і стала ціха. Завезлі іх у Міхалова. Там раздзялілі мужчын ад жанчын і дзяцей.

Мяне спачатку ўзялі разам з мужчынамі але мама, і я, пачалі плакаць, то мяне адвялі да мамы. Мужчын забралі ў жандармерыю, там цяпер асяродак здароўя, а нас з жанчынамі трымалі тут, дзе цяпер ПКС. Там нас трымалі каля тыдня, потым наступіла далейшая сегрэгацыя — выпусцілі тых жанчын, што мелі малых дзяцей. А тых, што надаваліся да працы ў Нямеччыну, між іншым нас, — аддзельна, і пасля ў Беласток. У Беластоку трымалі нас недалёка вакзала, у свайго роду

гета, таксама каля дзесяці дзён. Пасля немцы падставілі транспарт і вывезлі. Калі мы яшчэ былі ў Міхалове, мужчын дапытвалі. Быў там адзін такі жандар, чалавек відаць добры, ён прынёс бялізну аднаго мужчыны жонцы — таго якраз, якому немец падказваў уцякаць. Было відаць, што пускалі на іх сабак — кашуля была падзерта і цэлая ў крыві. Аднойчы прыйшоў ён да нас і сказаў: Ну, цяпер Полька ўсё прапала.

І прыехаў самаход з гестапа з Беластока, мужчын павезлі пад Круглы Лясок. Было гэта нейкі месяц пасля таго, як вывезлі. Сагналі ўсіх з Круглага Ляска і Мацейкавай Гары на сход у Круглы Лясок, у школу. Па нейкім часе пабачылі, што едуць у вёску фурманкі з Міхалова. Потым загадалі ўсім выйсці і ў прысутнасці суседніх вёсак прывезеных расстралялі. Пасля прывезлі пастраляных у Полька, — тут ямы на бульбу былі, — і ў тыя ямы пакідалі, па двух-трох, і прысутным мужчынам загадалі пазасыпаць. І як мужчын пабілі, то ўжо тым жанчынам, што асталіся, сказалі вяртацца, хто куды хоча, абы толькі не сюды. Адна жанчына, напрыклад, паехала з дзяцьмі да сястры, што жыла ў Нарве. Гаварылі, што аднойчы, ідучы з Нарвы сюды, назбірала па дарозе грыбоў. Прыйшоўшы, распаліла ў печы, каб іх пасушыць. Немцы, пабачыўшы, што тут дым ідзе — што быццам бы тут партызаны маюць прыстанішча, вырашылі ўсё, што асталося, разабраць і прадаць. Праўда, тут, аднак, такая, што немцы выдалі гэты загад раней; жанчына гэтая паліла ўжо ў голай печы. І хто меў блізкую сям'ю, той праз пасрэдніцтва тае сям'і купляў свае ў немцаў — потым, як фронт прайшоў, забралі і паставілі на свае месцы. Былі пустакі, нарыхтаваныя на будову хлява, то тыя пустакі жандары забралі ў Міхалова і там нейкі склад пабудавалі. Пасля, як ужо фронт прайшоў, адкапалі пабітых і па вопратцы, крыжыках, распазналі, паклалі ў труны і перавезлі на могілкі ў Новай Волі, дзе кожнага пахавалі на сваё месца, пры сваёй сям'і.

**Лук'янюк Мікалай, Бялкі:**

На другі дзень у нашай вёсцы паявіліся немцы. Памятаю, якія яны былі тады ветлівыя. Казалі, што „праз тры дні Масква капут". Але мінула тры гады, а Маскве „капут" не было...

Савецкія салдаты, якія не маглі ўцячы на ўсход, асталіся жыць у сялян (тут іх называлі „васточнікамі") і ўтвараць партызанскія атрады. У нашай вёсцы быў партызанскі сувязны Мікалай Міхальчук (той самы, у якога хаце быў „красный уголок"). Пасля немцы пачалі забіраць маладых ды малазямельных на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Пазабіралі з нашай вёскі моладзь ды завезлі за драты ў Супрасль. На дру-

гую ноч шмат хто адтуль уцёк. Немцы над раніцай 14 кастрычніка, у нашу Пакрову, пазабіралі ўсіх ды павезлі за драты ў Беласток, а пасля далей. Многія з Нямеччыны не вярнуліся. Шмат хто, вызвалены Чырвонай Арміяй, быў забраны ў войска ў штрафныя батальёны толькі за тое, што працаваў у немцаў, быў „здраднікам сваёй айчыны”. Забралі былі немцы і маю сярэднюю сястру; яна стала працаваць у бальніцы ў Беластоку, якая размяшчалася ў казармах 10 палка (вул. Кавалерыйская), але на два месяцы перад надыходам фронту яна адтуль уцякла.

Немцы на сялян накладалі вялікія падаткі. Бульбу і збожжа трэба было везці фураю аж у Беласток, 35 кіламетраў, а малако штодзённа дастаўлялі ў Міхалова (14 км). Каменне вазілі на баранавіцкую шашу ў ваколіцу Пяшчанік. Калі было яшчэ цёпла, забіраў мяне бацька на фуру, каб і я дапамагаў яму збіраць каменне. Потым мы ішлі каля фуры, бо каню было цяжка. Паабапал шашы было столькі спаленых самаходаў, танкаў, зброі, патронаў! — хлопчыку было цікава, ды бацька забараніў мне адыходзіць убок.

Потым немцы загадалі высякаць лес каля Жэдні, і нашы людзі бралі харчы сабе ды каню на тыдзень і па чарзе ездзілі туды высякаць лес і там ужо начавалі. Калі мой бацька быў ужо дома, то трэба было намалоць жыта на хлеб у жорнах. Я тады бегаў з кіёчкам па панадворку ды бразгатаў па штыкецінах, каб суседзі ды немцы не пачулі, што мой бацька меле.

На нашай тэрыторыі дзейнічала толькі савецкая партызанка. Партызаны, якія прыйшлі ў вёску ўпершыню, пыталіся, ці „казённые вещи имеешь”. Калі хто прызнаўся і аддаў, у таго не шукалі, а хто абмануў, то ператрэслі ўсё, а як знайшлі, то больш усяго забралі. Калі прыходзілі бандыты, то ўсё забіралі, нават жаночае ці дзіцячае, але яны вельмі баяліся партызан, бо тыя іх ставілі пад расстрэл без суда.

У час нямецкай акупацыі кожны баяўся — не ведаў, што яго заўтра чакае — прымусовыя работы, лагер, а можа — смерць. Калі адступалі на захад апошнія нямецкія часці, было гэта праўдападобна СС, пахавалі ў вёсцы каля крыжа двух нямецкіх салдат (яны па сённяшні дзень там спачываюць) ды хацелі падпаліць нашу вёску, але жанчыны пачалі прасіць, прынеслі яек ды саланіны. Тады жаўнеры сказалі „гут” і адышлі.

**Ляўчук Іван, Сасіны:**

Першы набор на працу ў Германію адбыўся ў 1942 годзе. З Сасін солтыс вызначыў каля дзесятка чалавек. Заехалі ў Мілейчычы, а адтуль зараз фурманкамі завезлі нас у Кляшчэлі на станцыю, пагрузілі

ў вагон і павезлі ў Бельск, у арбайтсамт. Трымалі нас там у бараках, асобна мужчын і асобна жанчын. Елі тое, што забралі з сабою.

Пасля тыдня пад стражай пагналі нас на станцыю і пагрузілі ў таварныя вагоны. І павезлі, а куды — невядома. Апынуліся ў тым вагоне такія, што выламалі акно і ад Райска сталі выскакваць між рэйкі. Я выскачыў за Лявіцкімі і вярнуўся назад. Ішоў пяшком цэлы час, нават чамаданчык прынёс. Не пайшоў, аднак, дадому, толькі ў Дубна, да дзядзькі. У бацькоўскую хату з'яўляўся, але дома не начаваў. Калі жандары ехалі ў вёску, я ўцякаў у лясок за рэчкай, адкуль усё мог бачыць. Як жандары ад'язджалі, я вяртаўся дадому. І так паўгода хаваўся я: то ў Дубне, то ў Дашах, а жандары мяне шукалі. Пасля яны забралі бацьку і пасадзілі ў арышт у Мілейчычах; сказалі, што выпусцяць, калі я з'яўлюся.

Я зайшоў у Мілейчычы, тады бацьку выпусцілі. У Мілейчычах была замужам маміна сястра, яна зналася з жандарамі, зайшла да іх і сказала, што ў нас тыф. Мяне выпусцілі, але вызначылі тэрмін для яўкі. Той час прыйшоў і я паехаў проста ў арбайтсамт у Бельск, бо іншага выхаду ўжо не было.

Не каралі мяне, патрымалі некалькі дзён і ў вагон. Ехалі пасажырскім вагонам, якога немец пільнаваў. Так я заехаў у арбайтсамт у Кёнігсберг. Вярнуўся дадому 27 ліпеня 1947 года.

**Масайла Лідзія, Курашава:**

Пасля Вялікадня 1943 года хадзілі па вёсцы немцы з арбайтсамта ў Новым Беразове з нашым солтысам і назначалі моладзь на работу ў Германію. Мы з сястрою ўцяклі за клуню, але мяне і так назначылі. Хутка забралі ў Гайнаўку, а адтуль поездам у Беласток. Там завялі ўсіх нас у лазню, праверылі ці здаровыя і павезлі ў Прусію. Завезлі мой транспарт у Гайльсберг (цяпер Лідзбарк-Армінскі), горад велічыні Гайнаўкі, 80 кіламетраў ад Кёнігсберга.

**Масальскі Канстанцін, Фальваркі-Тыльвіцкія:**

Калі ўжо нямецка-савецкі фронт адкаціўся на ўсход, я пасвіў каня, кароў і авечак побач дарогі з Фальваркаў-Тыльвіцкіх на чыгуначную станцыю ў Жэдні. У той час пад'ехала калона савецкіх танкаў і грузавікоў запоўненых салдатамі. Адзін, які сядзеў у кабіне першага самахода, сказаў мне:

— Сынок, убирай свой скот и бежи отсюда; могут налететь германские бомбардировщики и ты погибнешь!

Я так і зрабіў ды пра здарэнне даклаў бацькам. Тата сказаў, што той салдат напэўна меў сям'ю, дом і сына ды разумеў, што такое бацькоўства і любоў да сына і сям'і.

Праходзячы дарогай побач хаты, я ўбачыў пралятаючы нізка самалёт з чырвонымі зоркамі на крылах; было гэта тады, калі ўжо суцішыліся водгаласы фронту.

Бацька, вяртаючыся з сенакосу каля Пераходаў, што каля Каралёвага Моста, прывёў з сабою апранутага ў цывільнае былога савецкага салдата, які ўцёк ад немцаў, калі гналі калону ў няволю. Пасля некалькіх дзён адышоў ён да знаёмага ў вёску Малынка. Так ён дабраўся ў Белавежскую пушчу і далей дайшоў да родных на Украіне. Апошні ліст ад яго бацька атрымаў у шасцідзесятыя гады. З ягоным побытам у нас была звязана і іншая падзея. Прыйшлі немцы з солтысам і катэгарычна сцвярджалі, што бацька хавае рускага салдата. Солтыс даказваў ім, што той адышоў у невядомым напрамку. Тады гітлеравец некалькі разоў ударыў бацьку прыкладам карабіна. Пасля вобыску будынкаў немцы адышлі.

Праз нейкі час немцы прыехалі на самаходзе і забралі ўсё збожжа на патрэбы фронту і толькі пасля просьбаў і плачу пакінулі каля пяцідзесяці кілаграмаў. Па загадзе нямецкіх гмінных улад у Заблудаве мая мама, так як і іншыя жанчыны, вымушана была вязаць на прутках ваўняныя шкарпэткі і рукавіцы нямецкім салдатам на фронце, а бацька вазіў каменне на будову шашы за Жэдняй. Апрача таго ён разам з іншымі мужчынамі мусіў часта хадзіць у Жэдню пільнаваць чыгунку ад савецкіх партызан.

У частцы пабудаванай з палявых камянёў аборы, прызначанай на свіран, бацька разам з суседзямі гнаў самагонку. У той час здарылася нечаканасць: прыйшоў сын суседа Антона Пылкоўскага, Уладзімір, з паведамленнем, што на іхнім панадворку немцы. Апаратуру, хаця была ў вытворчым разгары, маланкава разабралі і схавалі. Апаратура складалася з танкавага бака для вады, трубак, бочкі з брагай, адстойніка з вялікай снараднай гільзы і бочкі з трубкамі для схалоджвання кандэнсаванай самагонкі.

Прыгадаю падзею, якая для мяне магла мець трагічныя выследкі. На другі дзень Каляд бацькі паехалі ў царкву, а да мяне зайшлі з самагонкай браты Трахімчукі: Юзаф і Анатоль. Я таксама паставіў. Выпіўшы, мы страцілі прытомнасць. На той момант вярнуліся са святой літургіі бацькі і давай нас ратаваць. З таго часу аж да прызыву ў войска я не мог піць гарэлкі.

Цікавіўся я таксама, як паводзіць сябе жывёла пасля спажыцця алкаголю або брагі. Свінні ляжалі на баку, стагналі і матлялі нагамі. Кот хістаўся, скакаў на сцены і фіранкі ды мяўкаў. Сабака скуголіў і, скруціўшыся, ганяўся за сваім хвастом. Карова раскірачыла ногі, а рогі накіравала да зямлі, быццам мела яе бадаць. Конь матляў нагамі быццам на муштры, задзіраючы ўгару лоб і хвост. За штучку з канём атрымаў я ад бацькі лупцоўку.

Немцы забаранялі забіваць жывёлу для ўласных патрэб. Нягледзячы на гэтую забарону, калолі, робячы гэта наступным чынам. Вепруку звязвалі лыч, каб не вішчаў, білі абухам сякеры ў лоб, а затым убівалі швайку ў сэрца. Заміж абсмальваць шчэць саломай, абпальвалі бензінавай лямпай у павеці і затым спарвалі шкуру кіпятком. Пасля гэтай цырымоніі патрашылі ўзацішным месцы: павеці, гарышчы, склепе або дрывотні. Кантынгентнае малако насілі ў нас да гаспадара Міхала Лявончука, які, так як і мы, жыў на хутары.

Стаяла памятная зіма з 1941 на 1942 год. Снежныя гурбы сягалі да двух метраў вышыні. Каб дабрацца да гаспадарчых збудаванняў бацькі пракопвалі тунэлі ў снезе. Нам, дзецям, цяжка было з'язджаць самаробнымі санкамі з тых гурбаў. Страглі мы ў снезе да пояса, губілі галошы ад валёнкаў. Ад лютых маразоў трэскалі платы і дрэвы, а на замерзлых шыбах узнікалі непаўторныя ўзоры. Праз акно нельга было ўбачыць, што дзеецца на панадворку. У вёску цяжка было праехаць. На дарогах цяжка было размінуцца санямі; прынцып быў такі, што з'язджалі ўбок так, каб адзін полаз ішоў па адной каляіне. Сані нахіляліся тады нават так, што пераквульваліся, а коні гразлі ў снезе; цяжка было вярнуць іх на працертую дарогу. У такіх выпадках вазакі дапамагалі сабе вярнуцца палазамі ў абедзве каляіны.

Зімою часта на панадворкі стараліся пранікнуць ваўкі, якім перашкаджалі высокія платы. Набліжанне ваўкоў сабакі прадвяшчалі скуголеннем і выццём. У такім выпадку бацька забіраў сабаку з панадворка ў сені. Здарылася, што ў суседа ваўкі загрызлі авечку ў хляве.

Восенню (года не памятаю) пайшоў я ў школу ў Тапаляны. Навучалі нас з тых самых падручнікаў, што і пры саветах. Адно толькі настаўніца загадала вырваць з падручнікаў тыя старонкі, на якіх згадвалася пра Леніна, Сталіна і Савецкі Саюз.

Адной ночы, нягледзячы на брэх сабак, пачуўся стук у наша акно. Бацька, не запальваючы лямпы, упусціў у хату невядомых людзей, затым засланіў акно ў кухні пледам і запаліў лямпу. Я ўбачыў савецкіх салдатаў і чалавека, якога бацька фамільярна называў Косцем (мой бацька называўся гэтак сама). Госці папрасілі, каб даць ім нешта паес-

ці. Памятаючы ўласаўскую правакацыю ў знаёмых, бацька сказаў, што калі хочуць, хай бяруць самі. Яны з’елі вараную бульбу, якая асталася з вячэры, хлеб і малако, падзякавалі і пайшлі. Іншым разам так сама застукалі ў акно і нешта сказалі бацьку. Я не ведаў, што гэта былі паролі. Пра паролі і згаданага Косцю я даведаўся толькі пасля вайны. Чалавекам тым быў жыхар вёскі Патока Канстанцін Дамброўскі, удзельнік руху супраціўлення. За кожным іх наведваннем не толькі елі сціплую вячэру, але і атрымлівалі хлеб і саланіну на дарогу. Ад бацькі я даведаўся, што яны многа ведалі аб падзеях у Заблудаўскай і Міхалоўскай гмінах і звычках прабываючых там немцаў. Задачай атрада быў нагляд за чыгункай у раёне Жэдні. Яны маглі бесклапотна ўзрываць цягнікі, толькі шкадавалі мясцовых жыхароў пільнуючых пуцей, каб у адплату немцы не здзекаваліся да смерці з імі. Ідучы з Белавежскай пушчы ў Жэдню яны часта сушылі анучы. Сярод іх быў адзін у адметнай вопратцы, якога яны называлі камандзірам. Аднойчы неспадзявана папрасілі ў бацькі машынку для стрыжэння. Сказалі, што прынясуць наступным разам. Так і сталася, толькі стукаючы ў акно сказалі пароль „машынка”. Дзякавалі словамі „Спасибо, Константин”.

Чарговай важнай падзеяй, у выніку якой маглі быць пабіты ўсе нашы пяць сем’яў, было хаванне нашым суседам Юзафам Трахімчуком пары яўрэяў аж да вызвалення. Я пра гэта даведаўся толькі пасля вайны і толькі тады зразумеў, у якіх мэтах мае бацькі час ад часу ўадзіночку наведвалі згаданага суседа; насілі ім ежу. Іх хавалі ў яме пад стогам саломы. Пасля вызвалення, у падзяцы, яны пашылі нашай сям’і ўсё, пра што толькі бацька з маці папрасілі (м.інш. кажухі і буркі). Пасля яны выехалі і след за імі прапаў. Запамяталася мне, як яны ставалі перад акном, закрывалі вочы і маліліся. Я прыслухоўваўся спрэчкам, якія яны вялі з бацькам на тэму яўрэйскай і праваслаўнай рэлігій. Узаемна знаёміліся з прынцыпамі веры, але кожны аставаўся пры сваім. Разыходзіліся без ніякай злосці.

Часта бацька, едучы ў Беласток, забіраў з сабою мяне. Праязджалі мы побач фабрыкі фанеры дарогай з каляінамі ад жалезнякоў — сённяшняй вуліцай Нядзведзяй. Тэрыторыя фабрыкі была абгароджана шчыльным плотам з драўняных дошак вышынёю каля двух метраў, за якім нічога нельга было ўбачыць. На месцы, дзе сёння знаходзіцца невялікі пляц па Нядзведзяй вуліцы, стаяў драўняны будынак г.зв. чварак. Бацька заўсёды заязджаў да аднаго чалавека, Эдварда, які купляў сельскагаспадарчыя прадукты (жыта, авёс, бульбу і г.д.). Часта, маючы час, бацька гутарыў з ім пра абставіны на вёсцы і ў горадзе, а я гэтым гутаркам прыслухоўваўся. Даведаўся я тады, што на рагу вуліц

Нядзведзяй і Цыялкоўскага стаяў касцёл, які спаліла савецкае войска. Пан Эдвард не праклінаў саветаў, толькі сваіх польскіх братоў, якія прычыніліся да пажару касцёла. Адбылося гэта наступным чынам. Вуліцай Цыялкоўскага адступала калона савецкіх войск. З дазволу пробашча некалькі чалавек з касцёла і з укрыцця побач храма адкрылі па гэтай калоне агонь. Камандзір калоны не мог дазволіць, каб некалькі чалавек дэзарганізавала марш войска і даў загад абстраляць касцёл, з якога вялі па салдатах агонь. Касцёл загарэўся, а схопленых баевікоў расстралялі. Звычайна адступаючыя савецкія атрады праходзілі побач шматлікіх касцёлаў і цэркваў і не падпальвалі іх.

**Матэйчук Эліза, Беласток:**

Старэйшых за 60 гадоў у вёсцы не было, мая мама мела 60 гадоў. Былі дзеці — аднаму быў год, аднаму два, аднаму тры. З Пяшчанік было адно сужонства з адным дзіцём, аднагадовым. З Папоўкі ў адной сям'і было чацвёра дзяцей, у другой было чацвёра дзяцей, у трэцяй было шасцёра і ў чацвёртай сям'і было шасцёра. Ад аднаго да дваццаці гадоў дзеці былі.

Не знаю, чаму на помніку напісана, што здарылася гэта 3 чэрвеня. Дакладная дата — 3 ліпеня 1943 года.

Трыццаць сем чалавек расстралялі — палічылі туды і маю сястру, што жыла ў Саколі, і якая загінула невядома дзе. Дзесь у лесе; акурат 16 ліпеня, як беластоцкае гета ліквідавалі, яе забралі з Саколя. Знайшлі потым яе заграбаную ў лесе з якойсьці расіянкай з Міхалова. А мужа яе забілі два тыдні раней; пахаваны каля тартака, што за Саколем. Бо тады яе дома не было, то яго забралі, а пасля, па двух тыднях, то і яе... Гаварылі, што ён жыд, але не. Ён, зрэшты, і сам не ведаў, кім ён, бо быў з сірочага дома. А што быў чорны, то так і падумалі — а папраўдзе мог гэта быць і грузін.

Мне тады было 18 — я толькі і сястра ў бацькоў былі. Бацьку забралі ў турму год раней, 30 чэрвеня 1942 г. А пасля года, 1 ліпеня забралі мужчын, 2 ліпеня забралі жанчын і дзяцей, а 3 ліпеня, у суботу, усіх іх расстралялі — на жыдоўскіх могілках у Гарадку. Бацька не знаю дзе — ці ў Грабаўцы, ці ў Навасёлках, ці дзе пахаваны — дадому не вярнуўся. Як прыйшлі немцы нас забіраць, мама падказала мне: Хавайся! А куды схаваешся, як поўна немцаў навокал. Думалі, што на работу ў Нямеччыну будуць забіраць. То я з ложка і пад ложак схавалася. Увайшлі ў хату і пытаюцца: Хто тут жыве? Мама кажа, што дзве: яна і мая сястра. А сястра тады ў нас не начавала, то забралі толькі маму. А я сядзела пад ложкам даўжэйшы час. Гляджу — дзверы паадкрыва-

ны, немцы ўваходзяць і выходзяць. А ў нас такая ніша пад печчу была, кучай называлі — то я туды. Але гляджу, ужо і сонца высока, і яны толькі патэльнямі бразгаюць, хіба снеданне сабе шыкавалі. То я праз вакно выскачыла, і ў гародчык. Пасядзела, бачу — ціха, пералезла тады праз плот, праз дарогу, і ў жыта. І такім цудам асталася. Прыйшла ў Беласток — тут, на гэтай сядзібе, была майго таты цётка — і гавару, што так сталася. На другі дзень яна гаворыць: Ідзі даведайся, што там. Я ўжо да Папоўкі не дайшла, ехалі з Каралёвага Моста і мне сказалі, што ўжо нікога няма — усіх у Гарадку пастралялі. Пайшла да адных знаёмых да Пяшчанік, да другіх — кожны мяне баіцца; такі час — хто данясе, хто нешга скажа... То я пайшла аж у Валілы, там мая знаёмая была. І яна кажа: У нас таксама нельга начаваць, бо і да нас немцы прыходзяць. Дарадзіла мне ў жыце пераначаваць — прынесла мне кажух, хустку. Ну і я так да раніцы прасядзела ў тым жыце. Раніцай забрала яна свае рэчы, а я зноў у жыта, бо таксама баялася. Падслухала, як людзі вялі коней і гаварылі, што немцы прыказалі ехаць усім на Папоўку і вывозіць, што асталося. Я падышла з другога боку, паглядзела — дах здымалі з двух дамоў, што новыя былі. Што забралі, а што асталося, тое ў аўторак спалілі.

А я пабачыла — і ў Беласток. Іду, едуць дзве фуры, мужчыны вязуць бульбу. Я папрасіла і яны мяне падвезлі. Едзем, а яны мяне пытаюць, адкуль я, куды іду. Я ім усё расказала. Надышла навальніца, яны коней пад дрэвам паставілі, паселі, пасіліліся, я з імі пасядзела. Дождж спыніўся, а той, што мяне вёз, кажа: Знаеш што, я цябе далей не павязу. Таксама баяўся. Але другі кажа: „Сядай на маю фуру, што будзе, то будзе”. Так я вярнулася ў Беласток. Хацелася потым на роднае...

З ацалелых печаў людзі пазабіралі цэглы, кафлі тады не было. Яшчэ нейкі час на месцы вёскі авечак пасвілі, кароў. Але як парабілі калёніі, то ўжо кожны на сваёй калёніі пас. Пазней фундаменты зараслі травою, цяпер іх ужо цяжка знайсці.

Навесну 1945 года, калі ўжо немцаў не было, перапахавалі пабітых. Людзі з Пяшчанік парабілі труны, паклалі ў іх па дзве-тры асобы і перавезлі на могілкі ў Каралёвы Мост, дзе і пахавалі іх у супольнай магіле.

Тут жыў адзін такі, жонку з Каралёвага Моста трымаў, якога немцы яшчэ ў сорак другім годзе забралі. Самагонку гнаў і, як убачыў немцаў, хацеў уцякаць. То немцы яго і яшчэ аднаго, „варшавяка”, забралі і пасадзілі. Таго „варшавяка” забілі, а гэтага выпусцілі. Я аднойчы яго спытала, чаму так сталася. А ён адказаў, што яму Бівойна памог... А за

што яму Бівойна памог?! За тое, што ён Бівойну прывёў на Папоўку! Бо ён ужо пасля вайны то ніколі ў Пяшчаніку не паказаўся.

Там былі рускія партызаны, але яны ў сорак другім адышлі — у Белавежу ці куды. Асталіся толькі мясцовыя. З Пяшчанік было трох братоў, ніводнага жонкі не зачапілі. А, што, ён не знаў, дзе іх жонкі ў Пяшчаніках? Напэўна знаў! А такога пастуха, што толькі кароў пасвіў, то з жонкай і аднагадовым дзіцём расстралялі...

**Міранюк Анна, Бялкі:**

З Бялкоў многа ў Германію забралі. Мой швагер солтысам быў, і калі сталі гаварыць, што на прымусовыя работы будуць вывозіць, дык ён паставіў мяне пісьманосцам. Пасля немцы загадалі, каб на дошчачках папісаць хто жыве ў хаце і якога года нараджэння. У нас было пяць асоб і немцы сказалі, што мяне мус браць, бо я дваццаць чацвёртага года нараджэння, а калі мяне не забяруць, дык тады прыдуць і ўсю сям'ю пастраляюць. І хавацца ў лесе не было як, каб не пастралялі.

Заказалі фурманкі і павезлі нас у Беласток, у лагер за калючым дротам. Там нас трымалі чатыры дні, а стражнікі навокал хадзілі каб мы не паўцякалі.

Загналі нас у поезд для кароў, замкнулі і павезлі. Мы плакалі і вішчалі. Хто ўпаў на падлогу таго таптаді. Ужо за граніцаю такі добры немец з'явіўся, які паказваў мне, каб я не ехала далей, але ўцякала. Але я адмовілася, бо баялася, што нашу хату спаляць і заб'юць усю сям'ю.

Завезлі мяне ў Гэндэрсвальд, мястэчка такое як наш Заблудаў. Выгналі нас у горад і загадалі памыцца, бо мы ад плачу ўмазаліся. Прыязджалі па нас, плацілі і забіралі да працы: каго ў фабрыку, каго на гаспадарку. Мяне купілі на гаспадарку.

**Міранюк Ян, Бялкі:**

Спачатку лапанкі былі, з якіх на прымусовыя работы лавілі галоўным чынам мужчын, а пасля сталі браць паводле года нараджэння.

Можна было не ехаць на прымусовыя работы, хапіла няправільна падаць год нараджэння. Я быў з дваццаць пятага года, але падаў немцам, што з дваццаць сёмага. А калі прыйшла чарга ехаць дваццаць сёмаму году, тады я перапісаўся на дваццаць пяты. Не помню, ці былі тады ў нас дакументы.

Немцы запісвалі так, як мы ім гаварылі. Дакументы былі ў Заблудаве, але іх там хіба спалілі і тады як хто сказаў, так таго і пісалі. Але не ўсе метрыкі прапалі, жончына мусіць не: немцы ведалі, што яна з дваццаць чацвёртага года.

Іншыя, каб іх не вывезлі, выязджалі з вёсак.

**Насковіч Рыгор, Кляшчэлі:**

У 1941 годзе немцы з-за Буга наступалі. Абстралялі ваенны гарадок у Кузаве і чыгуначную станцыю ў Чаромсе. Па Кляшчэлях некалькі шрапнеляў пусцілі. Калі нямецкія самалёты пачалі скідаць бомбы, дык рускія афіцэры тлумачылі салдатам, што гэта манеўры. Рэжым пры немцах быў строгі. Пры змроку жандары казалі вокны зацямняць, рускіх баяліся. За парадкам яны назіралі, лодыраў заганялі да працы. У каго вуліца непадмеценая была, дык жандар стукаў у акно і на „арбайт" казаў ісці.

У Кляшчэлях стаяла дзесятая рота, якую, у асноўным, складалі ўласаўцы і пажылыя салдаты. Ахоўвалі яны чыгунку. Вартаўнікамі былі мясцовыя. Іх жандары кантралявалі. Кожныя сто метраў быў пастарунак. Працаўнікам мясцовай адміністрацыі выдавалі талоны на мыла і мяса. Гаспадарам па кусочку мыла Лангэ са сваёй крамы выдаваў. Немцам трэба было пастаўляць назначаную норму малака і мёду. Калі заколеш вепручка, дык другога для іх трэба было здаць. У нямецкім магістраце правацалі камісар, сакратар і аграном.

У 1942 годзе немцы арганізавалі жыдоўскае гета. Тэрыторыю абгарадзілі двухметровым парканам. Калі дом хрысціяніна апынуўся на тэрыторыі гета, дык яго перасялялі ў забудову жыда ў мястэчку, а гэтага — на месца перасяленца. Варту трымалі кругласутачна. Вартаўнікі кожныя дзве гадзіны змяняліся. Зняволеных яўрэяў трымалі ў геце да года часу. Немцы загадалі ўсім здаць золата і долары.

Штодзень пасылалі іх у Чаромху на станцыю на работу. Чацвёркамі ў калоне ішлі пешшу. Затым цягніком ехалі. На чыгунцы працавалі пры пабудове складу апалу і абаротнай чыгуначнай пуці.

Яўрэяў з Нурца і Мілейчыч сагналі ў Кляшчэлі. Усіх пагрузілі ў вагоны і павезлі. Калі гэта было дакладна і куды іх павезлі, гэтага па сённяшні дзень не ведаю.

Пры немцах абавязковай была каменданцкая гадзіна — ад змроку да світання. Каго злапалі жандары на вуліцы ў гэты час, дык на шарварак казалі ісці і заставалялі збіраць каменне. Маглі ў арышт пасадзіць.

**Насута Рыгор, Ціванюкі:**

Немцы, як наступілі, то ўсю нашу вёску, Гушчэвіну, выкінулі пад Заблудаў. Там нам цяжка было і мы з братам перабраліся ў Кухмы, а затым у Ціванюкі; было гэта ў 1941 годзе. Тут на работу да немца патрабавалі, то ў першую чаргу нас, „бежанцаў" з чужых вёсак, высылалі. Першы паехаў мой брат Іван разам з сям'ёй: жонкаю і двума сынамі. І да мяне солтыс прыйшоў і кажа, што калі я не паеду, то мяне

расстраляюць. І я мусіў ехаць. Тут партызаны па балоце хадзілі і каго з імі злавілі, таго разам з сям'ёй расстрэльвалі.

Забралі мяне вясною 1942 года ў Беласток, у арбайтсамт. Там нас у лазню вадзілі, вопратку ў печах дэзінфіцыравалі і пасля тыдня пасадзілі нас у быдлячыя вагоны і павезлі ў Германію. Завезлі ў Гумбінен (сёння Гусеў) і там я папаў на гаспадарку.

**Нікалаюк Кузьма, Піліпкі:**

Праз два ці тры дні прыйшлі немцы, немец прыйшоў у вёску яйкі купляць. Мае суседкі сястра да вайны працавала служанкаю ў Беластоку ў жыдоў, а калі пачалася вайна, яна прыехала ў Піліпкі. Яна ўмела па-жыдоўску гаварыць, і калі той немец ішоў, яна выйшла на вуліцу і да яго загаварыла па-жыдоўску. Тады ён крыкнуў „Юда, юда, юда!", схапіў вінтоўку і ўжо хацеў яе забіць. Тады пазбягаліся людзі і давай яму тлумачыць, што яна не „юда", толькі ў жыдоў служыла і там навучылася іхняй мовы. Ён загадаў ёй сказаць „Отча наш", яна зговарыла і ён тады адчапіўся.

Злавілі мяне, як я самагонку гнаў і зараз па плечах канчуком дастаў. На той дзень, калі мне загадалі з'явіцца, налавіў я рыбы, а ў суседа, катораму я гнаў, узяў карзіну яек. Зайшоў я з гэтым усім раненька, а там ужо той інспектар, каторы мяне злавіў, сядзеў. Я паставіў перад ім яйкі і рыбу, а ён тое схаваў сабе. Мяне пасля не ўкараў, але некаторых пакараў. Людзей там поўная хата назбіралася і перад выхадам паставілі двух жандараў з канчукамі. І тады загадалі выходзіць. Людзі кінуліся ў дзверы так, што я думаў, што тыя дзверы з вушакамі павырываюць!..

Як я гнаў, то партызаны прыходзілі да мяне гарэлку браць. Гэта былі свае хлопцы: з Кожына, з Гукавіч; возьмуць літр ці два і пойдуць. Я ім рыдлёўку даў міны закопваць.

Хадзілі мы ў Гэндзляў садок яблыкі красці; яшчэ да немца мы туды хадзілі. Раз траіх нас сабралася: я, Мякіш і Сяргей такі. Пабралі конскія торбы і пайшлі пад той садок. Чуем: яблыкі сыплюцца. Думаем: Гэндзель тыя яблыкі абтрасае, каб ад немца схаваць, каб кантынгент меншы быў. Гаворым сабе: няхай ён натрасе, а мы пасля зойдзем і забярэм іх. Але каму ісці да яго? Мякіш пасля войска быў, а я з Сяргеем малодшыя былі. Сяргей кажа: „я пайду", а Мякіш: „я астануся і пільнаваць буду; калі што, тады вас асцерагу". Мне выпала ісці з Сяргеем. Сяргей узяў вішнёвы сучок, быццам вінтоўку, а я за ім іду. Падыйшлі мы, Сяргей крыкнуў:

— Стой! Страляць буду!

Адзін з тых, што яблыкі абтрасалі, упаў, і вінтоўка каля яго. Я пытаю:

— Сяргей, а гэта што такое?

Той што ўпаў, мяне пазнаў, падбег і пытае:

— Гэта ты, Кузьма?

— Я, — адказваю.

— Які чорт вас сюды прынёс?

— Штогод ходзім, то і сёння прыйшлі.

— А хто яшчэ з вамі?

— Мякіш яшчэ.

— А дзе ён?

— Вунь там, наглядае.

— Паклічце яго.

Мякіш прыйшоў, а яны кажуць нам:

— Мы вам пакажам, дзе добрыя яблыкі.

І завялі нас пад самое Гэндзлева акно. А Мякіш раней у таго Гэндзля пасвіў і цяпер злякаўся, што гаспадар пазнае яго і немцам удасць. Ужо яму губа трасецца, але нічога не парадзіш, палез ён на яблыню, натрос яблык пад акном. Мы па некалькі яблык укінулі і да дому збіраемся, але адзін з тых, што мы засцігглі, пытае:

— А махорка ў вас ёсць?

У кожнага з нас траіх махорка была, мы яе высыпалі і збіраемся адыходзіць. А той, што з вінтоўкаю быў упаў, пытае:

— Як гэта: іх жывых адпускаць? Я іх жывых не пушчу!

Нам ужо ногі трасуцца, але яго калегі кажуць:

— Няхай ідуць, гэта знаёмыя хлопцы, яны нікому не скажуць пра нас.

Мы прысягнулі, а яны сказалі, што добра яшчэ нам, бо на рускіх не трапілі, а то тыя маглі б і пабіць нас. Мы выйшлі, але баяліся рускіх і пайшлі праз Кнаразы і Зубава дахаты. Селі пад грушаю, грызем тыя яблыкі. Мякіш кажа:

— Калі Гэндзэль учуў, то да мяне могуць немцы прыйсці. Дома спаць не будзем.

Тады я пайшоў у каноплі спаць, адзін з іх у бульбу, а другі ў жыта, бо яшчэ жыта палетак стаяў. Так пераначавалі мы тры ночы.

У Германію з нашай вёскі было вывезеных трынаццаць чалавек. Была якаясь газета, у якой вершык надрукавалі, што ўся вёска, малыя і старыя, п’юць усе.

**Нядзельская Зінаідая, Орля:**

Пасля нямецка-савецкай вайны зноў прыйшлі да нас немцы, гэтым разам на некалькі гадоў. Завялі яны строгі парадак. У мяне была каро-

ва і трэба было мне здаць немцам 400 літраў малака ў год, за якое не плацілі, а толькі далі кілаграм цукру. Можна было браць сыроватку для свіней, якіх нельга было калоць без дазволу. Сярод немцаў траплялі ся і добрыя людзі. Аднойчы прыйшоў да нас немец з курыцай і прасіў зварыць яму булён ды абяцаў заплаціць за паслугу. Я грошай узяць не хацела, тады ён даў мне кавалак мыла. Іншы немец, а называўся ён Рыхтэр і быў старшым рангам афіцэрам, дапамог ахрысціць дзіця маёй сястры Олі. Яна выйшла замуж за Алёшу, савецкага салдата. Калі пачалася вайна, ён пайшоў на фронт, а тут нарадзілася дзіця і не было нават у што апрануць немаўлятка. Немец паспачуваў, калі пабачыў цяжкое матэрыльнае становішча маладой маці. Неўзабаве і Рыхтэра адаслалі на фронт.

У некаторых выпадках горшымі за немцаў аказаліся свае даносчыкі, якія супрацоўнічалі з акупантамі. Гэта з-за іх загінуў у Орлі Гаўрыіл Трафімюк, малады хлопец з Махнатага. Немцы трымалі яго ў будынку каля старой сядзібы гміны. Вартавы дапамог яму ўцячы з будынка, але мясцовыя яго застрэлілі. Казалі, што бракавала некалькі соцень метраў, дзе чакала яго сястра з белым канём. Закапалі яго на месцы і толькі ў сямідзесятых гадах астанкі эксгумавалі на могільнік. На мемарыяльнай дошцы напісалі, што быў ён савецкім партызанам, хаця быў гэта звычайны вясковы хлопец, які камусьці не спадабаўся.

У Міклашах, што каля Орлі, 30 чэрвеня 1944 года немцы сагналі ўсю вёску ў клуню і зачынілі. У арлянскім лесе былі ўжо рускія разведчыкі. Калі настаў вечар, чатырох байцоў падпаўзлі да рэчкі і гучна крыкнулі „ураааааа!” Немцы, якія панічна баяліся савецкіх кацюшаў, так перапалохаліся, што адступіліся ў галадоўскі лес. З таго часу жыхары Міклашоў адзначаюць гэты дзень і штогод даюць на абедню.

Немцы ўжо ў 1941 годзе пачалі перасяляць людзей. Жыхароў хутара Антанова перавялі ў Орлю, на вуліцу Новая шаша (цяпер Свярчэўскага). Усіх яўрэяў выгналі на канец Орлі і аддзялілі гэтую частку мястэчка калючым дротам, ствараючы два гета — меншае і большае. На Кляшчэлеўскай вуліцы паставілі браму, за якую яўрэям нельга было выходзіць. Было так, што некаторыя яўрэйскія майстры працавалі ў Тапчыкалах і калі немцы даведаліся аб гэтым, дык на месцы іх і застрэлілі.

Нашу хатку таксама немец прадаў у Рутку і мы сталі жыць у апусцелым доме яўрэйскага каваля, які знаходзіўся каля рэчкі Арлянкі. Яўрэі жылі ў гета, але вечарам прыходзіў тайком яўрэй Вайштын і хаваў у нас пад падлогай фасолю, сала, усё, што дастаў ад людзей. Тады яўрэі елі ўсё.

На даху Вялікай сінагогі немцы наладзілі назіральны пункт, на якім дзяжурыла дзевяць салдат. Кожнага вечара з паасобнай вуліцы назначаўся патруль, якія меў засцерагаць мястэчка ад партызан. Жыхарам сталі выдаваць нямецкія дакументы. Нямецкім камісарам у Орлі быў Сандэцкі.

У суботу, перад святам іконы Казанскай Божай Маці, калі я змывала падлогу, прыйшоў да нас гаспадар дома, яўрэй Лэйзар і кажа: „Нядзельская, заўтра за намі прыедзе 15 падводаў з саломай, па нашы душачкі. Вы жывіце ў гэтым доме... Можа я вярнуся, тады палову дома запішу вам”. Назаўтра немцы пагрузілі на падводы старэчаў і жанчын з дзецьмі, а астатніх выстраілі ў шарэнгі і ўсіх пагналі на чыгунку ў Бельск. Гэта была іх апошняя дарога. З Траблінкі ніхто ўжо не вярнуўся, усіх спалілі.

**Панасюк Ніна, Старое Беразова:**

Пачалі мы жыць пад нямецкай уладай. Усё трэба было рабіць ад пачатку. Як хто змог, адбудоўвалі мы сваю вёску. У вёсцы ацалела пяць хат і некалькі хлявоў, рэшта пайшла з дымам. Але чаго чалавек не вытрымае! Час раны загоіць. Чалавек, гэта такая істота, што гора яго не задушыць, да ўпадку працаваць будзе і да мэты сваю справу давядзе.

Людзі сталі прывыкаць да нямецкіх парадкаў. Нельга было біць парсюкоў, але людзі іх білі і ў хлявах смалілі. Кантынгент трэба было даваць — абы-як аддавалі. Збожжа хавалі, а перад немцамі плакалі, што не маюць. Цярпелі здзекі, але ведалі, што такое жыццё век не будзе. Час ад часу весяліліся, самагонку гналі, пілі і прадавалі. Жаніліся, хрысцілі дзяцей. Для вока ішлі ў камендатуру па дазвол, а рэшту і так рабілі, хаця тыя дазволы патрэбныя былі на ўсё.

Немцы з кожнага боку душылі людзей. А каб мець дарэмную рабочую сілу, сталі маладых у Нямеччыну забіраць. Я да 1944 года дома была. Не бралі мяне, бо яшчэ васемнаццаці гадоў не мела. 11 сакавіка 1944 года мае васемнаццатыя ўгодкі адзначылі скромным пачастункам. Прыйшоў старэйшы брат Вася, жанаты ён быў. І сястра Насця з мужам, які з Картуз-Бярозы вярнуўся; немцы там усё разбілі, а іх дамоў адпусцілі. Так мы самі свае святкавалі. Успамянулі і аплакалі забітага брата Валодзю.

Новая бяда ў нашу хату заглядае — бяруць мяне ў Нямеччыну. Мужчыны падпілі, рызыкуюць, гавораць, што немцу хутка канец надыдзе. А што каму суджана, ад таго не ўцячы — ці гэта дома, ці ў Нямеччыне. Мама плача, праклінае жыццё і немцаў.

— Не плач, мама, — кажу ёй, — не гаруй. Як будзе шчасце, дадому вярнуся. Маладая я, усё сцярплю.

А ў скрытасці думаю: „А што там будзе? Як між чужымі жыць? Да каго азвацца ў бядзе? Каго параіцца? Як сваю хату пакінуць, сям'ю, сяброў, вёску?" Акрамя вёскі я нідзе не была; ну, у Гайнаўцы была. А тут у чужыя людзі, у невядомы край... Сама сябе паціху настаўляю: трымайся, Ніна! Была я вясёлай дзяўчынай, спяваць любіла, патанцаваць, пажартаваць. Васемнаццаць гадоў раз у жыцці бывае, толькі ў маім жыцці ў кепскую хвіліну гэта выпала. Вайна, смерць брата, пажар вёскі. А цяпер выезд у чужую краіну.

Пад нямецкай акупацыяй час праходзіў вельмі памалу, а можа так здавалася. Надышла вясна 1944 года, але яна мяне мала цікавіла. Я жыла выездам і веснавой красы не заўважала — яна быццам бокам праходзіла, быццам мяне не кранала.

10 мая 1944 г. наступіў дзень майго выезду. З вёскі Старое Беразова забралі тады шэсць дзяўчат і чатырох хлопцаў. Завезлі нас у Бельск фураю і аддалі ў арбайтсамт. Трымаліся мы ўпэўнена; вядома — маладыя, вясёлыя. Не падавалі мы віду, што ў горле душыць, асабліва перад хлопцамі трымалі фасон.

Хлопцаў забралі на наступны дзень, а дзяўчат яшчэ некалькі дзён у Бельску трымалі. Пасля пагрузілі нас у таварныя вагоны і завезлі ва Усходнюю Прусію, у Элк. З Элка завезлі нас у лес, дзе ў шалашах, у зверскіх умовах, трымалі рускіх палонных. Праз дзіркі ў дошках падавалі мы ім хлеб і папяросы. Адтуль пехатою пагналі нас у Йаханесбург (сёння Піш), дзе нас паразбіралі купцы.

**Панфілюк Мікалай, Дубічы-Царкоўныя:**

Было гэта ў час нямецкай акупацыі. Каля вёскі Р. падчас перастрэлкі з паліцаямі быў ранены адзін партызан. Аднак яму і таварышу ўдалося вырвацца з варожага акружэння і схавацца ў бліжэйшай хваіне. Але раненаму была патрэбная медыцынская дапамога і ўрач. Партызаны ведалі, што ў Красным Сяле існуе падпольны партызанскі шпіталь, дзе ёсць урач-асточнік, лякарствы, перавязкі...

Але як туды дабрацца? Пятнаццаць кіламетраў ранены не ў сілах пераадолець. Патрэбная падвода з канём, але ніхто з сялян на гэта дабравольна не згодзіцца па дзвюх прычынах: калі б даведаліся немцы — а ў людзей языкі доўгія — вазакоў чакала б смерць; партызаны таксама забівалі вазакоў, каб не выявілі іхніх падпольных тайнаў.

Адвячоркам партызаны завіталі да аднаго багатага дзядзькі Якава, каб сілай прымусіць яго даць падводу і каня. Але ён быў вельмі хітры

і неўзабаве пасля перастрэлкі, прадчуваючы нечаканых гасцей, схаваўся ў лес. Даведаўшыся, што яго няма дома, партызаны першаму спатканаму на вуліцы беднаму Івану падсунулі пісталет пад нос і загадалі везці туды, дзе сонца схавалася. Іван дрыжачымі рукамі запрог каня ў воз і павёз гасцей палявымі дарожкамі. Праз некалькі гадзін былі ўжо ў Красным Сяле і лёгка знайшлі замаскіраваны „шпіталь” у падвале каля клуні аднаго селяніна. Раненага завялі ў падвал, а Івана мелі ўжо весці ў хмызняк і там з ім „разлічыцца”. Але тут пачуў ён знаёмы голас:

— Дык гэта цябе, Іван, бяда прывяла сюды? А чаму ж гэта не Якаў?

Відаць — партызаны былі намецілі Якава. А Іван пазнаў Рыбака з суседняй вёскі, які хаваўся ад немцаў за сваю даваенную камуністычную дзейнасць, упаў перад ім на калені і давай маліць:

— Памілуйце, адпусціце дамоў, я тайну шпіталя захаваю да смерці...

Давай Рыбак прасіць сваіх сяброў-партызанаў, каб адпусцілі Івана. Маўляў: бедны чалавек, добры, наш, пралетарый... Партызаны пераглянуліся паміж сабою і адпусцілі Івана. Такім чынам Іван цудам вырваўся з кіпцюроў смерці.

Але ў вёсцы Р. усе ведалі пра здарэнне і нехта данёс ужо і немцам. А тыя хутка, на золаку, прыехалі і давай дапытваць Івана каго і куды вёз...

— Ведаем, — сказалі яны, — што рабіў ты гэта не па сваёй волі. Але калі жыццё дарагое, вядзі нас туды, бо інакш за стадолу і бах! З намі няма жартаў...

Іван хуценька апрануўся і выбег на панадворак, а там чакала ўжо яго рота аўтаматчыкаў у чорных мундзірах і жоўтых касках. Ціха, без скаргі, як пакорлівае цяля, бяжыць ён наперад, на захад, на сорам сваёй душы і сэрца. Але што там гонар і годнасць, калі жыццё даражэй усяго. А перамагчы страх няма сілы. Толькі ў кніжках родзяцца несмяротныя героі і подзвігі. Хаця пра апошняе Іван і не думаў, бо ніколі не прачытаў ні адной газеты, ні адной кніжкі. Неадукаваны быў.

Завёў Іван немцаў у Краснае Сяло, пад сам „шпіталь”, а тыя пастралялі пагалоўна ўсіх партызан. Пасля ўчыненага разгрому немцы прагналі Івана, урэзаўшы яшчэ пугою па спіне...

**Паплаўскі Уладзіслаў, Канцавізна:**

Мне сказалі або тут працаваць, або ў Прусію ехаць; тут маёнтак быў Рыншчына — між Рынкамі і Суражам. Працаваць у тым маёнтку стаў у 1942 годзе. Таго маёнтка рускія не чапалі, яго ўласнікам быў Фалькоўскі і немца над ім паставілі. Штодня хадзіў я туды па тры кіламетры, рабіў у полі коньмі; у святы не хадзіў. Харчы з сабою насіў; плаці-

лі раз у тыдзень, мо па столькі, што на пачку папяросаў было. Былі вызначаны гадзіны і трэба было іх адбыць. Былі перапынкі: трыццаць мінут на абед і пятнаццаць на падвячорак. На працу ў сябе часу не аставалася, пакуль зойдзеш, адпрацуеш і вернешся. А калі яшчэ дождж пападае, то слізгаешся па гліне як па лёдзе, не тое што сёння. Коней кармілі па чарзе, па тыдні: збожжа насыплеш на аўсянку, заложыш драбінкай і ўсё. А калі хадзілі на працу, дык коням нічога не давалі; хамут адно накладалі і чакалі, нават калі працы не было. Работу можна было кончыць раней, але тады трэба было браць звальненне і то толькі за хабар. Замоцна нас не ганялі: абы не сядзелі, абы таўчыся.

З Канцавізны было нас траіх, і з Срэдзінскіх мо з чатыры дзяўчыны даходзіла, так як мы, і чатырох парабкаў жыло там у *развалёхах*. Як вянковае на аборы павесілі, то ўсіх нас выстраілі і па бутэльцы піва і па цыгары далі нам усім, далі пароўну — дзяўчатам і хлопцам. Піва выпілі і цыгару скурыў, бо я ўжо курыў.

Людзі гаварылі, што партызаны якіясь у вайну хадзілі, але я іх не бачыў, хіба нейкія тутэйшыя былі. У маёнтку працаваў я да прыходу рускіх. З маёнтка начальства загадзя паўцякала, у нашай вёсцы ніякай бітвы не было. Я астаўся рабіць на сваёй гаспадарцы. Клікалі ў гміну ў войска браць, але я гаварыў, што дакументы згубіў, а год нараджэння такі гаварыў, каб замаладым быць.

**Паравой Юлія, Наройкі:**

Калі наступалі немцы, яны сваіх пецярых разведчыкаў забілі; пахавалі іх каля вёскі і ніхто іх не забраў. Хадзілі партызаны, адны з другімі біліся. І людзей білі. Мужавых чатырнаццацігадовага брата і васемнаццацігадовую сястру забілі. А за што — невядома.

**Петручук Мікалай, Трасцянка:**

У 1942 вызначылі мяне на прымусовыя работы ў Германію. З Трасцянкі было многа моладзі, а ў іх ліку пецярых маіх равеснікаў; многія ўцякалі, але пасля іх і так забралі. Завезлі нас заказнымі фурманкамі ў Міхалова, бо там тады была наша гміна. Трымалі там тры дні ў будзе за дратамі; есці не давалі, хто што з сабою меў, тое і еў. Пасля завезлі нас фурманкамі на станцыю ў Валілах, а адтуль поездам у лагер у Беласток. Там есці нам нічога не давалі — бацькі некаторым прыносілі; пад канец то я ўжо некалькі дзён галадаў.

Пасля трох тыдняў прыйшлі вахтманы, пагналі нас у вагоны-цялятнікі, якімі павезлі ў напрамку Кёнігсберга. Па дарозе наш транспарт

папаў пад бамбёжку і многія тады ўцяклі. Давезлі нас у Тыльзіт, там у пасажырскія вагоны перасадзілі і так прывезлі ў Кёнігсберг.

**Петышук Мікалай, Хлевішчы:**

Вясной 1940 года прыехалі нямецкія салдаты з эскортам нямецкіх пагранічнікаў, адкапалі целы салдат і забралі ў Германію.

А летам 1941 года ўжо без эскорта ўехалі на нашу зямлю, паставілі сваю жандармерыю ў Вярховічах і на станцыі Чаромха, сталі забіраць нашых людзей на прымусовыя работы ў Германію і ў канцлагеры, а многіх пастралялі, як у Вульцы-Тэрахоўскай, дзе асталося шмат удоў і сірот. Людзі жылі ў боязі перад наступным днём, аж да 1944 года...

**Плева Аляксандра, Існок:**

Партызаны неяк прыходзілі. Мы, памятаю, як пачулі, што яны ідуць — хутчэй уцякаць. Зачынілі дзверы, партызаны бегаюць, ліхтарыкамі ў вокны свецяць. А маці кляне іх. Такі страх быў, што я ў другі канец вёскі і не хадзіла. У Вітаве немцы стаялі і прыязджалі да нас, мелі з сабой „перагаворшчыка", які нам перакладаў, што яны хочуць. Вугаль быў вельмі дарагі, таму тапілі дровамі, якія прывозілі з пушчы.

**Плева Сцяпан, Існок:**

Калі настаў немец, то гміны зрабілі ў Беразове і Орлі. Загадалі выбіраць солтысаў, але тых, што былі імі пры Пілсудскім. І яшчэ трэба было назначыць агранома і каменданта варты, але іх, гаварылі, не выбіралі, толькі солтыс назначаў.

Самагонку тады гналі ў белы дзень, насілі бочкі і ніхто не баяўся. Ніхто не ўдаваў немцам, бо немцы гэтым не цікавіліся. А калі каго і засцігді, то нічога супраць не мелі. Прыдзе немец, дадуць яму гарэлкі, і ўсё.

**Пуц Сцяпан, Барысаўка:**

Прайшоў год і немцы сталі набіраць моладзь на работу ў Германію. Солтыс вызначыў, каб адзін з нас, братоў. Восем разоў загадвалі ехаць, а мы не едзем. Аж на дзевяты раз прыслалі бацьку пісьмо, што калі цяпер ніхто з нас не з'явіцца, то вывезуць усю сям'ю. А бацька не можа назначыць ніводнага з нас: бацьку ж кожны палец баліць... І я сам падумаў: брату 19, а мне 17, то я паеду, а брат бацьку памагаць будзе.

І забралі мяне спярша ў Бельск, а пасля павезлі поездам у Кёнігсберг і далей пад Пілаў — у маёнтак.

**Рыдз Кірыла, Шарні:**

У 1941 годзе ажаніўся. Але настала вайна і зноў паралізавала ўсё жыццё. Немцы сагналі арлянскіх жыдоў у гета, там яны ў сталярні рабілі. Пасля жыдоў вывезлі і нас у сталярню назначылі. Грошай не плацілі і я так тры гады працаваў. У царкву не хадзіў, бо нават у святы нельга было адпачываць. Падбадзёрваўся, думаючы пра тых, якіх немцы забралі.

**Саевіч Валянціна, Старое Ляўкова:**

Немцы ў нас нічога кепскага не рабілі; камуністаў не чапалі, бо ніхто іх не выдаваў і яны жылі сабе спакойна, а пасля сталі ў партызанку хадзіць. Але якая гэта была партызанка? Банда была фармальная... Рускіх там мусі і не было, толькі нашы „таварышы”. Яны Харашэўскіх замардавалі; гаварылі, што па палітычных прычынах, але гэта няпраўда, яны іх пабілі за дабро. Увечары мы палягалі спаць, а пасля дзівімся: у акне зарыва, недалёка ад нас. Мы дакладна не ведалі, але дадумоўваліся, што гэта ў Харашэўскіх. Але на другі дзень раненька, яшчэ не развіднела, прыбег да нас Кардаш; ён з бацькам кумамі былі падвойнымі ці нават патройнымі. І ўжо шэпу-шэпу паміж сабою. А мы, дзеці — то ж найлепшыя шпіёны — вушы панастаўлялі і слухаем. Кажа: забілі Харашэўскіх. Пабралі іх дабро, амаль між сабою не пастраляўшыся і закапалі з другога боку рэчкі. Але Бог так дае, каб сведкі асталіся. Хлопчык там быў, можа гадоў яму сем-восем было, ён у печ або пад печ схаваўся, а дзяўчаты пад ложкамі пахаваліся; адной было чатырнаццаць, а другая на год ці два старэйшая была... А сын, той Стасек, што цяпер у Парослым жыве, кавалерам ужо быў і на вячоркі ў Рыбакі пайшоў, і як вярнуўся, то ўжо па ўсім было. І зараз людзі даведаліся, бо то адзін другому зараз дакажа. Але не даходзілі пакрыўджаныя справядлівасці, тыя дзяўчаты па вайне недзе на захад выехалі, і той хлопчык таксама. Пабілі старых і аднаго сына, што хацеў уцячы, сякераю ў плечы адзін зарубаў. Павязалі старым рукі ручнікамі, завялі патэфон, каб ім пайграў... Наклалі горбу папераў у хаце і падпалілі, і як стала гарэць, то той хлопчык выскачыў і пабег да суседзяў, і дзяўчаты за ім.

Тыя партызаны яшчэ былі прыйшлі да Максіма Карпюка, бо хтось ім сказаў, што ён дужа простыняў і ўсяго з самаходаў, што ў Фанасёвай хваіне пастраглі, нанасіў. Яго можа тожа пабілі б, але пабаяліся, бо ў яго жылі выселеныя масеўцы.

Аднойчы іншыя партызаны пастраляліся з немцамі. На другі дзень прыехалі немцы ў Капітаншчыну, зрабілі аблаву і хацелі пастраляць мужчын, бо быццам вёска дапамагала партызанам; было гэта 5 чэрвеня 1942 года. Паставілі ўсіх пад плот і зачыталі прыгавор. А на той час прыехаў з Нараўкі Паўлоўскі, які быў солтысам у Ахрымах і Капітаншчыне, а ў Нараўцы працаваў слесарам і ладзіў машыны немцам; немцы знaлі яго. Злез ён з матора і адразу стаў паміж немцамі і сваімі людзьмі. Немцы здзівіліся, што ён дабравольна ідзе на смерць і спыталі яго чаму ён так робіць. А ён адказаў немцам, што ручаецца за гэтых людзей, што яны нічога дрэннага не зрабілі, і калі будуць страляць іх, то і яго разам. А немцы зналі ж яго і ведалі, што ён парадачны чалавек і тады пагаварылі паміж сабою і рашылі памяняць прыгавор: загадалі аддаць немцам па дзесяць коней, кароў і свіней ды праз дзве гадзіны пакінуць вёску. І выгнаўшы людзей спалілі ўсё. Пазней вывозілі і іншыя навакольныя вёскі; Скупава і Масева вывезлі ўжо раней, Сухадолы і Гуту вывезлі аж за Ружаны.

А мяне вывезлі дзень раней, 4 чэрвеня; было мне тады чатырнаццаць гадоў. Немцы бралі ад шаснаццаці, а я мусіла ў чатырнаццаць. Мела я дома „прыяцельку” — мачаху. Я аднойчы падслухала яе размову з бацькам, калі яна прыгразіла, што калі я далей дома астануся, дык даложыць немцам, што я партызанам у Лядское нашу есці; а за гэта ад немцаў можна было чакаць толькі аднаго — расстрэлу. Яна добра ведала нямецкую мову, бо сама была з Новай Волі і да вайны служыла ў фабрыкантаў у Міхалове, а сын яе быў шафёрам у амтскамісара, а нявестка працавала перагаворшчыцай; уся ўлада была, можна сказаць, у іх руках. То я цэлую ноч не спала, бо ж у чатырнаццаць гадоў сама жыць хочацца! І я пайшла ў Нараўку па аўсвайс, сказала пісару, што я з дваццаць шостага года, а ён не правяраў і выставіў мне той аўсвайс быццам мне шаснаццаць гадоў; чатырнаццацігадовых немцы не бралі. Ну і солтыс, Шпалэк, вызначыў мяне. У Свінарогі ішла я пяшком, толькі возам мой сундучок ехаў, а далей павезлі нас у Гайнаўку машынкай. Там трымалі нас тры дні. Забралі ў чацвер, у пятніцу завялі ў лазню, там мы памыліся, а ў суботу раніцай павезлі ў Бельск і ў нядзелю рана пагрузілі ў поезд і ў панядзелак рана былі мы ўжо ў Тыльзіце ў арбайтсамце. Прыходзілі туды немцы і забіралі нас. Забралі ўжо ўсіх, асталіся толькі я і Мікіткава Надзя, што замужам у Бачынскіх. Прыйшла такая пані ў капелюшы, паглядзела на нас, пасядзела, пачытала кніжку і забрала нас абедзве. Везла поездам да мястэчка такога як Нараўка, Шылен называлася, а там прыехаў брычкаю старэнькі такі немец, забраў Надзю, а я асталася са сваёй немкай; яна ма-

ладая была, некалькі толькі гадоў за мяне старэйшая. Паехалі мы далей аўтобусам, а пасля два кіламетры ішлі пяшком. А мой сундучок нявыгадны несці, бо такі шырокі, то і немка памагала мне яго несці; цяпер я не раз падумаю: то ж хапіла б у якіясь лахі ўвязаць, то наскολькі лягчэй было б... Але ж тады ўсё мусіла быць у сундучку... Прыйшлі мы ў вёску Тыльзенталь зусім пад вечар.

**Сакалоўскі Уладзімір, Сухінічы:**

Пасля немцы зноў прыехалі, адзін з іх, чэх, па-польску сказаў выбраць улады. І зноў людзей сабралі і траіх выбралі. Далі ім белыя павязкі, каб да рукавоў прышылі. Солтыса пазвалі ў Адэльск і наставілі, каб абвясціў у вёсцы новыя загады. Першай справай было пасцягаць падла ды пазавальваць варонкі на дарогах і побач іх. Далей дапытвалі пра камуністаў, што супрацоўнічалі з саветамі; у нашай вёсцы такіх не было і неяк абышлося — нікога не расстралялі і не арыштавалі. А майго бацьку заўсёды клікалі за перакладчыка.

Праз нейкі час немцы запатрабавалі вызначыць маладых, лішніх хлопцаў, якіх можна забраць. З нашай вёскі запатрабавалі шэсць чалавек, але тады забралі ў Германію толькі чатырох. У іх была мабілізацыя і патрэбны былі работнікі. Гэта быў першы тур. Пасля, мо на працягу года, наязджалі і па хатах лавілі людзей для вывазкі. У Сухінічах такое не здарылася, але ў суседніх вёсках. І хлопцы з дзяўчатамі сталі прыхоўвацца. І я ў стадоле хаваўся, а пасля ішоў у вёску, дзе лапанка прайшла.

Мінуў зноў нейкі час і ўсім маладым загадалі з'явіцца на медыцынскую камісію ў Адэльск. Бралі народжаных ад 1921 да 1925 года. Паклікалі ўсіх у касцёл і там выдавалі дакументы. Далі і загадалі чакаць; а касцёл поўны быў. Пасля камісар праз перакладчыка аб'явіў, што ўсе паедуць у Германію, бо там няма каму працаваць; як вайна скончыцца, то хутка ўсе вернуцца назад. Некаторыя спалохаліся.

Падставілі фурманкі і ўсіх нас на фурманкі пасадзілі, па 5-6 чалавек. У Войнаўцы некаторыя паўцякалі. У іншай вёсцы сталі ўцякаць наступныя, некаторых палавілі. Я да апошняй вёскі даехаў і думаю прабаваць таксама. І пры першых хатах уцёк, за мною кінуўся вартаўнік на кані, я быльнікам накрыўся і ён мяне не ўбачыў. І іншыя разбегліся. Калі абоз ад'ехаў, я памаленьку, пакуль сцямнела, прыйшоў дахаты. А хто не ўцёк, таго ў вагоны пагрузілі, а аднаго, што ўцякаў, застрэлілі.

У 1943 годзе, у маі-чэрвені, перад Сёмухай, прыслалі павесткі з'явіцца на выезд усім, народжаным у 1922 годзе. Мы хваляваліся, баялі-

ся, што спаляць або разнясуць сядзібу. З нашай вёскі рашыліся ехаць дваіх. Заехалі ў Адэльск, адтуль у Саколку, а з Саколкі завезлі нас у вагоне ў Гродна.

**Саковіч Глеб, Юшкаў Груд:**

Як прыйшлі саветы, дык у нашу вёску прыехала двух маладых настаўнікаў, кавалераў. Яны заснавалі камсамол і я да таго камсамола запісаўся, хаця бацькі асцерагалі мяне перад гэтым. А зноў, калі з'явіліся немцы, мяне — магчыма, што за той камсамол — вызначылі на прымусовыя работы ў Германію. Сабралі нас, маладых, на зборным пункце ў Беластоку. Калі немцы павыходзілі, адзін кажа: „Не паеду на братоў бомбы рабіць". За ім другі, трэці, і я чацвёрты. І ўцяклі мы цераз драты. Я падаўся да сваячкі, бо знаў, дзе жыла. Яна мяне раніцай вывела за горад і я вярнуўся дадому. Дома пытаюць, чаму я вярнуўся. Я адказаў, што лёгкія хворыя. „Дрэнна ты зрабіў, — сказалі бацькі, — але таго, што было, не вернеш".

Неўзабаве, у нядзелю, пайшоў я ў Міхалова сфатаграфавацца. А ўжо нехта знайшоўся, што пра мяне ў жандармерыю далажыў. Стаімо, чатырох нас, у фатографа, а яго жонка кажа: „Ідзе гестапа з сабакам; у Гарымоўскую пайшоў, абстаўляць". Увайшлі два гестапаўцы ды мяне і Уладка Каліноўскага забралі. А двух другіх пакінулі. Уладка падазравалі ў супрацоўніцтве з партызанамі; калі ягоных брата, жонку і дзяцей вывозілі ў Германію, яны неяк упрасілі, каб і Уладка разам. Пасля, калі іх вызвалілі саветы, ён пайшоў на фронт ваяваць, а пасля вярнуўся дадому.

Мяне ў Міхалове трымалі два дні ў арышце. Маці прынесла мне ежу, і я яе прасіў, каб ішла ў Гарадок да бацюшкі Віхрова. Ён да вайны быў у Юшкавым Грудзе настаяцелем. Маці мая спявала ў царкоўным хоры, а бацька быў старастам і прымушаў мяне быць прыслужнікам. Я вельмі не хацеў служыць, бо калі хлопцы сабе гулялі, мне трэба было быць у царкве. Але схопіць бацька за валаскі, што на скроні — баліць, і мус! Схадзіла маці ў Гарадок, а бацюшка Віхроў, які быў там і настаяцелем, і войтам, сказаў: „Добра, паеду ў Беласток, у гестапа, каб выратаваць яго ад смерці". На другі дзень зноў маці да яго пайшла, каб даведацца. Ад смерці выратаваў, але выпусціць немагчыма, адказаў ён. Пасля вайны энкавэдзісты падхапілі Віхрова так, што ніхто не бачыў і не ведаў, што з ім сталася.

Мяне перавезлі ў беластоцкае гестапа на допыты. Дапытваў следчы Сойка — надта ён у гестапаўцаў стараўся і яго застрэлілі падпольшчыкі. Ён сказаў, што я — бандыт, з партызанамі супрацоўнічаю, і геста-

паўцы на мяне з дубінкамі лупцаваць кінуліся, каб прызнаўся. А я маўчу, бо што скажаш: калі тыя партызаны і прыходзілі, дык калі ім чаго не дасі, дык самі возьмуць. Два месяцы доўжылася тое следства, пасля перавялі мяне на працу ў сталярню. Калі сабралі нас дастатковую колькасць, адправілі ў Майданак. Раней у Майданак не высылалі, толькі расстрэльвалі на месцы.

У Майданак ехалі поездам, 50 чалавек у вагоне. Праехалі хутка, есці далі на дарогу ў Беластоку і адразу ў Любліне. У Майданку капалі равы пад электракабель; гаварылі таксама, што і для жыдоў. Трупы пасля адкопвалі і ў крэматорыю. Труцілі таксама: каробачку з газам цераз комін укідалі, пасля адкрывалі дзверы, і ў крэматорыю.

Раз раніцай пазвалі мяне: „Komm!" І яшчэ аднаго маладога. У лазню вядуць. Выкупаюць і да працы, думаем; і цешымся. А там загадалі нам распрануцца. Стрыгуць на галаве, а пасля ў прамежку. І вядуць далей. Той другі кажа мне: не дамся на эксперыменты. А я маўчу — ідзе з намі капо, асоба ненадзейная. Звяжуць, і што? Прывялі да двух лекараў — адзін жыд, другі паляк. Бачу, што рыхтуюць уколы. Жыд мне на правы семяннік укол зрабіў. А той другі, што са мною быў, круціцца пачаў. Дык немец на яго ўскочыў. А жыд мне з левага боку тады толькі эпідэрму прабіў. Немец кажа яму: калі б гэта паляк зрабіў, забіў бы, але ты жыд, а жыдоў і так за два тыдні выб'ем. І праз пару дзён правы мой семяннік спух, а левы не, бо толькі скура была там пацарапана. Той лекар, жыд кажа мне: калі пражывеш канцлагер, будзеш мець дзяцей. А таму другому кажа: а з цябе ўжо вол. І неўзабаве той другі павесіўся на сваіх кальсонах. А са мною так выйшла, як той жыд сказаў, толькі правы семяннік засох, як гарошына зрабіўся.

А пасля „шпіталя" зноў да работы. Працаваў я ў буфеце СС. З другім хлопцам, варшавякам, рыхтаваліся да ўцёкаў. Выпаў, аднак, снег і цэлы месяц не было мяцеліцы, якая б магла сляды засыпаць. Падчас аднае праверкі знайшлі ў маёй світцы „гураля" — 500 польскіх злотаў. Былі пры гэтым дзве дзяўчыны: Марыся з Міхалова і Оля з Заблудава. Той немец, што грошы знайшоў, нікому пра гэта не сказаў. А вось Марыся сказала загадчыку буфета. Узялі мяне на допыты. Я гавару, што гэта не мая світка, але ж світкі такія давалі толькі тым, што пры немцах працавалі, бо цяплейшыя. Ну і прыгаварылі мяне на 50 дубінак. Да 25-ці ўстаяў на нагах. І крычаць няма як, бо калі крычыш, сабака за нагу хапае; не кусае, толькі цісне зубамі. Апомніўся я на калідоры. Галава ў крыві. „Aufstehen!" — крычаць. А я прытвараюся, што не магу, носам толькі ўкроў, каб вымазацца. Прывялі чатырох „пасякаў", занеслі яны мяне ў шпіталь, але там не прынялі, дык у папраўчы барак;

там порцыя ўдвая меншая — „выканчальня”... А ў мяне не толькі галава, але і шыя чорная. Знаёмыя хлопцы ратавалі мяне, па крышцы хлеба пакідалі. Нацёр я пад рукою, быццам гарачка ў мяне, і так усё-ткі папаў у шпіталь. І я ў тым шпіталі каля двух месяцаў пратрымаўся. Пасля немец заўважыў мяне і да лекара: „А гэты што тут робіць?” — „А ён ужо выздаравеў і заўтра да працы”, — адказаў лекар. Далі мне фурай бочкі вазіць, дэзінфекцыю ў „лятрынах” праводзіць.

Мо з тыдзень працаваў я пры той дэзінфекцыі, і адправілі мяне ў Нацвайлер, у Францыі, у Эльзасе, там фабрыка пад зямлёю была. Стаіш на гары, а ўнізе хмары і рака Рэйн. Спалі як сабакі, пад збітымі дошкамі. У міжгор’і спякота ў сонцы; калі прыходзілася ўдзень спаць, цяжка было вытрымаць. Працаваў я там сталяром: перагарадзілі тунель дошкамі, вентыляцыю рабіць, бо вада пад фабрыку падходзіла.

Стаў я раз каля выхаду, бо выходзіць з тунеля нельга было, каб крыху свежага паветра ўлавіць. Прыкмеціў мяне адзін, і мяшок цэменту мне на плечы ўзваліў. А я, слабы быў, і ўпаў. Завялі мяне ў маё каманда, а там аднаго не хапае. І капо мяне дубінкай. Я адхіліўся, а ён мне канцом дубінкі кусок брыва вырваў. Але адрасло, хаця след яшчэ і цяпер відаць.

Перад наступаючымі амерыканцамі вывезлі нас у Бухенвальд, у каманда Дора, на работу. Там выбіралі на шыбеніцы. Штовечар 40 вяровак і 40 людзей. Спярша інтэлігенцыю, паводле дакументаў, пасля глядзелі толькі на рукі, а нарэшце — кожнага дзесятага: „Zehn!” і выходзі. Сем комінаў там было, адзін для ксяндзоў.

У Эльрых капцаваў бульбу. І адтуль пачалі нас вывозіць. Першы транспарт атрымаў па буханцы хлеба і кавалку маргарыну на дваіх. Ад’ехаў першы поезд. Мяне пасадзілі ў другі; нам ужо нічога не далі. Хворых санітары ўкідалі ў возера. Ехалі пяць сутак. Тыдзень правялі ў Мітэльбаў.

У Берген-Бельзен камендант выдаваў пропускі, каб на вёску выйсці. Я таксама атрымаў той пропуск; ідзем ушасцярых. А ў варотах хіба венгры стаялі. Штосьці крычаць, я не разумею. Дык адзін з іх мне прыкладам у грудзі! Упаў. Сябры кінуліся ратаваць. Аддыхаўся. За той час змяніліся вартаўнікі. Мы зноў да выхаду; новы вартаўнік махнуў нам рукою і мы выйшлі. І ўжо не вярнуліся.

Адышлі з 15 кіламетраў, затрымаліся ў вёсцы і там нас бабы паразбіралі; на сенакосы. Мяне і яшчэ аднаго, з Жэдні ён, маладая немка ўзяла. Бацька яе на фронце загінуў, а дома асталася яна з малодшай сястрою і трыма брацікамі; найстарэйшаму 12 гадоў было. Аднойчы

чытае яна газету, а там пра ліквідацыю лагера ў Эльрых было. „І ты там быў?” — паглядзела яна на мяне. Адзін паляк намаўляў мяне, каб я з тою немкай жаніўся; нябрыдкая яна была, і прасіла, каб аставаўся. А зноў другія гавораць: „А дома то што — сваіх дзяўчат няма; як памрэш, то і на магілу ніхто не прыйдзе”.

Былі мы там тры тыдні. Мая гаспадыня дала мне на дарогу крыху марак. Прайшлі з дзесяць кіламетраў, да Эльбы; цераз Эльбу немец лодкай перавёз, і яшчэ з восем кіламетраў да чыгункі ішлі. Днём ехалі ў вагонах, але нанач рускія выганялі. Дык мы на вагоны ўлазілі і так ехалі далей. Чыгуначнікі гаварылі, калі злазіць з вагонаў, каб за мост не зачапіцца. Пазней ужо нармальна ехалі. Прыехаў я ў Валілы, а адтуль пяшком. УЦіванюках спаткаў знаёмага — быў перакананы, што я ўжо не вярнуся.

Бацькі прыказвалі: нічога на нікога не гавары. А што ж я буду гаварыць?..

**Сац Марыя, Чаромха-Станцыя:**

З нямецкай акупацыі запамятала такое здарэнне. Немцы паслалі нас у Высокае вуліцы з руінаў ачышчаць. Нехта з нашай групы шмат золата выкапаў (пэўна з пасляжыдоўскай хаты засталося). Золата немцам аддалі. Баяліся, каб нас не пакаралі за зладзейства. Каштоўнасці немцы сабе забралі. Солтысу загадалі, каб кожнаму з нашай групы па 5 кг цукру выдаў. У 1944 г. на работу ў Нямеччыну забралі. Як рускія вызвалілі, дык на японскі фронт паслалі. Дамоў шчасліва вярнулася.

**Свіцкі Яўген, Ячна:**

Немцы ўсе маёнткі забралі і людзей на работу ганялі. У Дуброве немца застрэлілі, то ўсю Дуброву спалілі, толькі лазня і клуб асталіся.

Калоць нельга было. Пасля, калі хто норму мяса здаў, то можна было ў Дуброву ў бойню везці, там мясар пячаткай штэмпляваў. Кармілі патаемна, у гумнах, і калолі. Хадзіў немец па хлявах і свіней глядзеў. Прыйшоў раз — свінню вялікую ўбачыў, прыйшоў другі раз — свінні няма. Дзе? — пытае гаспадара. Аддаў, немцу на станцыю завёз. Гарэлку гналі.

У астатні час нам, беларусам, немец брашуркі даваў: беларускую армію арганізаваць. Але ў нас нічога ім не ўдалося сарганізаваць. Некаторыя палякі ў нямецкую міліцыю ішлі. Пазней, як немцаў рушылі, то на чыгунку ў лес ганялі вартаваць — па трыста метраў адзін ад аднаго. Спярша нічога не было, а пасля будкі паставілі, каб схавацца. Паяўляліся партызаны, каля Саннікаў за Новым Дваром поезд выкале-

ілі, але нікога за гэта не пакаралі. У 1943 годзе ўвялі камендан цкую гадзіну. І застрэлілі некалькіх чалавек.

Як рускія сталі прыбліжацца, то ўкраінцы сталі ехаць; ад іх нічога нельга было схаваць. Аднойчы нашы закалолі паршука ў полі, прывезлі і схавалі. Мама кішкі чысціла. І немцы ў нас спыніліся. На панадворку пеўні хадзілі, злапалі яны два і пытаюць, колькі плаціць, але тата махнуў рукою.

**Секаноўскі Барыс, Барысаўка:**

Немцы арганізавалі гміну ў Нарве, там камісар быў. 10 верасня 1941 года забралі мяне ў Германію; солтыс вызначаў з тых хатаў, у якіх было па двух сыноў. Я паехаў заміж старэйшага брата, бо быў большы ростам; пасля паўтара года забралі і яго. Пасля яўкі ў Нарву завезлі нас фурманкамі ў Беласток, там зрабілі медыцынскі агляд з прасвятленнем; аднаго з Гарадзіска не прынялі, бо нешта ў лёгкіх пабачылі. У Беластоку трымалі нас два дні, начавалі ў жыдоўскіх хатах, а рана ў Чырвоны касцёл загналі — там цэлы дзень сядзелі, адзін нават адтуль уцёк, — з касцёла перагналі нас у школу каля станцыі і адтуль у поезд.

Завезлі нас у Зольдаў (Дзялдова), капаць бульбу ў маёнтку. Мы, шэсцьдзесят чалавек, капалі матычкамі, а дваццаць французаў капалі капалкамі. Пасля нас перавезлі ў Мальбарк да цукровых буракоў, якія выворвалі спецыяльнымі плугамі. Мы абівалі іх і ў капцы збіралі, пасля ў адвалы і на канец у цукроўню вазілі. З адвалаў замерзлыя буракі выбівалі кіркамі, ад марозу рукі трэскалі: пачнеш біць — юха ідзе, але пасля не чулі болю.

У студзені перавезлі нас у арбайтсамт у Ольштын і там па нас гаспадары прыходзілі. Мяне ніхто не хацеў браць, бо я яшчэ араць не ўмеў і калі ўжо я адзін астаўся, забраў мяне немец, у якога ўжо быў адзін хлапец з Барысаўкі, свайму суседу. Тры гады я быў у свайго гаспадара: араў, баранаваў, вазіў.

**Семянюк Уладзімір, Козлікі:**

У той час мы жылі на калёніі. Немцы часта прыходзілі да нас, выганялі ўсіх з хаты, перашуквалі ўсе будынкі. Чаму? Яны лічылі, што на калёніі перахоўваюць „бандытаў”, значыцца, партызан і яўрэяў. Аднак, гэта не была праўда, бо ўсе замоцна баяліся.

Аднойчы зімовым вечарам нехта загрукаў у акно. „Хто там?” — запытаў бацька. „Дайце вады, хлеба!” — пачуўся мужчынскі голас. „Няма, жонка вечарам расчыніла”. — „То дай вады, куме”. — „Я вам не

кум, — адказаў бацька, — а на дварэ стаіць калодзеж, можаце самі напіцца, вады не пашкадую”.

Як добра, што бацька адказаў у такі спосаб. Потым аказалася, што гэта былі немцы, якія хацелі выявіць памочнікаў партызан. Наш сусед зрабіў інакш. Забралі яго ў Кленікі. Потым ніхто яго не мог пазнаць, бо моцна яго пабілі.

Найглыбей у маю памяць запаў дзень, калі да бацькі прыйшоў яўрэй з дачкой з Бельска. Думаю, што бацька добра яго ведаў. Накарміў іх, але пераначаваць пабаяўся. Я чуў як яўрэй гаварыў: „Іван, перахавай маю дачку. Не мяне. Перахавай, не скрыўджу я цябе, ні тваіх дзяцей. Адплачуся. Прашу цябе”. Бацька не згадзіўся. Не мог згадзіцца, бо калі б немцы знайшлі дзяўчыну, ніхто з нас не пражыў бы.

У вайну ў Козлікі часта прыходзілі яўрэі. Прасілі жыхароў перавезці іх на другі бок ракі. Тады Нарва разлівалася на 2-3 кіламетры і не было магчымасці самому перапраўіцца на другі бераг.

Дзіўныя ў той час былі людзі, а, можа, і такія як сёння. Адны былі добрыя, другія — нелюдзі. Нямала было гэтых другіх. Бывала, прыйдзе да такога ноччу яўрэй і скажа: „Перавязі на другую старану. Заплачу”. Выплывуць яны на сярэдзіну ракі, перавозчык возьме вясло, адзін ці два разы ўдарыць у галаву пасажыра, абкрадзе з усяго і ўкіне непрытомнага яўрэя ў ваду. Часам, калі сядзелі мы над ракой, бачылі як выплывае труп. Аднак і былі такія, што задарам перавозілі.

Калісь людзі звозілі сена возам-жалезняком. На сонцы такі воз рассыхаўся і трэба было яго ўвапхнуць у раку, каб набрыняў. Памятаю тое лета, калі мне было 10 гадоў. Адзін з суседзяў папрасіў мяне і яшчэ некалькіх хлопцаў памагчы выцягнуць воз. Пхаем і пхаем, не ідзе. „Які чорт? — гаворыць гаспадар. — Мацней, хлопцы, што вы, не елі?” Дык мы і мацней. Удалося. Але тое, што мы тады ўбачылі, да смерці не забудзем. Колы воза блакіравалі чалавечыя ногі, а труп быў шчыльна аблеплены ракамі: на твары, руках, нагах, усюды! Гаспадар хутка адчапіў труп, пусціў яго з цячэннем ракі, а нам забараніў расказваць пра гэта.

Тады ў Нарве з’явілася многа ракаў. Вечарам на беразе ў пяць мінут можна было назбіраць іх поўны кошык.

Так выглядалі гады вайны. Цяжка было жыць, баяліся людзі. Адны жылі так як трэба, займаліся сваімі справамі, а іншыя — не. Хтось калісь сказаў, што вайна выклікае ўсё найгоршае ў чалавеку: зайздрасць, нянавісць... Адны здаваліся, іншыя былі вернымі сваім прынцыпам. Так выглядала тадышняе жыццё.

**Сідарук Уладзімір, Кузава:**

Нядзеля, 14 студзеня, праваслаўны Новы год. Сяджу адзінока. Раздумваю, гартаю сямейны альбом са здымкамі. Вось пажаўцелая фатаграфія, а на ёй старэнькая хатка з саламянай страхою, плеценая агароджа. Гэта дом, у якім я нарадзіўся і перажываў жудасную трагедыю. У гэтым доміку савецкія партызаны з дэсанта „Дальнія" пабілі жандараў. Дом немцы зруйнавалі, а бацьку ў канцлагер забралі. Мы адны з бабулькай заставаліся. Маці, цяжка параненая, маленькага сыночка да грудзей туліла. Здавалася, што для нас свет канчаўся. Аднавяскоўцы адкінуліся. Толькі сваячцы, Верцы, немцы дазволілі даглядаць хворую маці ды нам ежу прыносіць. Дом апынуўся пад наглядам. Кузаўскія падросткі варту трымалі як удзень, так і ноччу. Трагедыя здарылася 4 лютага 1944 года. Бацькоў даўно няма ў жывых. Раней з гэтага свету адышлі.

Часта вяртаюся да мінулага. Вось нядаўна нагода для ўспамінаў была, калі ў Палічнай наведаў я сям'ю Аляксея Вілюка. Ягоная жонка з Кузавы выводзіцца і з'яўляецца хроснай дачкою маёй матулі. Добра памятае акупацыю. Будынкі нашы межавалі з сабою. Вось як яна ўспамінае гэтае здарэнне:

— Бацька наш на работу збіраўся, — пачынае Яўгенія Вілюк. — Да раніцы набліжалася, за акном яшчэ поцемкі былі. Ніводнага агеньчыка не відаць у суседніх забудовах. Навокал цішыня царыла. Калі бацька адыходзіў, матуля корпалася на кухні пры снеданні. Раптам пачуўся выстрал. Адзін, другі... Матуля загаласіла: „Бацьку забілі". Але ніхто з нашых не адважыўся нос на панадворак сунуць. Чакалі світання. З надыходам ранка мы ўбачылі, як на наш панадворак жандары заходзяць. На шынелі кагосьці нясуць. „Пэўна бацьку нашага", — мільганула думка ў маёй галаве. Але быў гэта жандар. Пузаты ды здаровы як вепручок. Палажылі яго на ложак. Моцна крывавіў. Памятаю, што ўсё паўтараў: „фарфлюхтэн донервэтэр... капут... капут", затым паказваў на мундзір, які калегі ягоныя палажылі на ложку. Я зразумела, што хоча, каб яму падаць. Калі я тое зрабіла, пачаў шарыць па кішэнях. Нічога не знайшоўшы, зноў гарланіў свае „фарфлюхтэн донервэтэр..."

Жандары, пакідаючы параненага, загадалі мне паведаміць кагосьці з вашых сваякоў. Я пабегла да цёткі Зоські, што пры царкве жыла. Пазней бачыла, як Верка Фралова заходзіла ў вашу хату.

— Ты пэўна не памятаеш таго, — спыніўшы расказ адазвалася гаспадыня.

— Мне тады пяты годзік пайшоў, — кажу, — але добра памятаю, што бацькі расказвалі. Дасканала запамятаў усю падзею.

**Стома Ян, Альхоўка:**

Як прыйшоў немец, то нашу вёску спаліў, усё пустое было, а нас вывезлі ў Фальваркі, а адтуль хто куды хацеў. То мы ў Новай Волі былі. Там адна гаспадыня мела каня, і я стаў крыху рабіць. Яе чалавека бомба разарвала, а яна на Спаса яблыкі рвала і ўпала, і таксама без ног стала. Пачаў мяне немец на шашу ў Гарадок ганяць, каменне вазіць. Людзі кажуць каб у іх авечак пасвіць, а не ў Гарадок хадзіць. Гаспадыня кажа: як не хочаш зямлі рабіць, то выходзь з хаты, то другі хто прыйдзе. Я знайшоў сабе хатку, перабраўся і стаў тых авечак пасвіць. Кошыкі плёў. Раз так авечкі ходзяць, а я зайшоў у карчы хлюбы вырэзваць. Бачу: там ляжыць у валёнках адзін, там другі... Партызаны! Я памаленьку назад, не аказваўся, бо ж бяда; за авечак хутчэй і ходу! А яны ў тых карчах перасушваліся. А як ужо фронт наступаў, немцы ў савецкае адзенне перабраліся, прыйшлі да мяне і кажуць, што фронт падыходзіць. І, што я адкажу, чакаюць. А я кажу, што мне ўсё роўна — усё спаленае, пасу авечак, кусок хлеба зарабляю і мне добра будзе. А яны, што яны партызаны. А я, што мяне партызаны не цікавяць; я сабе кошыкі плёў, а ім нічога не плёў. І пайшлі яны да солтыса і кажуць яму: але пастух ваш цваны, нічога не выссалі ад яго. Немцы, калі адыходзілі, брук зааралі, каб саветы так хутка іх не перлі.

**Стэльмашук Пятро, Вулька-Тэрахоўская:**

Два разы прысылалі павестку, каб у Нямеччыну збірацца. За першым разам на фурманцы ў Вярховічы завезлі. Пасля пехатою ў Высокае ішлі. За намі не наглядалі. Я тады і шмыргануў набок з двума калегамі. Два тыдні хаваўся. Калі бацьку другую павестку прыслалі, рашыўся ставіцца на прызыўны пункт.

Гэтым разам калону немцы з сабакамі з абодвух бакоў абставілі. На станцыі пагрузілі нас у таварныя вагоны і адправілі ва Усходнюю Прусію. Было гэта ў 1942 годзе.

**Сушч Вера, Орля:**

Пры саветах, 23 кастрычніка 1940 года, пайшла я на чатырохмесячныя бухгалтарскія курсы, пасля якіх стала на працу ў Надлясніцтве Чало каля Белавежы. Жыла я там у леснічоўцы і працавала да прыходу немцаў.Немцы адразу арыштавалі бацьку і, відаць, забілі. Два тыдні пазней, у ліпені 1941 года, вывезлі нас у вёску Лінова, у 12 кіламетрах за Пружанамі, каля станцыі Аранчыцы. Тады з Белавежы высялілі многа сем'яў. Памятаю, як на адну фурманку грузілі па дзве сям'і

і везлі ў невядомае. Нас прызначылі да сялянскай сям'і. Гаспадыня называлася Маруся і было ў яе двух сыноў. Мы жылі ў каморы. Мама і сястра Валя працавалі ў полі, а я шыла паліто для дзяцей гаспадыні.

Нягледзячы на забарону, мы з сястрой Валяй рашыліся наведаць Белавежу і Орлю. Пайшлі мы пешшу і ўзялі з сабою сяброўку Ядзю, каталічку з Пазнаншчыны. Па дарозе сустрэлі нас немцы, але Ядзя, якая ведала нямецкую мову, абманула іх і яны прапусцілі нас далей. Каля Пружан зрабілі мы адпачынак і затым пайшлі далей. Адну ноч пераначаваў нас Мікалай Улезла з Белага Ляска, які раней быў начальнікам надлясніцтва, у якім я працавала. Потым мы пайшлі лесам аж да Белавежы. Каля свайго дома адкапалі мы схаванае сала, пад'елі крыху і пайшлі шашою ў Гайнаўку. Там пераначавалі ў дзядзькі і пайшлі ў Орлю. На месцы расказалі мы дзеду Якубу, куды вывезлі нас немцы. Дзед неадкладна падаўся ў Бельск аформіць пропуск, а мы той самай дарогай вярнуліся ў Лінова. Неўзабаве дзед прыехаў фурманкай і забраў нас у Орлю.

Замуж за Мікіту выйшла я 17 мая 1942 года. Тады немцы высылалі моладзь на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Сястру Валю забралі, а мяне, замужнюю, пакінулі. Спачатку жылі мы ў Качэлюка ў Вульцы, потым па вуліцы Пасвентнай у Орлі. Памятаю як у 1943 годзе, на свята Іконы Казанскай Божай Маці, немцы вывозілі арлянскіх яўрэяў. Ніхто з іх не вярнуўся.

**Таранта Назар, Вулька:**

Падчас акупацыі ў кафлярні ў Орлі стаялі нямецкія салдаты. Акупацыйная адміністрацыя наглядала за свінагадоўляй і селянін не мог закалоць вепрука без ейнага дазволу. Даводзілася скрываць лік свіней, каб потым нелегальна паесці свінога мяса. Аднойчы здарылася так, што нашы свінні, а было іх больш за дазволены лік, дайшлі да Парцава і там узрылі збожжа на полі солтыса Дзенісюка, які аб гэтым далажыў немцам. Неадкладна прыехаў да нас немец Голь, які ведаў рускую мову, і паведаміў, што заўтра ў мяне будзе праведзены вобыск (гэта быў якісьці людскі чалавек, калі папярэдзіў аб небяспецы). Я са шваграм, Сяргеем Троцам, загналі тых свінней за вёску, павязалі іх і схавалі ў збожжа. На другі дзень зрабілі ў мяне вобыск, але нічога не знайшлі. Назаўтра ўзялі мяне босага і ў адной кашулі на камісарыят і сталі дапытваць. Білі гумавай дубінкай да непрытомнасці. Ад гэтага ўсяго страціў я нервы, у галаве стала безупынна шумець. Некалькі месяцаў выходзіў я раніцай з дому, клаў галаву на расу і толькі тады адчуваў палёгку.

**Тарасевіч Міхал, Гайнаўка:**

Як мне расказала мама, калі насталі ў нас немцы, яны адразу — 22 верасня 1941 года — прыехалі ў нашу вёску. Усіх сагналі на адзін панадворак і загадалі мужчынам легчы тварамі ўніз, а жанчын з дзецьмі заперлі ў хату. Самыя яны шукалі ў Пасеках партызан і ўзбраення. Нічога яны не знайшлі і, вызваліўшы жанчын і мужчын, загадалі праз гадзіну забраць хто што можа і пакінуць вёску, якую яны рашылі спаліць. І калі людзі пакідалі той панадворак, двух немцаў стаяла ў варотах з дубінкамі і білі імі выходзячых.

Везлі нас пад канвоем, а куды — мы не ведалі. Ехала нас мо з дваццаць фурманак. Калі мы праязджалі каля Лукі, бацька прасіў немцаў, каб дазволілі астацца, але яны не згадзіліся і загналі нас у вёску Бахуры. Пасялілі нас там па чатыры сям'і ў адной хаце; мы жылі на паваpоце да капліцы — яшчэ тая хата там стаіць. Цяжка было ўсім, але гаспадар баяўся нас адправіць. Неўзабаве прыехалі зноў немцы і сказалі, што можна раз'язджацца да сваіх блізкіх.

Наша сям'я пераехала ў Семяноўку да татавага шваграа. У іх не было дзяцей, а хата вялікая — у адной яе палове размяшчалася школа. Пасля дзядзька прыняў яшчэ аднаго знаёмага і нам стала цесна. Тады тата з дзядзькам з нейкага хлява паставілі на дзядзькавым панадворку хацінку, у якой мы жылі да вызвалення. Помню ўжо добра, як прыходзілі да нас партызаны і нечага шукалі. А мы баяліся, бо ў Семяноўцы жылі таксама немцы, якія ахоўвалі мост на Нарве, праз які пралягала чыгуначная лінія з Гайнаўкі ў Свіслач.

**Трахімчук Уладзімір, Дзернякова:**

Як немцы наступалі, то хутка, бо рускія разбітыя былі. Салдаты не ведалі дзе дзецца, сувязі не было. Частка ў гаспадароў асталася, а пасля немец усіх пазабіраў. Немцы дэсант на самалётах вазілі, самалёт прызямляўся ў полі і немцы выходзілі. Нашай вёскі не бамбілі, але бамбілі Гарадок.

Палонных па шашы гналі, гналі табуном, як кароў. Каторы палонны абуты, а каторы босы. Як хто вады з калюжыны хацеў папіць, то немец — пстрык, і ўсё.

Хадзілі партызаны. Усе жыхары вёскі мусілі хадзіць на чыгунку, вартаваць адрэзкі. Калі хто адрэзка не дапільнаваў і поезд узарваўся, то расстрэл. Таму і партызаны дзейнічалі стрымана.

Быў сакавік 1942, а мо і 1943 года. Эшалонам на фронт ехалі эсэсаўскія спецыялісты. І той поезд узарвалі каля Дзернякова. Прымаразак тады быў, мала снегу. У вагонах печкі гарэлі і многія немцы папалілі-

ся. Вагоны пакруціла, страшавіска было. У вёсцы думалі, што ўжо Дзернякова не будзе. Ад нас многа было чыгуначнікаў, усіх іх у бункер сагналі і мелі расстраляць. Але пусцілі сабаку, а той следу ў вёску не знайшоў, толькі ў другі бок. І так вёска ацалела.

**Трахімчык Ян, Гарадок:**

Як настаў немец, то я на чыгунку пайшоў, дахі на будынках бляхаю крыў. Пасля, у 1942 годзе, гестапа арыштавала мяне за супрацоўніцтва з партызанамі, бо памагалі ім як далі рады. З Гарадоцкай гміны мо з пяцьдзесят чалавек арыштавалі. Спярша сядзеў я шэсць месяцаў у беластоцкай турме, а навесну 1943 года выклікалі нас быццам на вольныя работы і ў Штутгаф вывезлі. Там білі і голад быў, многія паўміралі.

У Штутгафе я таксама дахі крыў, бо лагер разбудоўвалі; там усім месца хапіла б. Выкопвалі сосны і з карэннем выцягалі. На іх месца чорную зямлю навозілі і агароды з кветкамі засаджвалі.

Далі нам лагернае адзенне з крыжам на плечах і штотыдзень выстрыгалі нам паласу на галаве. Кармілі супам з бручкі — „вада і руда”. Галавы нам як цэбры папухлі; хто загартаваўся, той пражыў. Калі хто памрэ на рабоце, таго вяроўкаю зачэпяць і цягнуць, бо несці не далі рады. Кожны чацвер чыталі прыгаворы, якія давала гестапа; а за што — не ведалі. І вешалі: стол падстаўлялі, стаўлялі на стол, закладалі пятлю... А кругом вышкі, кулямёты, не павернешся.

Нашы блёкавымі былі, горш ад немцаў катавалі. Такі Казёл быў — ударыць локцем раз-другі і канец. А немцы задаволены былі, бо нашы паказвалі, што ўмеюць...

З Штутгафа нас у Эльбланг вывезлі, але там мы нядоўга былі, мо з два тыдні. Калі рускі танк паявіўся, немцы нас назад у Штутгаф вярнулі, там пабылі яшчэ тры-чатыры дні і нас далей у калоне пагналі. Там людзі падалі, бо кухня не ішла. І сабакі людзей цягалі, бо пратаць не было каму. Загналі нас у Вейгерова ў турму. Там пару дзён былі і гестапаўцы нас кінулі і паўцякалі. Мы вывалілі дзверы, але хто толькі галаву высадзіць, той і прапаў; набілі многа. Прыйшоў немец з Вермахта і сказаў, каб не высоўвацца, а чакаць вызвалення рускімі. Пасля нямецкіх камуністаў, што разам з намі былі, вывелі і пастралялі, а нас заперлі ў турму і мелі ўзарваць. Сядзімо, ціха. Чуем гул — гэта нас узрываць будуць... А гэта рускі танк брамуываліў. Сталі з радасці выбягаць і зноў многа людзей у тлуме падушылася. Пяць кароў забітых для войска ляжала, то хто ўхапіў мяса, той і паміраў. Колькі там трупаў было!

Вызвалілі нас 13 сакавіка 1945 года. Саветы нас не бралі і нас пецярых у хатку зайшлі. Былі рускі інжынер з Масквы, польскі афіцэр з Гданьска, чэх, рускі доктар Ільін і я. Ільін кашу зварыў, але нам толькі па лыжачцы даў. А мы б усё з'елі! Ён пачакае некалькі мінут і зноў нам па лыжачцы дасць.

Прыехалі лётчыкі і да нас:

— Хто вы?

— Вязні.

— Пайшлі з намі!

Завезлі нас у другі будынак, па вуліцы Дварцовай 8. Забілі парсюка, мы абед зварылі. Яны гарэлку паставілі, але мы не пілі, пільнаваліся.

Пасля нас на каранцін узялі; там мы дзесяць дзён былі. Прыйшоў падпалкоўнік і пытае, што мы думаем далей рабіць. Мы адказваем, што дахаты хочам. А ён — што яшчэ Чэхія і Японія не вызвалены і прапануе нам, каб ахвотнікамі ішлі. Мы маўчымо, а ён кажа: „Молчание — знак согласия!"

Пайшлі ў лазню, далі нам вайсковую вопратку, ружжо, і на фронт!

— Ну, — думаем, — не прапалі тут, то там прападзем.

І мы рыхтаваліся, але ноччу прыбегла камсамолка і крыкнула:

— Ура! Амерыканцы бомбу бросілі і японцы капітуліравалі.

Пасля мы міны ліквідавалі і прачоскі рабілі. Немцаў і ўкраінцаў лавілі. Немцы мелі жалезныя петлі з ручкаю, закіне такую на шыю, зацягне і задушыць. А ўкраінцы яшчэ горшыя ад немцаў былі.

Здэмабілізавалі мяне ў снежні 1945 года.

**Федарук Васіль і Аляксандр, Вітава:**

З нашых людзей мала хто ў партызаны пайшоў. Немцы недалёка ад вёскі стаялі. Там быў спецыяльны бункер для аховы жалезнай дарогі. Нашы людзі гналі для тых салдатаў самагонку з жыта. Немцы вельмі яе любілі, асабліва пяршак. Тыя немцы заўсёды нас папярэджвалі, калі жандармерыя збіраецца ў вёску прыехаць, каб самагонку хавалі і свіней не каголі. А жандары тыя то ўжо страшныя былі. Прымушалі мужчын па чарзе хадзіць чыгунку вартаваць. Адзін мужык напіўся здорава ды і праспаў сваю чаргу. Прыехалі на другі дзень жандары, пастроілі ўсіх мужчын і пастанавілі кожнага сёмага расстраляць. Тут бабы паднялі плач, крык, пападалі ўсе на калені. Начальнік жандармерыі тады адступіў, але сказаў, што калі такое паўторыцца, то ўсю вёску панішчыць. А той мужчына праз месяц ад таго перапалоху памёр.

Партызаны таксама часта ў вёску прыходзілі. Былі яны амаль усе рускія. Бывала так, што толькі немцы з сяла выйдуць, а тут ужо пар-

тызаны заходзяць. Але тыя партызаны на нямецкіх салдат, што ў бункеры сядзелі, не нападалі, бо шкадавалі вёску. Яе немцы тады б адразу спалілі.

Былі ў нас і акаўцы. Пасля вайны яны спалілі некалькі вёсак. У нас у Вітаве расстралялі яны 2 чалавек. Хадзілі яны ў савецкай форме і гаварылі па-руску. Таму людзі іх за савецкіх салдат прымалі. А паліцыя тых акаўцаў нават і не лавіла. Людзі ў вёсцы зброі сваёй не мелі каб бараніцца. Спачатку немцы загадалі ўсю зброю здаць, а потым саветы. А сяло было памешанае, таксама і палякі жылі. Таму давяраць нікому нельга было. Людзі баяліся, што могуць прадаць, і здавалі зброю. А было яе шмат. На мяне яшчэ пры паляках данеслі, што маю ў хаце карабін. Прыйшлі паліцыянты, абшукалі ўсё, але не знайшлі. А я іх гарэлкай пачаставаў. Выпілі, закусілі, ды і пайшлі. А я з таго карабіна дзікоў біў, коз. У часе вайны знайшлі мы наган, дык адзін раз таксама з таго нагана дзіка забіў.

**Федарук Марыя, Райск:**

16 чэрвеня 1942 года ў Райску немцы расстралялі 149 асоб. Забівалі паводле прынцыпу: „па галаве з сям'і”. Калі не было бацькі, расстрэльвалі сына, жонку ці дзеда. Моладзь ва ўзросце 9-20 гадоў вывезлі ў Нямеччыну. Апошніх ацалелых, кабеты з дзяцьмі, рассялілі пад Боцькі і Мілейчычы. Сам Райск таксама тады спалілі. Пазней выбралі нават брук, пазрэзвалі дрэвы, разабралі мураваную царкву.

Ішоў мне тады сёмы год. Наша сядзіба непадалёк царквы знаходзілася. Бацька майстрам быў, хату на дзве паловы паставіў. Я сама ў пакоі спала. Над раніцай пачула як нехта ў дзверы стукоча. Раптам у пакой ускочыў немец і сарваў з мяне соннай коўдру. Віску я нарабіла тады. І бачу, што бацьку і дзеда ў адной бялізне з хаты выпіхаюць. Усіх нас пад царкву сагналі і загадалі чакаць.

Тым часам у солтыса, што насупраць царквы жыў, суд адбываўся. Доўга там доследы вяліся. Солтыс добры чалавек быў. Казаў, што людзі невінаватыя. Немцы яго пабілі і першага расстралялі. Казалі людзі, што немцы хацелі толькі адзін канец вёскі спаліць, гэты ад Плютыч. А ў вёсцы быў, казалі людзі, нямецкі ганец. Як здагадаўся, што толькі адну частку вёскі пакараюць, сказаў: „Усе тут роўныя”. Ці так было, ніхто не ведае.

Людзі тады без розуму парабіліся. У Чэрнякоў пайшоў бацька. То іхняя маці кінула немаўля і за мужам пабегла. Забілі яе тады, бо вуліцу на той бок перайшла. З таго боку ўжо не вярталіся жывымі. Дзіця гэтае людзі бяздзетныя з Храбалоў пазней узялі і як сваё гадавалі.

На пляцы, дзе трымалі раянаў, добра было чуваць стрэлы. Пазней маладых на самаход грузілі. А нам прыказалі за гадзіну спакавацца і на фурманцы чакаць. Тады не ўсе кабеты каня запрэгчы ўмелі. То яшчэ мой тата і дзед бегалі па вёсцы і дапамагалі. Людзі многа непатрэбшчыны бралі. Мама мая люстра вялікае на воз вынесла, а я пазней села там і яго пакрышыла. Як рушыў абоз жахлівае відовішча было. Бабы вішчалі, крычалі, плакалі дзеці і раўла жывёла.

Абоз накіравалі ў кірунку Бельска праз Гацькі. Калі даехалі на ўзгорак, немцы загадалі азірнуцца. І гэтага ніколі не забуду. І цяпер тое бачу! У бок ад нас гарэў Райск. Я адтуль убачыла сваю клуню. Гарэла яна неяк дзіка, чатыры чырвоныя стаўбы агню палалі.

На гэтым не кончыліся пакуты раянаў. Пазней, як апынуліся за Бельскам, людзі зарыентаваліся, што накіроўваюць нас у Пілікаўскі лес. А ведалі ўжо, што там людзей забіваюць. І калі сярод лесу немцы загадалі спыніць коней, зноў падняўся віск і крык. Людзі не верылі, што дзеля адпачынку іх спынілі. Нашу сям'ю пасялілі непадалёк вёскі Быстрэ. Пры лесе хатка пустая стаяла. На ўсё жыццё запаміталася мне чалавечая спагада. Прыйшлі тады да нас людзі з Быстрага і прынеслі каву з малаком і хлеб. Той хлеб і кава былі такія смачныя, што па сённяшні дзень смак гэты чую.

Наша сям'я напрыканцы вайны нелегальна вярнулася ў Храбалы. Бацька адтуль родам быў. Ступіць на раенскую зямлю тады пагражала пакараннем смерцю. У Райск пераехалі мы ў 1947 годзе. Некаторыя на нас крыва глядзелі, што ўся сям'я жывая асталася. Што і дзівавацца. Адны ж удавіцы і сіроты вярнуліся. На голы камень прыехалі. У зямлянках найперш жылі. А мы ўжо і хату сваю з Храбалоў перавезлі. І двух мужчын на гаспадарцы працавала.

На дзеда данос напісалі. Паўгода ў бельскім арышце з-за нейкай ананімкі прасядзеў. Баба з таго ўсяго на сэрца захварэла і памерла.

Дзеду, тады ў 1942 г. хіба пашчасцілася. Пісьменны і начытаны быў. З бацюшкам Сцяпанам сябраваў. Часта пра Святое Пісанне разважалі. Я памятаю гэта, дзед заўсёды браў мяне з сабою. За няньку быў. У тую нядзелю, як немца застрэлілі, дзед з бацюшкам адразу туды пабеглі. Пабачыўшы няшчасце, з ратункам паспяшалі. Саломы пад параненых назносілі. Пазней, як дапытвалі бацюшку, той згануў пра дзеда. Таму, відаць, нашых не расстралялі.

**Хаміцкая Яўгенія, Орля:**

Калі ў Орлі было гета, дык мы з іншымі дзецьмі хадзілі туды нешта пашукаць, напрыклад, лялькy. Аднойчы нас злавіў шуцман, але тата аблаяў яго.

У Орлі было некалькі мешаных сужонстваў праваслаўных з яўрэйкамі. Наш дзядзька Валодзя быў жанаты з жыдоўкай Шыфрай, мелі сына. Калі забіралі яе ў гета, дык не хацела пакінуць сына бацьку. Калі немцы вывозілі жыдоў, дзядзіна ехала і трымала таго хлопчыка, а я плакала. Дзядзька ішоў каля таго воза, яго не забралі. Жыды добрымі людзьмі былі і добра жылі з нашым народам.

**Харкевіч Аляксандр, Лешукі:**

Як немцы гналі рускіх, дык пакідалі нам палонных з загадам глядзець іх як самога сябе. І нам папаў спярша адзін узбек — гаварыць не ўмее. Але як завялі яго на агляд у каманда ў Нараўку, ён астаўся ў млынара. Але трапіў нам другі, мізэрненькі — Ільюшка з Кузнецка пад Ташкентам. Жыў ён нейкі час у нас, гуляў з нашымі, нават паненку сабе падабраў. Але праз нейкі час забралі іх немцы. Людзі шкадуюць іх; падаліся мы ў Гайнаўку, у камендатуру, каб іх пусцілі назад. І прашэнне паказваем, у якім расхваліў я нашага Ільюшку. А яго няма: уцёк! І тады мяне ў падвал! А там кроў на сценах... Распытвае немец, хто ён мне.

— Ніякі сваяк, — адказваю, — але добры хлапец, я яго араць навучыў, дровы рэзаць, рубаць...

— Lepiej ratowaж nïї zabijaж, — сказаў немец і адпусціў мяне.

А той Ільюшка ўцёк — да нас! Што рабіць? Мельдаваць страшна... Я не мельдую і ён жыве ў нас, дровы на панадворку рэжам. Аж бачу: сем фураў немцаў едзе! Ён драпануў на калёнію, а я таксама ўцякаю ў трэцюю ці другую хату. Зараз нашу хату акружылі, дзверы выбілі і рэвізія! Як яны на вёску ад'ехалі, я ў хату. А тут мне к каменданту загадваюць. Іду, а людзі кажуць:

— Пайшоў Аляксандр на смерць.

Заходжу, а камісар злосны сядзіць. Гавару я яму:

— Ільюшка вярнуўся і сказаў, што яго немцы ка мне адпусцілі. Але калі вас пабачыў, то ўцёк. Відаць, наілгаў ён мне...

— To proszк powiedzieж, ïe on od nas nie ucieknie. I jak przyjdzie, to ïeby u nas na komendzie sik zameldowai.

Пасля той Ільюшка яшчэ нейкі час жыў у нас пакуль іх усіх немцы не пазабіралі.

4 сакавіка 1943 года жыхароў Міхнаўкі і Лешукоў немцы вывезлі ў Беласток; жылі мы па вуліцы Durchfahrstrasse. Калі пасля вайны вярнуліся, не было ў нас ні кала, ні двара. Як хочаш, так будуйся; ніякай дапамогі.

**Харытанюк Мікалай, Паўлы:**

Калі ў 1941 годзе ізноў напалі на нас немцы, былі ўжо гэта цалкам іншыя людзі, іншыя салдаты. Ад сорак першага да сорак чацвёртага людзі іх добра спазналі. Шмат каго пабралі на прымусовую працу ў Германію. Забіралі ўсё: мяса, бульбу, збожжа, яйкі, малако. Былі абавязковыя кантынгенты, за якія, вядома, грошай не плацілі.

Якія былі салдаты? Салдаты бралі ў нас усё, як сваё! Вепрука без дазволу нельга было забіць. А дазволяць — забяруць. Нават паціху страх было забіць кабана, бо суседа баяліся, што немцу данясе...

У тую страшную для нас зіму 1942-1943 гг. немцы арыштавалі нашага бацьку, Яўсея Харытанюка, і яшчэ аднаго чалавека з вёскі. Не памятаю яго прозвішча, але мянушка была — Рыгароўскі. Імя — Міхал. Арыштавалі іх і расстралялі.

І хто б калі мог падумаць, што малы інцыдэнт станецца прычынай такой трагедыі... Маці наша сустрэла іх у кампаніі, дзе яны выпівалі. Вядома, як гэта баба, пачала скандаліць. Дома шасцёра дзяцей, трэба іх накарміць, апрануць, работы поўныя рукі, а ён сабе сядзіць і папівае, весяліцца!

Бацька быў ужо выпіўшы і не сцярпеў жончыных папрокаў пры людзях. Не вытрымаўшы, жонку адлупцаваў. Што было рабіць беднай бабе?! Дзе шукаць ратунку? — У малых дзяцей, у суседзяў?.. Крыўда душыла яе. Вырашыла, што мо „ўлада” мужыка крыху напужае і прывядзе яго ў парадак. Больш зоймецца дзецьмі і жонку шанаваць будзе. Пайшла і паскардзілася ў нямецкую жандармерыю, што знаходзілася ў Рыбалах. Паведаміла ім аб інцыдэнце ў добрай веры, не прадчуваючы пагрозы.

Немцы зачынілі бацьку і Рыгароўскага. Пачалося следства. Данеслі ім, што бацька быў членам КПЗБ, што меў сувязь з партызанамі. У жандармерыю цягалі шмат аднавяскоўцаў і рознае яны там гаварылі.

Бедная наша маці, яна думала, што немцы яе пашкадуюць, дапамогуць ёй, але яны на нашага бацьку мелі ўжо вока раней і толькі чакалі нагоды, каб з ім распраўіцца. Аднак пра гэта мы даведаліся значна пазней.

З Рыбалаў арыштаваных павялі да Ляшкоў і там, у ляшкоўскім лесе, расстралялі і закапалі. Ніхто не ведаў, куды іх павялі. Забралі — і ўсё. Ведаў пра гэта толькі ляшкоўскі солтыс, але, відаць, яго абавязалі трымаць гэты факт у таямніцы. Толькі ў 1944 годзе, пасля вызвалення, ён паказаў нам, дзе ляжаць забітыя. Мы паехалі і перанеслі астанкі на паўлаўскія могілкі.

Як жа адпакутавала наша маці за свой неразважны ўчынак! У сорак дзевятым ці пяцідзесятым годзе „убэ” забрала маці ў Бельск. Год праседзела яна там у арышце, бо ізноў знайшліся „добразычлівыя”, якія данеслі, што немцы забілі людзей з-за яе.

Сядзела цэлы год, бо столькі ішло следства. Як рэагавала вёска? Адны казалі: о, добра, што такую ўзялі! Прадала двaіх. Другія спачувалі ёй і нам, адзінокім дзецям. Што яны там трымаюць нявінную кабету? — абураліся. І так, думаю, працэнтаў 80-90 жыхароў нашай вёскі шкадавала яе.

Быў суд, і тады з архіваў выцягнулі даносы ад людзей у нямецкую жандармерыю.

А пасля маці атрымала паведамленне з пракуратуры, што яна невінавата. І толькі тады, калі маці вярнулася дадому, я даведаўся пра тыя даносы на членаў КПЗБ. Мой бацька належаў да больш актыўных.

Вось і так бывае... Можа такое здарыцца раз на мільён. Нявопытная, маладая жанчына была. А хто ж іх ведаў, што гэтыя немцы такія...

Калі пазней нам параілі, што можам расстарацца для маці рэнту па бацьку, як жонцы дзеяча КПЗБ, яна не захацела. Гэтыя грошы, відаць, не прынеслі б ёй шчасця.

**Хмялеўскі Ян, Паўднёвы Востраў:**

Калі ў 1941 годзе немец напаў на саветаў, тыя адступалі, а немцы з самалётаў стралялі і білі іх. Калі ішла нямецкая часць, спынілася яна на уніяцкіх могілках — расклалі там агонь і спявалі свае песні.

Немцы злавілі дзевяць савецкіх салдат, якія апынуліся ў нашай вёсцы. І аднаго нашага вяскоўца, які дагала, як салдаты, абстрыжаны быў, разам з імі зачынілі ў свіронку. Адзін стары стаў прасіць, каб тутэйшага адпусцілі і немцы яго звольнілі. А тым савецкім хлопцам выкапалі за вёскай яму і ўсіх пад вечар расстралялі. Адзін з іх кінуўся ўцякаць, але яго гналі страляючы і застрэлілі. Бадай пасля вайны астанкі тых салдат выкапалі і кудысь вывезлі.

Нямецкія жандары стаялі ў Крынках і Шудзялаве; сярод іх былі і нашы людзі.

Хадзілі савецкія партызаны, прыходзілі з Перацёсаў пад Валілімі. Бывалі і ў нашай вёсцы харчы або лахманы ўзяць. У Крушынянах і Азяранах было двух такіх, якім немцы далі ружжо, каб партызанаў у вёскі не пускалі. То некалькіх партызан пераапранулася ў нямецкую форму і тым двум загадалі фурманкі даць. А пасля падвялі іх пад лес і расстралялі. А самі ўцяклі.

Яшчэ ў Новым Востраве была школа, у якой немцы былі. І з вёскі траіх да сябе ўзялі, каб ад партызанаў пільнавалі. І ў Нетупе гэтаксама было. Але тыя ахоўнікі з партызанамі не біліся, толькі калі немцы адступілі, тады партызаны спалілі тыя „казармы".

Людзі крыху ведалі, што на вайне тварылася. Ведалі пра акружэнне немцаў пад Сталінградам і пра аблогу Ленінграда. А калі шашой у Валілах стала нямецкае войска назад ехаць, тады вядома ўжо было, што немец адступае.

**Хомчык Юльян, Сакалда:**

Мы то мелі жыццё тут пад лесам! Не ведаеш, ці заўтра ўстанеш. Хадзілі партызаны. „Давай есці". Ды ноччу не пазнаеш, хто пытаецца парyску. А калі то пераапрануты ўласавец? „Дай хлеба кавалак", а на ранак цябе ўжо няма. „Сам бяры, калі знойдзеш". Мы за працу ў лесе дасталі цукар, алей. Не, гэта поснае масла, кажа партызан. Сам брацъ не хоча. А кожны жыць жа хоча. Быў тут у ваколіцы такі І-скі, ляснічы (яго жонка яшчэ жыве ў Супраслі), што служыў „і нашым, і вашым", а найбольш сабе. Лавіў, выдаваў ён партызанаў. А мы ў лесе працавалі, а таксама і самагонку гналі. Пасля 21-й нельга было хадзіць. Занёс я што трэба ў лес, вяртаўся. Зачапіў мяне І-скі ля Падсакалды. „Ты, бандыт! Кажы, куды вадзіў партызанаў! Ну, жывы не выйдзеш!" Чаму я тады, дурань, не ўцякаў, думаю: кропнулі б мяне без мукі! А І-скі накінуў мне на шыю пастронак, тузане, падцягне, мае ногі адарвуцца ад зямлі, то ён ізноў апусціць: „Кажы, дзе партызаны!" Завёў мяне ў Сакалду, а там ужо больш такіх як я. Павялі нас на Копную Гару, далі гадзіну. „Як не скажаце, то вас усіх пастраляем, а вёску спалім!" Бралі кожнага на допыты. А мне: „Кажы, бо праз цябе колькі нявінных людзей згіне!" Я праз слёзы: „Пан камендант, тут мае суседзі, браты, знаёмыя, хай я згіну адзін!.. Забівайце. Але я сапраўды нічога не ведаю. Я просты вазак". — „Ну, добра, на гэты раз цябе адпушчу, але калі што будзе, ты першы дастанеш кульку". Гэта было ў сорак другім. Але пагібель не мінула нашых людзей. Тае даты не забуду ніколі: Лазні. 22 кастрычніка 1943 г. — у панядзелак, акружылі вёску, чыталі са спіска і бралі. З Лазняў пяць сем'яў. З Сакалды, Варонавіч. 56 чалавек. Жанчын, дзяцей таксама. Жывых яшчэ паўкідалі ў яму, навалілі друком, засыпалі. Людзі казалі, што зямля ўверх падымалася. Майго брата Уладзіслава ў той час дома не было. А жонку і двое дзетак, дзяўчынцы 12 гадоў, хлопчыку 8 месяцаў, забралі. „Дзе мая сям'я, там і я", — закрычаў брат, як вярнуўся. Злавілі яго на мастку, пад Копнай Га-

рой. Ён ішоў, але як труп быў, бо смерці родных не перажыў бы. Сорак гадоў яму было...

А таго ляснічага немцы забілі, ён выстаўляў быў ім партызанаў, выскачыў з лубіну, фашысты па ім далі чаргу, не пазналі. А быў яшчэ такі немец, Дрыдэль называўся. Мы садзілі лес каля Лазняў. О, як ён катаваў людзей! Такую натуру меў, што вайна дала яму магчымасць выказацца сваім садызмам. Партызаны цікавалі за ім здаўна. Прыехаў тады ў лес на белым кані, гаёвы сказаў яму, што партызаны яго шукаюць. Каня прывязаў, ідзе, рыхтуецца зноў даць сабе волю. Усе яго баяліся, бо то быў чысты д'ябал. Ну, і дастаў ад партызанаў. А за аднаго ж немца на двух сотнях нашых помста. А якраз перад гэтым да Дрыдэля прыехала жонка. Яна напісала, што помсты не жадае. „Няхай мой адзін сын будзе сіратою” сказала, і вярнулася ў Нямеччыну.

У партызанцы былі розныя. І рускія, і жыды, і іншыя. Іх трэба ж было накарміць. Бралі бульбу, адзенне, курэй... Бралі ўсё на фуру, везлі ў схованкі. Коней, праўда, і фуры адсылалі.

**Чарнецкі Мікалай, Нараўка:**

Прыйшлі немцы. Мовы ў іх і жыдоў падобныя. Немцы зажадалі золата. Золата ім далі. Сказалі даць яшчэ раз. І яшчэ раз. А пасля жыды ўжо і не мелі, каб заплаціць за жыццё, я так думаю. Тады загадалі іх сагнаць... Я вам скажу праўду. Былі сярод нас людзі, якія беглі жыдам дапамагчы, падказаць, што нібы то свой летнік да краўца нясеш, але былі і такія, што толькі падказвалі фашыстам: „О, пан, то юд, юд!” Сагналі іх да касцёла, паклалі кругом на зямлі. Шасцёх ці сямёх выбралі здаровых маладых жыдоў, далі ім рыдлёўкі і завялі пад польскія могілкі. І там пабілі іх. А пасля прыйшлі па тых, што ляжалі. Думалі мо, прасіць будуць, даваць золата за жыццё. Пабралі ўсіх. Мой брат усё бачыў, залез быў на комін. І ўсіх жыдкоў паставілі ў чацвёркі. Калі які старык не мог ісці то — чах! — застрэлілі. Маранца тады забілі, Рэйна кульгавага. Завялі тую рэшту да таго рова. Мужчын пабілі ўсіх. Лейбу Ціхавольскага з двума дзецьмі. Зямля потым варушылася. Казалі пасля вайны, што сын Давіда Аўгустоўскага слаба відна дастаў тады, вылез з тае ямы аж над рэчку, поўзаў там, але што далей з ім было, не ведаю. Адзін хлопец раней уцёк, мой равеснік, Мойшка Зінгер, цераз акно, пачуўшы вестку пра благое. Не мог ніхто выжыць, многа сабак было свойскіх... Бабаў і дзяцей сагналі ў стражацкую шопку на цэлую ноч, потым узялі грузавік і павезлі, кажуць, што ў нейкую Ружану. Дзве жанчыны прыйшлі былі, сказалі, пэўна, што золата прынясуць. Але доўга тут не пабылі. Праз ноч даказалі немцу Андэрсу, што

тыя кабеты вярнуліся. І забілі іх. Дзе схаваешся, калі свае сабакі кусаюцца! Мала было такіх?! Прыйшоў Сікорскі быццам адзін, стукаецца: адчыні, а за ім немец: „Лос!”

Загналі і нашых сем чалавек (Павел Лапінскі, Аляксандр Чарнецкі, Стульгісаў трох і Павел Беляўсаў) у загараду ля касцёла. З дубінкаю адзін пільнаваў, урэзаў майму брату па галаве. Мой брат выцягнуў штыкеціну і ўдарыў яго, а сам давай браму адчыняць. Давай хлопцы ўцякаць. Але птушка да свайго гнязда бяжыць. Калі б беглі яны ў лес, можа і сёння жылі б. Майго брата з аўтамата забілі. Двух уцякала на Заблоччыну, як далі — мазгі ім выбілі з галоў. Усіх пазбіралі і на машыне ў лес павезлі. Кажу ўкраінцу, Піліпу Бураму, што ў Елянцы быў: „Ты хочаш жыць, і я хачу жыць, але скажы, куды той самаход іх павёз?” Свой сабака сцягнуў з майго брата камашы...

Паразбіралі жыдоўскае дабро і прадавалі. Многа ёсць такіх, хто браў тады, але доўга ён не пажыў. Можа, было якоесь іхняе закляцце. Мой сын пайшоў быў і прынёс валёнкі з камашамі, а мая Оля кажа: „Дзе ты ўзяў?” — „О, там, стаялі каля Шасткоўскага!” — „Занесь назад”. А зараз бачыць: ужо суседка на нагах іх носіць. О! Бралі швейныя машыны і іншае. „Трафей!” Калісь казалі: „Як бяда, то да жыда, а калі па бядзе — то я нас... на цябе, жыдзе”.

**Чыквін Міхал, Дубічы-Царкоўныя:**

Самагонку ў нас гналі, але паліцыя лавіла. Пры немцах таксама гналі. Адзін такі ўдаў немцам самагоншчыка. Тыя пайшлі да яго і пытаюцца: „Гоніш?” „Ганю”, — адказаў. „Давай паказвай”. Паказаў. „Пі!”. Выпіў. Тады і немцы выпілі і кажуць: „Пайшлі да таго, хто цябе ўдаў”. Прыйшлі і камандуюць: „Кладзіся на стол, здымай порткі!” Вылупцавалі яго і кажуць, каб так болей не рабіў. Пасля гэтага ніхто самагоншчыкаў не мельдаваў.